№ 45 (355) 5 сьнежня 2003 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы



**Сам-насам з Богам**
450 гадоў Рэфармацыі ў Беларусі.
старонка 12

**Генадзь Грушавы**
Сыны Лукашэнкі езьдзілі за мяжу як дзеці Чарнобылю.
старонка 14

**Сэнсацыйныя гравюры**
Берасьце XVII стагодзьдзя як на далоні.
старонка 13

**Уладзімер Букоўскі**
Эўразьвяз разваліцца як Савецкі Саюз.
старонка 10

### Моцна пахаладнее

**З 6 сьнежня моцна пахаладнее.** Чакаецца сьнег, завіруха, вецер да 20 м/с, галалёд. Тэмпэратура ў першы ж дзень апусьціцца да 1—6 марозу ўдзень і 3—9 уначы, а праз пару дзён — і да 3—10 марозу ўдзень і 13—18 уначы. Скончаецца доўгая восень 2003-га, на паўднёвым захадзе краіны найцяплейшая за сто гадоў.

### 500-гадовы помнік прыроды

**Новым помнікам прыроды можа быць абвешчана 500-гадовае дрэва, што ля вёскі Спонды на Астравеччыне.** Векавы дуб, прынаду турыстаў і паганцаў, зь цяжкасьцю абхопяць шэсьць мужчынаў. Увышкі ж ён мае 30 мэтраў.

### Беларусы просяць прытулку

**Сёлета 2560 беларусаў папрасілі палітычнага прытулку зя мяжой.** Па колькасьці просьбітаў Беларусь займае 36-е месца сярод кріанаў сьвету. Лідзіруюць Расея (23,7 тыс., пераважна чачэнцаў), Ірак, Сэрбія. Найчасьцей прытулку просяць у Вялікай Брытаніі і ЗША. А ўсяго за год у сьвеце ўцяклі за мяжу 321 тыс. чалавек.

### Кантэйнэр

«Раней, да зьяўленьня ў мястэчку Рогнан бежанцаў, кантэйнэр замыкалі, але з нашым прыходам замкі перасталі выконваць свае функцыі. І сапраўды, калі ёсьць яшчэ азіяляты, якія ня крадуць у крамах, дык аддайце гэтым дарослым дзецям ваш сьметнік, ваш набіты побытавым барахлом Кантэйнэр; аддайце былым грамадзянам імпэрыі вашы нераскупленыя булачкі (два даляры штучка); ваш паўтара даляра за паўкілё хлеб; вашы някупленыя і нязьедзеныя бананы зь любай вам Афрыкі; аддайце непатрэбную вам арганіку тым, хто яшчэ спадзяецца на прытулак і верыць у лепшую долю...»

**Заканчэньне пранізьлівага нарвэскага дзёньніка Славаміра Адамовіча. Старонка 15.**

# У чым іх сіла



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Тэма нумару. Старонкі 4–6.**



## Ці баяздольнае Беларускае войска?

**Старонка 5.**

## Расейцы хочуць спакою

**Чацьвертыя выбары ў парлямэнт Расеі зусім пазбаўленыя таго рэвалюцыйнага запалу, які характарызаваў абраньне першай, другой і нават трэцяй Думаў. Расейская палітыка стала нуднай.**

На гэтых выбарах расейцы не зьбіраюцца рабіць «гістарычнага выбару». Дый, разважыўшы, і неабходнасьці няма. 90-я ў Расеі прайшлі пад пытаньнем «Ці вернуцца камуністы?». Цяпер жа — думае грамадзянін Расеі — СССР не вярнуць, а жыцьцё ўжо, бач, пацюху наладжваецца. І галоўнае, ёсьць гарантыя таго, што так яно будзе і далей, — Уладзімер Пуцін.

Галоўнае жаданьне расейскага выбарніка сёньня — жаданьне стабільнасьці. Ляйтматыў большасьці «палітычных» размоваў расейцаў такі: яны стаміліся ад рэвалюцыйнасьці апошніх 15 гадоў і хочуць спакою. Палітычную моду ў гэтай краіне пачынае дыктаваць сярэдняя кляса.

У чым расейскія выбары не падобныя да змаганьня за парлямэнт у іншых краінах — дык гэта адсутнасьцю «барацьбы ідэалёгіяў». Змагаюцца не ідэалёгіі, а грошы. Нават у выбарчых сьпісах КПРФ стаяць некалькі даляравых мільянэраў.

Гэта й зразумела: калі ў цябе мільёны ёсьць, то лепш пераплаціць і пазбыцца неабходнасьці ісьці па аднамандатнай акрузе, весьці цяжкую выбарчую кампанію, якая адымае некалькі месяцаў працы. Час — гэта грошы, і, як маеш грошы, часу можна не губляць.

Яшчэ адна цікавая акалічнасьць. Ад таго, якія стасункі ў кіраўнікоў партыяў у Маскве, міжпартыйныя адносіны ў рэгіёнах могуць ніяк не залежаць. Да прыкладу, у Башкартастане ў апазыцыі да Муртазы Рахімава — усе: камуністы, «яблычнікі», ЛДПР, СПС... У невялікіх гарадах можна назіраць такую карціну: у адным памяшканьні месьцяцца офісы «Яблыка» і КПРФ альбо КПРФ і «Лібэральнай Расеі». Аплачваюць у складчыну.

«Ідэалягічных» партыяў у Расеі фактычна няма, калі не лічыць КПРФ. Не ў апошнюю чаргу гэта відаць з жаданьня партыйцаў працаваць, не зважаючы на тое, заплацяць ці не.

Спрабуюць выпрацаваць ідэалёгію СПС і «Яблык» (які актыўна займаецца «зялёнай» тэмай).

Працяг на старонцы 3.

### Канцэрт Шалкевіча

**5 сьнежня ў менскім Палацы культуры вэтэранаў (вул. Янкі Купалы, 21) адбудзецца вялікі канцэрт гарадзенскага барда і актора Віктара Шалкевіча. Музыка будзе прэзэнтаваць новы альбом «За сто крокаў ад Вострае Брамы альбо геаграфія ВКЛ і ваколіцаў». Пачатак у 19:00. Цана квітка ад 5000 да 7000. Даведкі і замова квіткоў: 649-08-88, 766-24-25.**



# Ня бог. Ня цар. І не герой

За два тыдні да сустрэчы з прадстаўнікамі нашага палітычнага бамонду спадар Нямцоў недвухсэнсоўна выказаў свае думкі пра Беларусь у артыкуле «Саюз Расеі і Беларусі магчымы — без Лукашэнкі». Гэты тэкст хочацца цытаваць цалкам, як апалягеты хрысьціянства цытавалі паганскія трактаты, абвяргаючы іх тэзыс за тэзысам. Толькі абвяргаць няма чаго: чыстая праўда.

«Мы мяркуем, што найвышэйшым нацыянальным прыярытэтам краіны павінна зрабіцца аб’яднаньне Расеі і Беларусі. У Расіі няма ніводнае значнае палітычнае сілы, якая выказвалася б супраць аб’яднаньня. Розьніца адно ў тым, што левыя ... жадаюць аб’яднаньня ... на аснове дыктатуры, а правыя ... настойваюць на аб’яднаньні на прынцыпах народаўладзьдзя і свабоды». Хочацца амаль за Юрасём Братчыкам паўтарыць: «Калі ў нас будзе гэткая свабода — гэта канец».

Я не выкрываю ні расейцаў, ні іхных беларускіх саюзьнікаў. Гэтак жа вынаходліва расейцы змагаліся б і за востраў Кергелен, калі б надарылася нагода. Беларускія ж партыі шукаюць хаўрусьнікаў — у іхнім становішчы гэта абсалютная неабходнасьць. Было б, аднак, нашмат лепей, калі б іхняя ўласная пазыцыя выглядала ў такіх выпадках выразьней. Бо Нямцову ад такіх акцый выгада, а беларускай апазыцыі?

Нямцоў робіць выгляд, быццам магчымыя два сцэнары аб’яднаньня: добры і кепскі. Але ў кожным сцэнары Расея застаецца Расеяй, а Беларусь ператвараецца ў немавед што. Нямцоў заўзята прадае тавар, якога няма, — расейскую дэмакратыю напярэдадні выбараў, што могуць засьведчыць кіраванасьць расейскага *народаўладзьдзя* (калі пераможа «партыя ўлады») або няўстойлівасьць расейскае *свабоды* — калі ўмацуюцца левыя. Нямцоў добры купец, але не герой. А што ён ня цар і ня Бог, дык ці варта й казаць.

Між тым ласкавая падтрымка ў арганізацыі PR-акцый СПС лёгка можа паставіць на беларускіх палітыках кляймо квісьлінгаў. Ключы ад Крамля застаюцца ў «Адзінства». СПС ня самая ўплывовая партыя. Яна адчайна змагаецца за пераадоленьне 5-працэнтнага бар’еру. Найхутчэй, яна свайго дасягне, але толькі дзякуючы падтрымцы пуцінскіх тэлеканалаў. За што ў свой час ёй прыйдзецца аддзячваць.

Між тым беларускія выбарцы ня ўхваляць прыцягненьня расейскіх палітыкаў да абмеркаваньня ўнутрыбеларускіх пытаньняў. Свае справы рашаем самі — за выкананьнем гэтага правіла правыя выбарцы сочаць. Дый папулярнасьць асабіста Чубайса—Нямцова ў Беларусі невысокая. Кантакты зь імі столькі ж забіраюць, колькі дадаюць да палітычнай рэпутацыі Валер’я Фралова і Ўладзімера Парфяновіча. Зьвязваючы сваё імя з аўтсайдэрамі, рызыкуеш апынуцца ў аўтсайдэрах сам.

**Аляксандар Карольчык**

**!** Прымаецца падпіска на першае паўгодзьдзе 2004 году. Цана на месяц 2150 рублёў, а на шапік «Белсаюздруку» ў Менску ўсяго 1450 рублёў. Падпісны індэкс 63125. Падпіску прымаюць ва ўсіх аддзяленьнях пошты, у шапіках «Белсаюздруку». Беларусь мяняецца, «Наша Ніва» застаецца. Дык падпісвайся!

## Паксас на парозе імпічмэнту

**На наступным тыдні літоўскі Сойм распачне імпічмэнт прэзыдэнта Раландаса Паксаса, які, на думку парлямэнцкай камісіі і спэцслужбаў, заплюміў сябе кантактамі з расейскай мафіяй.** Камісію па імпічмэнце складуць больш за 100 дэпутатаў з чатырох урадавых і апазыцыйных партый. Гэта доўгая працэдура, на шэсьць месяцаў. Той час напэўна стане ў Літве пэрыядам цяжкое барацьбы між прэзыдэнтурай і парлямэнтам.

Юры Барысаў, спонсар прэзыдэнта, у чацьвер выпускае спэцыяльны выпуск газэты «Ukininko Patarejas» («Хатнія парады»). У ім будуць зьмешчаныя матэрыялы, што кампрамэтуюць галоўных апанэнтаў Паксаса. Напрыклад, кіраўніка Дэпартамэнту грамадзкае бясьпекі Мечуса Лаўрынкуса, які першы выступіў з абвінавачаньнямі на адрас Паксаса. Бясплатная газэта накладам 1,2 млн асобнікаў (у Літве жыве 3,4 млн чалавек) называе яго адказным за сьмерць 13 літоўцаў, забітых 13 студзеня 1991 г. каля тэлевежы. Тэксты для газэты пісалі паліттэхнолягі з Масквы.

## 10 сьнежня — акцыі «Пяцёркі+»

**У Дзень правоў чалавека ўдзельнікі «Народнай кааліцыі 5+» правядуць масавыя акцыі.** Гэта будуць вулічныя апытаньні на тэму трэцяга прэзыдэнцкага тэрміну і сустрэчы з рабочымі на прахадных заводаў. У сталіцы ў гэты дзень а 17-й «Пяцёрка+» і «Эўрапейская кааліцыя» ладзяць Ланцуг неабыякавых людзей на праспэкце Скарыны, ад плошчы Незалежнасьці да плошчы Перамогі. Людзі будуць зьбірацца на Кастрычніцкай пл. са сьвечкамі й здымкамі зьніклых палітыкаў.

## Няроўная доля-2

**Рэклямкі «Народнае волі» правіселі ў мэтро толькі пару дзён. Іх зьнялі на «чыйсьці» загад.** На рэклямках быў надпіс «Мы — за праўду» і падпісная інфармацыя газэты.

## Расейцы і палітычныя забойствы

**На пятыя ўгодкі сьмерці Галіны Старавойтавай тэлеканал ТВЦ апытаў гледачоў наконт іхнага стаўленьня да палітычных забойстваў.** Большасьць, 53%, асудзілі. Але 35% падтрымалі! А 12% было ўсё адно.

**БТ**

## Віктар Шніп

* * *

Гэты сьвет прыдумалі ня мы,
І яго не перайначыць нам.
Нехта сёньня вернецца зь зімы,
Нехта ўжо ў зіму пакрочыць сам.

Вырасьце на валуне трава,
І валун схаваецца ў траве.
Воблака ў нябёсах, як царква,
Зь веку ў век спакойна праплыве.

І мы ўбачым, як жыцьцё ідзе,
І ня ўбачым анічога мы.
Нехта ў леце сёньня прападзе,
Нехта заўтра вернецца з турмы.




**Новы нумар «Дзеяслова» ўдаўся моцны і застаўся сьветлы, як і папярэднія. Ён зьмяшчае запісы Янкі Брыля і дзёньнікі Вячаслава Адамчыка 2000 году. З прозы — Сяргей Астравец і Міра Лукша. З паэзіі — Алесь Бадак і Адам Глёбус. Як заўжды ў «Дзеяслове», публіцыстычна-крытычная частка саступае па вазе літаратурнай.**

## ХРОНІКА СУПРАЦІВУ

27 лістапада «маладафронтавец» **Артур Фінкевіч** у дзень заканчэньня тэрміну арышту быў зноў асуджаны на 15 сутак. З спэцпрыёмніку хлопца прывезьлі ў суд Савецкага раёну, дзе Руслан Казадаеў прызнаў А.Фінкевіча вінаватым у парушэньні арт.167 ч.2 АК (удзел у несанкцыянаваных грамадзкіх акцыях). Упершыню суд двойчы прызначыў максымальнае пакараньне за адны й тыя дзеяньні — распаўсюд улётак супраць трэцяга тэрміну. Сябры незарэгістраваных «Маладога фронту» і БПС пастанавілі штовечар а 18-й прыходзіць з запаленымі сьвечкамі да Акрэсьціна, дзе цяпер знаходзяцца «маладафронтаўцы» А.Фінкевіч, Зьміцер Дашкевіч і сябра БПС Васіль Парфянкоў. Акцыя будзе трываць, пакуль іх ня вызваляць. 27 лістапада **Валер’я Шчукіна** аштрафавалі на 10 базавых адзінак за «дробнае хуліганства і непадпарадкаваньне законным патрабаваньням супрацоўніка міліцыі» (арт.156 і 166 КК). Напярэдадні Шчукін безвынікова спрабаваў прайсьці ў Полацкі гарвыканкам на прыём да міністра ўнутраных справаў Навумава. 29 лістапада на Камароўскім рынку падчас раздачы ўлётак былі затрыманыя **Людміла Гразнова**, **Андрусь Козел**, **Алег Тарасевіч**, **Ігар Арлоў**, **Паліна Гулідава**, **Мікалай Цімашэнка**, **Іван Чаратун**, **Аляксей Нішчык**. Яны праводзілі акцыю «Грамадзкае галасаваньне «Трэці тэрмін» супраць рэфэрэндуму. На Л.Гразнову, А.Козела, А.Тарасевіча, І.Арлова былі складзеныя пратаколы за «распаўсюд незарэгістраванай друкаванай прадукцыі». Актывіст незарэгістраванай моладзевай арганізацыі «Зубр» непаўналетні **Антон С.** 30 лістапада быў затрыманы людзьмі ў цывільным у Баранавічах падчас расклейкі ўлётак зь лёзунгам «Ён павінен сысьці»: хлопца паўтары гадзіны дапытвалі ў апорным пункце міліцыі, пасьля чаго адпусьцілі без складаньня пратаколу. Лідэр Берасьцейскай абласной арганізацыі БСДП (НГ) Анатоль Ляўковіч не прайшоў пераатэстацыі ў Берасьцейскім дзяржаўным унівэрсытэце і можа згубіць працу.

**АШ**

ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Каўпак для Мілера



Сучаснае кіраўніцтва Расеі фрыгіднае на эмоцыі і пачуцьці. Зь ім можна весьці перамовы толькі мэтадам Грамыкі.

**Пачаліся расейска-беларускія перамовы аб новых цэнах на энэрганосьбіты.** З улікам апэтытаў паўпрада «Газпрому» сп.Мілера — выцягнуць з нас утрая больш «уашак» — няцяжка прагназаваць, якімі загалоўкамі ўзімку будуць стракацець айчынныя газэты:

«В «Спортмастере» одеюсь и Чубайса не боюсь» («Белорусская газета»), «На Мядзельшчыне вартаўнік ад холаду ператварыўся ў сьнежнага чалавека» («Не может быть»), «Моладзь марозу не баіцца» («Знамя юности»), «Лукашэнка ставіць ураду кол зь мінусам» («Советская Белоруссия»).

Каб пазьбегнуць новага ледавіковага пэрыяду, ураду застаецца абыгрываць «Газпром» за сталом перамоваў. Па рахунках плацяць выключна рынкавыя ідэалісты або мазахісты. І тут трэба вызнаць: старая дыпляматчная тактыка вядзеньня перамоваў, пабудаваная на праявах эратычнага каханьня да Расеі, не дае ніякага ККДз. Сучаснае кіраўніцтва Расеі, як і належыць тэхнакратам, фрыгіднае на эмоцыі і пачуцьці. У пыльных аналах гісторыі дыпляматыі трэба шукаць новыя арыгінальныя мэтады мастацтва перамоваў.

Напрыклад, мэтад Грамыкі. Культавы дырэктар савецкага замежнага дэпартамэнту на ўсе пытаньні апанэнтаў аднаскладова рэагаваў: «Не». Фармат дыялёгу Беларусь—«Газпром» у выпадку прыняцьця гэтай тактыкі набудзе наступную форму:

Мілер: Трэба падпісаць дамову наконт новых цэнаў.

Лукашэнка: Не-е-ееееееє.

Мілер: Тады прыватызуйце «Белтрансгаз».

Лукашэнка: Не-е-ееееееееее.

Мілер: Тады я прыпыняю перамовы.

Лукашэнка: Не-е-ееееееееееее.

Міллер: Тады давайце падпісваць дамову наконт новых цэнаў.

Лукашэнка: Не-е-ееееееееееее…

Пасьля двух-трох дзён такіх перамоваў Мілера даставяць на рэсэпшн у Навінкі, цэны на газ застануцца старымі і ўсё будзе добра.

Мэтад Талейрана. У 1814 г. кіраўнік францускага МЗС зрабіў усё, каб дэлегаты Венскага кангрэсу танчылі з ранку да ночы. У экстазе яны забыліся на сваю дыпмісію, і постнапалеонаўская Францыя пазьбегла ганебнага міру. Затанчыць Мілера няцяжка. Лямбада зь Лідзіяй Ярмошынай прымусіць топ-мэнэджэра «Газпрому» назаўсёды забыцца на энэрганосьбіты, кошт барэля на лёнданскай біржы і прыватызацыю беларускай нафтагазавай сыстэмы.

Асабіста мне як чалавеку левых поглядаў найбольш сымпатычны мэтад Троцкага. Падчас перамоваў зь немцамі ў Берасьці Леў Давыдавіч кантузіў кайзэраўскіх дыпляматаў формулай «Ні міру, ні вайны». Будучыня прадэманстравала дыпляматычны геній заснавальніка 4-га Інтэрнацыяналу. Бліцкрыг немцаў прывёў да таго, што Міколка Паравоз сышоў у партызаны і прымусіў немчуру бегчы. Лукашэнка, як і Троцкі, павінен вырубіць Мілера: «Дамовы падпісваць ня будзем і за газ башляць ня будзем». Уся ініцыятыва пяройдзе да масаў на месцах: нашы прадпрыемствы будуць папартызанску тырыць расейскі газ, а з афіцыйнага Менску — як з гусі вада.

Калі ж сур’ёзна, дык пакуль кожнаму грамадзяніну Беларусі, да апошняга беларускага кляшара, ня будзе забясьпечанае права на, фігуральна кажучы, ягоную гарачую трубу ў падвале, права на жыцьцё, — плаціць «Газпрому» ня варта. На любой падставе: нават таму, што ў Чубайса не сэксуальны зад. Спачатку газ, пасьля грошы. Інакш мы ня нацыя.

**Лёлік Ушкін**

ПРАВЫМ ВОКАМ

# Ня наш бізнэс



...наколькі яна не нацыянальная, настолькі ж не буржуазія.

**З вуліцаў сталіцы зусім зьніклі камэрцыйныя шапікі ды яткі.** Паводле рашэньня Менгарвыканкаму, зьнесеныя кіёскі, а цяпер ад пачатку сьнежня й да сакавіка забаронены яшчэ й гандаль садавіной, гароднінай і кветкамі з вулічных латкоў і адкрытых пляцовак. Сваё рашэньне чыноўнікі патлумачылі намерам абараніць пакупнікоў ад нізкаякаснай прадукцыі ўзімку ды жаданьнем надаць вуліцам больш прывабны выгляд. Аднак не сакрэт, што гэткім чынам улада намагаецца прымусіць людзей карыстацца паслугамі крамаў.

Там, дзе шчэ ўчора ўдзень і ўвечары прадавалі й куплялі, сёньня тырчаць пянькі ад зьвезеных некуды сталёва-шкляных сродкаў вытворчасьці, чыіхсьці кармільцаў, каляровых памятак пэрыяду накапленьня першаснага капіталу. Паспаліты люд ціха абураецца. Чаму ж не чуваць змаганьня мікракамэрсантаў? Пара судовых працэсаў і інтэрвію Аксаны Новікавай — ня ў лік. Дзе яна, нацыянальная буржуазія?

Адказ на паверхні: наколькі яна не нацыянальная, настолькі ж не буржуазія. Шапікі й рынкі ў Беларусі па сутнасьці зьяўляюцца канцавым зьвяном тавараправоднай сыстэмы, вытворчая база якой знаходзіцца ў Кітаі, Турцыі й Расеі, а гуртовыя вузлы лякалізаваныя ў Маскве й вакол яе. Над плыняй гэтых пераважна нізкаякасных рэчаў і прадуктаў раяцца перакупшчыкі рознага рангу. Большасьць зь іх — выхадцы з Каўказу і Азіі, для якіх наша краіна значыць ня больш, чым арандаваны імі кавалак асфальту ці падвалу. Беларусы ў гэтай сыстэме — ня ўласьнікі, а пара тысяч наёмных работнікаў — прадаўцоў і грузчыкаў, ды яшчэ колькі сотняў тых, хто выбіўся крыху вышэй, каб самому арандаваць і наймаць.

Каму-каму, а нацыянальнаму руху тутака лавіць няма чаго.

**Вацлаў Заякоць**

# Расейцы хочуць спакою

Працяг са старонкі 1.

«Аднак бальшыня расейскіх партыяў — звычайныя PR-праекты, створаныя для атрыманьня галасоў, — адзначыла ў гутарцы з карэспандэнтам «НН» Юлія Малышава, супрацоўніца заснаванага Ягорам Гайдарам Інстытуту эканомікі пераходнага пэрыяду. — Самы відавочны з такіх праектаў — створаны для адцягваньня працэнтаў ад камуністаў блёк «Радзіма» Глазьева—Рагозіна. У Думу наўрад ці пройдзе, але камуністам нашкодзіць можа».

У найбуйнейшай на сёньня палітычнай партыі, «Адзінай Расеі», ідэалёгіі фактычна няма. Хаця ў сваім «Маніфэсьце» АдРа і спрабуе кваліфікаваць сябе як партыю кансэрватараў, насамрэч гэта — элітарны палітычны клюб, сяброўства ў якім дае вялікія магчымасьці: адміністрацыйны рэсурс у Расеі выкарыстоўваецца напоўніцу.

Да расейскіх рэгіёнаў партыйная прапаганда даходзіць цяжка. Інфармацыю пра партыі выбарнікі атрымліваюць у асноўным праз тэлевізію. Акрамя таго, прэтэндэнты на пасады ў Думе фактычна адмовіліся ад кампаніі «ад дзьвярэй да дзьвярэй». Лічыцца, што выбарніка лепш лішні раз не турбаваць зьвяўленьнем агітатараў — не раздражняць народу.

Расейцам хочацца ціха, без чарговых рэвалюцыяў багацець. Ну хіба што адыграўшыся на пары алігархаў за цяжкасьці мінулага дзесяцігодзьдзя.

**Аляксей Шэін, Масква—Уфа**

### Хто пачым

**Найбольш забясьпечаная палітычная партыя Расеі — «Адзіная Расея».** На яе афіцыйным рахунку аказалася 250 млн 896 тыс. рублёў (каля 8,45 млн даляраў). На рахунак Саюзу правых сілаў паступіла, у пераліку на даляры, 7,37 млн. У партыі дэмакратычнай інтэлігенцыі «Яблык» назьбірана 4,65 млн даляраў. Лібэральна-дэмакратычная партыя Жырыноўскага разжылася 4,68 млн даляраў, блёк «Радзіма» — 3,48 млн. Кампартыя ж мела на кампанію 1,87 млн даляраў.

### Як у нас, так і ў вас

**Бюро АБСЭ па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека** (БДІПЧ) правяло маніторынг тэлеэтэру і падлічыла, што з 7 да 21 лістапада «Першы канал» і УДТРК прысьвяцілі «Адзінай Расеі» амаль аднолькавую колькасьць часу — 16,67% і 16,42% адпаведна, прычым гэта была выключна пазытыўная інфармацыя, а КПРФ каналы прысьвяцілі 11,75% і 18,48% адпаведна. Прычым на першым была толькі нэгатыўная інфармацыя, а на другім адзіны пазытыў праскочыў у праграме Сванідзэ. Дзяржаўныя вяшчальныя кампаніі адкрыта рэклямуюць «Адзіную Расею» па-за спэцыяльна адведзеным часам, прыйшлі да высновы ў БДІПЧ.

# Табу зьнятыя і нязьнятыя

Расейская думская кампанія бляклая і бязвольная. Ніводная палітычная партыя ня вынесла на першы плян патрабаваньня спыніць крывавую вайну ў Чачэніі. Гэта табу. Хоць болей за 60% расейцаў, паводле зьвестак сацыёлягаў, выступаюць за мірныя перамовы з чачэнцамі.

Выбары ня вылучылі ніводнага новага яркага кандыдата ў прэзыдэнты, які мог бы пазмагацца ў сакавіку супраць Пуціна. Апанэнтамі дзейнага прэзыдэнта стануць Зюганаў, Яўлінскі, Жырыноўскі ды іншыя пэрсанажы, знаёмыя па выбарах 2000-га, 1996-га, 1993-га. З тымі ж шанцамі.

Тэлебачаньне высмоктвае з пальца антыкамуністычныя факцікі. Нават адкрылі помнік Зюганаву бяз згоды самога Зюганава. Партыі Пуціна патрэбны лёгкі вораг. Ім і сталі няўклюдныя зюганаўцы. Хоць камуністы даўно згадзіліся з рынкам і дэмакратыяй, ім, у адрозьненьне ад эўрапейскіх сацыял-дэмакратаў, цяжка даецца кантакт з СМІ і бізнэсам.

Малдаўскія камуністы вядуць краіну ў Эўропу, украінскія і беларуския ўтварылі прадэмакратычныя кааліцыі з правацэнтрыстамі. У Расеі дэмакратычная канкурэнцыя можа ўзьнікнуць толькі ў выпадку мадэрнізацыі кампартыі і яе зблiжэньня з дэмакратычнай апазыцыяй. Тае самае кампартыі, якая 70 гадоў зьнішчала апанэнтаў. От і думай!

**Мікола Бугай**

### Зь ліста Генадзя Зюганава да Ўладзімера Пуціна

Спадару Прэзыдэнт! Ужо ўсім цалкам зразумела, што парлямэнцкія выбары 7 сьнежня ня будуць ані сумленнымі, ані свабоднымі. Ідзе нястрымная маніпуляцыя грамадзкай думкай, рыхтуецца адкрытая фальсыфікацыя вынікаў галасаваньня. Грамадзтва з агідай сочыць за хвалямі маны і паклёпу, якія вывяргае тэлебачаньне, падкантрольнае Вашай адміністрацыі. Гёбэльс блякне ў параўнаньні з тым, што вытвараюць кіраўнікі тэлеканалаў Дабрадзееў і Эрнст. Прычына відавочная. Улада ня здольна вытрымаць сумленнае спаборніцтва з народным блёкам КПРФ. Адсюль гатэбная адмова «Адзінай Расеі» ўдзельнічаць у тэледэбатах!

Цяпер, як у найгоршыя часы ельцынізму, супраць апазыцыі бессаромна выкарыстоўваецца адміністрацыйная душылаўка. Мы, вядома, разумеем, што тое, што адбываецца, — зусім не самадзейнасьць групы чыноўнікаў. Іх дзеяньні, несумненна, карыстаюцца Вашым поўным адабрэньнем. Мэта відавочная. Гэта ўсталяваньне рэжыму асабістай улады.

Час бы, аднак, падумаць і пра доўгатэрміновыя вынікі. Не забывайце, чым заўсёды і ўсюды канчаецца банапартызм.

### ПРАГНОЗ

**Папулярнасьць палітычных партый за два тыдні да выбараў паводле УЦВГД, %**





АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Беларуская апазыцыя падтрымала СПС

## мітынгам у «Журавінцы»

**У рамках перадвыбарчае кампаніі ў Думу піяршчыкі Саюзу правых сілаў (СПС) выкарысталі ня толькі прэзыдэнта Лукашэнку, але і беларускую апазыцыю.** Менскі запіс праграмы НТВ «Свабода слова» з удзелам Лукашэнкі і Чубайса анансаваўся, яго чакалі, а аднадзённы візыт Барыса Нямцова ў Менск быў неспадзяваным і першым пасьля скандальнай дэпартацыі.

Вечарам 29 лістапада ў сталічнай рэстарацыі «Журавінка» сабраліся апазыцыйныя палітыкі, дэпутаты з групы «Рэспубліка», аналітыкі, праваабаронцы, а таксама паслы Вялікай Брытаніі, Італіі ды дзясяткі журналістаў. Лягчэй сказаць, каго не было: зь лідэраў партый не было Вячоркі, Статкевіча і, натуральна, Беленькага.

У чаканьні Нямцова вядучы «сустрэчы дэпутатаў» генэрал Валеры Фралоў знаёміў прысутных апазыцыянэраў ды весялію публіку сваімі каламбурамі. Ён паведамляў, што «нашы сябры з Расеі ўжо тут», ды дадаваў, што зь імі пэрыядычна сустракаецца, але часьцей у Маскве. Гэты факт пазьней пацьвердзіў і Нямцоў. Ён імкліва ўвайшоў у залю, павітаўся з Шушкевічам, абняўся зь Лябедзькам...

Расейскі госьць распавёў, што спачатку ён, прыкінуўшыся расейскім нафтавіком, прыляцеў у Гомель, а адтуль дабіраўся да беларускай сталіцы замоўленым аўтобусам. КДБ, паводле Нямцова, падкінулі інфармацыю, што ехаць ён будзе машынай па трасе Масква—Берасьце. «Цяпер мы іх крыху абхітрылі, — самаўпэўнена заявіў Нямцоў. — Мая прысутнасьць тут сьведчыць пра тое, што спэцслужбы Беларусі ня ўсёмагутныя». Шушкевіч, аднак, папраўіў яго: «Не такія ў нас дурныя спэцслужбы, як вы мяркуеце... Мне падаецца, што яны з задавальненьнем вас прапусьцілі».

Прысутныя разумелі, што прыезд расейскага палітыка — гэта PR-акцыя напярэдадні выбараў у Дзяржduму. Амаль як прэзыдэнт ЗША, які нечакана прыляцеў у Ірак да сваіх вайскоўцаў. Але ў беларускім інтэр’еры Нямцоў нагадваў хутчэй ня Буша, а Астапа Бэндэра зь несьмяротным «Заграніца нам дапаможа!». Розьніца была хіба ў тым, што, раздаючы абяцаньні і прамаўляючы, Нямцоў нічога не прасіў. Хіба толькі прапаноўваў «аб’ядноўваць высілкі».

СПС падтрымлівае беларусаў у справе супрацьдзеяньня магчымаму рэфэрэндуму і трэцяму тэрміну Лукашэнкі. «Мы гатовыя ўсяляк садзейнічаць усім палітычным сілам у Беларусі, якія будуць удзельнічаць у гэтым працэсе», — казаў Нямцоў. Ён папярэдзіў, што цягам бліжэйшага году будзе праводзіцца «праверка на трываласьць беларускага народу». Паводле Б.Нямцова, рэфэрэндум можа мець «катастрафічныя наступствы для Расеі». Бо ў Расеі знойдуцца палітычныя сілы, якія захочуць паўтарыць «беларускі варыянт».

Нямцоў падтрымаў ідэю збору мільёна подпісаў супраць трэцяга тэрміну Лукашэнкі. Некалі ён, губэрнатар Ніжагародзкае вобласьці, сабраў столькі ж супраць чачэнскай вайны. На яго думку, «гэта будзе важкі крок», які дапаможа аб’яднаць палітычныя сілы. «Ёсьць цэлыя праекты [разьяднаньня апазыцыі], пра іх нам, у Маскве, вядома», — прадэманстраваў сваю інфармаванасьць расейскі палітык.

Нямцоў абнадзеіў прысутных тым, што падкрэсьліў «контрпрадуктыўнасьць усялякіх дыскусіяў між Лукашэнкам і ўладамі Расеі па інтэграцыі», што яны ператварыліся ў фарс, бо беларускі прэзыдэнт «ня выканаў ніводнага абяцаньня». Паводле Нямцова, Лукашэнка ня здольны «да рэальнага і сур’ёзнага дыялёгу з Расеяй» і ў Крамлі ўжо зразумелі, што «рабіць стаўку» на яго ня варта. Найбольш моцныя вопляскі Нямцоў сарваў, калі паабяцаў, што «раней ці пазьней мы тут жа будзем адзначаць дзень вызваленьня Беларусі».

Беларускія ўлады PR-акцыі Нямцова не падыгралі. Ніхто Нямцова не арыштоўваў і не адпраўляў прымусова ў Расею. Журналісты, якія прыехалі ў Менск разам зь лідэрам СПС, засталіся без сэнсацыі.

**Алег Тачоны**

У суседняй Літве насьпявае імпічмэнт. Раландасу Паксасу не ўтрымацца. Бо ён у гонцы за ўладай трапіў у фінансавую залежнасьць ад крымінальных бізнэсоўцаў. Інфармацыю пра гэта здабыў літоўскі Дэпартамэнт грамадзкае бясьпекі. Ён стаіць на службе дзяржавы, а не дзяржаўнага службоўцы, хай сабе й найвышэйшага рангу. Ці можна сабе ўявіць нешта падобнае ў Беларусі? Не. Пасьля вызваленьня Паўлічэнкі і адстаўкі Мацкевіча напэўна не. Беларускія спэцслужбы ў большай ступені служаць канкрэтным асобам у кіраўніцтве дзяржавы, чым дзяржаве як такой, як мэханізму.

Дэмакратычнай дзяржаве патрэбныя сілавыя структуры. Недэмакратычны рэжым жа на сілавых структурах трымаецца. Грузінскія падзеі чарговы раз прадэманстравалі, што сілавікі, бывае, здаюць сваіх «гаспадароў». За грошы, пасады, а нават і за ідэю. Ведаючы такі расклад, улада мусіць трымаць сваіх абаронцаў пад кантролем, безь відочных прычынаў тасуючы кіраўніцтва, аслабляючы адну спэцслужбу на карысьць другой, сілкуючы канкурэнцыю...

Вось і ўдзел кіраўніка Беларусі ў нарадзе па выніках буйнамаштабнай праверкі КДБ (адбудзецца ў пятніцу) спарадзіў чуткі пра магчымую зьмену кіраўніцтва спэцслужбы №1, узмацненьне спэцслужбы №2... Толькі чуткі, ніякай інфармацыі.

Спэцслужбы застаюцца абсалютна закрытымі і абсалютна кіраванымі структурамі ў грамадзтве, якое яшчэ не абсалютна, але ўжо адкрытае. У гэтым крыніца іх сілы, але таму іх і баяцца дый почасту ненавідзяць. Ня тое што армію, традыцыйна адзіную з народам. Ці міліцыянтаў, якіх хутка будзе дастаткова, каб прыставіць па аднаму да кожнага з нас. Але такой закрытай касьце цяжка будзе прыстасавацца да будучага дэмакратычнага грамадзтва.

Па вялікім рахунку, за Лукашэнкам з усімі сілавымі структурамі адбыліся станоўчыя зьмены. Яны пачалі набываць рысы службаў незалежнай дзяржавы, працуюць на яе бясьпеку і абараназдольнасьць, камплектуюцца мясцовымі кадрамі. Вось толькі пра іх беларускі патрыятызм і павагу да палітычнае апазыцыі гаварыць не даводзіцца. Сілавікі жартуюць — не было каманды...

# Head & Shoulders

## беларускага рэжыму

Да сілавых структураў Беларусі адносяцца **Рада бясьпекі**, **Камітэт дзяржаўнай бясьпекі**, **Служба бясьпекі прэзыдэнта**, **Дзяржаўны мытны камітэт**, **Міністэрства ўнутраных справаў**, **Міністэрства абароны**, **Дзяржаўны камітэт памежных войскаў**. Да гэтага сьпісу можна дадаць яшчэ **Пракуратуру** і **Камітэт дзяржаўнага кантролю**.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Замежныя аналітыкі называюць сыстэму беларускіх сілавых структураў унікальнай. Яны адзначаюць «узаемны кантроль усіх сілавых ведамстваў». Насамрэч сытуацыя значна больш тонкая.**

### Мазгавы цэнтар

Галоўны офіс таямнічай **Рады бясьпекі** знаходзіцца ў Адміністрацыі прэзыдэнта на вул. Маркса. Паводле неафіцыйнай інфармацыі, асобныя аддзелы спэцслужбы месьцяцца ў некалькіх раёнах сталіцы. Адзін зь іх, нібыта, маскіруецца пад офіс камэрцыйнай фірмы.

Рада бясьпекі была ўтвораная на самым пачатку прэзыдэнцтва Лукашэнкі — 5 жніўня 1994 г. Да таго пры Саўміне існавала ўпраўленьне па барацьбе са злачыннасьцю і нацыянальнай бясьпецы. Узначальваў яго Генадзь Данілаў. Жартаўнікі называлі «кантору» Данілава ўпраўленьнем «па барацьбе з нацыянальнай бясьпекай»…

Першым дзяржсакратаром Рады бясьпекі быў маёр Віктар Шэйман (ад сьнежня 1999-га — генэрал-маёр). Зьмяніў яго на гэтай пасадзе Ўрал Латыпаў, цяперашні кіраўнік — генэрал-лейтэнант Генадзь Нявыглас. Рада кантралюе дзейнасьць праваахоўных органаў, адсочвае сытуацыю, рыхтуе аналітычныя запіскі. Скандальная публікацыя «Операция «Аист», якая зьявілася ў «СБ» напярэдадні выбараў 2001-га, была «творам» якраз Рады бясьпекі.

Шэйман, сыходзячы ў **Пракуратуру** пры канцы 2000-га, забраў з сабой нямала кадраў з Рады. У тым ліку і нейкае «спэцпадразьдзяленьне Васільчанкі». Гэтая неканстытуцыйная структура існуе з канца 90-х і, паводле пэўных, не пацьверджаных зьвестак, што прачыліся ў апазыцыйную прэсу, адсочвае дзейнасьць апазыцыі і яе лідэраў. Паводле апошніх чутак, сёлетнія набыткі Васільчанкавага спэцпадразьдзяленьня — гэта некалькі аўтамабіляў з спэцапаратурай коштам у сотні тысячаў даляраў. У пачатку верасьня 2001-га яго офіс на Талбухіна, 5а быў «засьвечаны» ў незалежных СМІ. «Кантора» зьмяніла месца дысьлякацыі.

### Правая рука

У апошнія гады ператварыўся фактычна ў спэцслужбу **Камітэт дзяржаўнага кантролю** (КДК). Здарылася гэта пасьля чарговага «ператрахваньня» сілавых структураў, якія Лукашэнка ў другой палове 2001 г. — пачатку 2002-га вырашыў сабраць у некалькі моцных «кулакоў». Адным зь іх стала ведамства Анатоля Тозіка, якое падначаліла сабе Дэпартамэнт фінансавых расьсьледаваньняў.

Генэрал КДБ Тозік, аўтар артыкулаў у «Энцыкляпэдыю гісторыі Беларусі», стаў правай рукой прэзыдэнта. КДК нікім не кантралюецца і трымае справаздачу толькі перад кіраўніком дзяржавы. Аналітыкі адзначаюць, што нават Пракуратура на чале з Шэйманам мае цяпер менш трывалы статус, чым КДК.

Пасьля згаданай рэарганізацыі **МУС** атрымаў у сваё падначаленьне Сьледчы камітэт і Камітэт выкананьня пакараньняў. Але ад гэтага ўмацаваньня вага Міністэрства не ўзрасла. Затое паступова ўзмацняе пазыцыі **Міністэрства абароны** генэрал-палкоўнік Леанід Мальцаў. Рэфармаваньне войска і рэгулярныя вучэньні даюць надзею на большую ўвагу кіраўніка дзяржавы і павелічэньне фінансаваньня.

У **КДБ** — скарачэньні і праверкі. У красавіку 2002-га колькасьць чэкістаў была зьменшаная на 10%, звольнілі начальнікаў Управы контрвыведкі, замежнай выведкі і вайсковай контрвыведкі КДБ. Прычына — слабая актыўнасьць у барацьбе з апазыцыяй і «замежнай пагрозай». Ідзе й першая ў гісторыі буйная праверка ўсіх аддзелаў КДБ. Вынікі будуць падведзеныя 5 сьнежня на нарадзе з удзелам А.Лукашэнкі. Тады ж вырашыцца і лёс Леаніда Ерына. Увага прэзыдэнта да КДБ невыпадковая: наперадзе важныя палітычныя кампаніі.

Сярод усіх канстытуцыйных сілавых структураў аўтаномна працуе адна **Служба бясьпекі прэзыдэнта**, кіраўнік якой трымае справаздачу толькі перад самім А.Лукашэнкам. Офіс гэтай спэцслужбы месьціцца па вул.Бабруйскай, 3, дзе калісьці быў рэспубліканскі штаб грамадзянскай абароны.

### Канкурэнцыя і канфрантацыя

Канкурэнцыя паміж спэцслужбамі пачалася ад самага абвяшчэньня незалежнасьці ў 1991 г. Гэтаму спрыяла сытуацыя ў краіне, дзе была неаўтарытэтная выканаўчая ўлада (Савет Міністраў) і палітычна актыўны Вярхоўны Савет. Прэм’ер Вячаслаў Кебіч, у імкненьні аслабіць уплыў КДБ, гэтую барацьбу нават распальваў. У 1993 г. было пастаўленае пытаньне пра частковае расфармаваньне КДБ, скасаваныя яго службы мусілі перадавацца ў МУС і Мінабароны. Было ініцыяванае стварэньне ў структуры памежных войскаў Аддзелу спэцыяльных актыўных мерапрыемстваў. Праект лабіяваў Генадзь Данілаў. Аднак і старшыня КДБ Эдуард Шыркоўскі, і міністар унутраных справаў Уладзімер Ягораў выступілі супраць стварэньня «паралельнай спэцслужбы».

Апошні прыклад сутыкненьня спэцслужбаў — сытуацыя вакол закрыцьця прадстаўніцтва IREX. Гэтая арганізацыя купляла тэхніку ў менскай фірмы «Грынлайн кампутар», да якой нібыта меў непасрэднае дачыненьне сын цяпер ужо былога начальніка Службы бясьпекі прэзыдэнта Яўгена Дзьвярніцкага. Фірмай зацікавіўся Камітэт дзяржкантролю, але ягоныя супрацоўнікі, верагодна, патрапілі ў добра падрыхтаваную пастку: адзін з кантралёраў быў затрыманы падчас атрыманьня 1200 даляраў хабару і асуджаны. СБП атрымала маленькую перамогу, але яна аказалася піравай: Дзьвярніцкага неўзабаве зьнялі з пасады.

Лукашэнка не прыдумляе нічога новага, калі спрыяе канкурэнцыі паміж спэцслужбамі. Гэта праверана нават заходнімі дэмакратыямі сродак наладжваньня ўзаемнага кантролю, які перашкаджае кансалідацыі сілавікоў. Адна такая спроба кансалідацыі ў справе расьсьледаваньня зьнікненьня апазыцыйных палітыкаў ледзь не прывяла ў лістападзе 2000-га да арышту кіраўніцтва дзяржавы.

**Алег Тачоны**

## Нацыянальная спэцыфіка беларускага КДБ

У часы, калі КГБ СССР узначальваў Андропаў, на ягонае імя зь Менску прыйшла ананімка на... старшыню КГБ БССР. Справай гэтай ананімкі заняліся найлепшыя спэцыялісты саюзнага гэбэ. І аўтар быў знойдзены. Гэта быў... намесьнік старшыні беларускага КГБ. Выпадак быў выключны, таму на «разбор палётаў» у Менск прыехаў сам Андропаў. Кагосьці звольніў, з кагосьці скінуў пагоны. А вышэйшыя афіцэры КГБ БССР запомнілі словы Андропава, якія ён прамовіў з горыччу: «Па колькасьці ананімак і пасквіляў, якія паступаюць у Маскву, Беларусь апярэджвае нават Каўказ і Сярэднюю Азію».

PHOTO.BYMEDIA.NET



КДБ



МУС



РБ



МА



ГП



СБП

# Ратацыя кадраў

## Камітэт дзяржаўнай бясьпекі

Першы старшыня КДБ незалежнай Беларусі генэрал-палкоўнік **Эдуард Шыркоўскі** ў савецкія часы ўзначальваў аддзел 2-й Галоўнай управы КГБ СССР па барацьбе з кантрабандай і незаконнай валютнай дзейнасьцю.

Ягоны наступнік **Генадзь Лавіцкі** прыйшоў на пасаду старшыні КДБ з дэпутатаў Вярхоўнага Савету, але прабыў нядоўга. Летам 1994 г., пасьля абраньня Лукашэнкі, ён быў адпраўлены ў адстаўку. Працаваў паслом у Ізраілі, цяпер адкліканы для кансультацыяў у Менск.

Генэрал-палкоўнік **Уладзімер Ягораў** кіраваў КДБ у 1994—95 г. Да таго часу ён быў міністрам унутраных справаў. Пасьля адстаўкі пайшоў у дэпутаты парлямэнту.

Генэрал-лейтэнант **Уладзімер Мацкевіч** зрабіў кар'еру ў камсамоле, а ў КГБ працаваў з 1976 г. Камітэт ачольваў зь сьнежня 1995 г. да лістапада 2000 г. Пасьля — на дыпляматычнай працы ў Сэрбіі.

Генэрал-лейтэнант **Леанід Ерын** прыйшоў на пасаду старшыні КДБ з пасады начальніка Службы бясьпекі прэзыдэнта. Да кастрычніка 1995 г. ён узначальваў Управу ФСБ па Маскве і Маскоўскай вобласьці (кар'еру чэкіста пачынаў на Віцебшчыне), працаваў намесьнікам старшыні КДБ.

## Міністэрства абароны

Першым міністрам абароны незалежнай Беларусі быў генэрал-палкоўнік **Пятро Чавус.** Пасьля ён узначаліў Суворараўскую вучэльню.

Генэрал-палкоўнік **Павал Казлоўскі** быў прызначаны міністрам абароны ў красавіку 1992-га. Да таго ён служыў намесьнікам ачольніка Беларускай вайсковай акругі. Пасьля прыходу да ўлады Лукашэнкі Казлоўскі быў пазбаўлены ня толькі пасады, але й паніжаны ў рангу — да генэрал-лейтэнанта.

У ліпені 1994-га міністрам абароны стаў генэрал-палкоўнік **Анатоль Кастэнка**, які ў савецкія часы займаў кіроўныя пасады ў БВА. Пасьля адстаўкі ў 1995 г. працаваў прадстаўніком Беларусі ў штаб-кватэры NATO.

**Аляксандар Чумакоў** быў міністрам у 1996—2001 г. Да таго ачольваў Генштаб. Цікава, што спачатку Чумакоў зьмяніў Мальцава, а пасьля — наадварот.

Генэрал-палкоўнік **Леанід Мальцаў** быў міністарам абароны з траўня 1995 г. У пачатку лістапада 1996 г., напярэдадні рэфэрэндуму, яго зьнялі з пасады Лукашэнка. Мальцаў працаваў у Маскве першым намесьнікам начальніка Штабу па каардынацыі вайсковай супрацы краінаў СНД. У сьнежні 2000 г. прызначаны намесьнікам сакратара Рады бясьпекі. З сакавіка 2001-га — зноў міністар абароны.



Бабруйская,3. Офіс таямнічай Службы бясьпекі прэзыдэнта.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Міністэрства ўнутраных справаў

Генэрал-палкоўнік **Уладзімер Ягораў** ачольваў МУС да студзеня 1994 г., а пасьля быў адпраўлены ў адстаўку Вярхоўным Саветам.

Яго зьмяніў **Уладзімер Данько**, што дасездзеў да прэзыдэнцкіх выбараў, а пасьля быў прызначаны кіраваць Акадэміяй міліцыі.

Генэрал-маёр **Юры Захаранка** стаў міністрам летам 1994 г., а да таго ачольваў Сьледчы камітэт МУС. Пасьля канфлікту з Лукашэнкам 16 кастрычніка 1995-га адхілены ад пасады. Лёс ягоны трагічны і невядомы.

**Валянцін Агалец** стаў міністрам у сьнежні 1995-га, да таго быў першым намесьнікам міністра, камандаваў унутранымі войскамі. Вызвалены ад пасады 8 лютага 1999-га «ў сувязі зь пераводам на іншую працу», быў прадстаўніком МУС ва Ўкраіне.

**Юры Сівакоў**, кадравы танкіст, быў прызначаны міністрам у лютым 1999 г. Да таго працаваў начальнікам аддзелу апэратыўнага рэагаваньня Дзяржсакратарыяту Рады бясьпекі. Зь сьнежня 1996-га — намесьнік міністра ўнутраных справаў, ачольнік унутраных войскаў. Пасьля адстаўкі з пасады міністра ў красавіку 2000-га працаваў у Адміністрацыі прэзыдэнта, цяпер — міністар спорту і турызму.

**Уладзімер Навумаў** працуе міністрам унутраных справаў зь верасьня 2000 г. Да таго ён ачольваў СБП, а яшчэ раней (з 1991 г.) быў камандзірам атраду спэцпрызначэньня МУС па барацьбе з тэрарызмам «Алмаз».

## Рада бясьпекі

Першым кіраўніком Рады бясьпекі быў маёр **Віктар Шэйман**. У лістападзе 2000-га стаў генпракурорам.

З лістапада 2000-га дзяржсакратаром Рады бясьпекі і памочнікам прэзыдэнта па нацыянальнай бясьпецы быў палкоўнік запасу **Ўрал Латыпаў**. Гэта прафэсійны кадэбіст, у 1989—94 г. ён быў начальнікам катэдры спэцдысцыпліна ў, намесьнікам начальніка Інстытуту нацыянальнай бясьпекі. У 1994-м — сьнежні 1998-га — памочнік прэзыдэнта, пасьля — міністар замежных справаў. Цяпер кіруе Адміністрацыяй.

Сёньняшні кіраўнік Рады бясьпекі **Генадзь Нявыглас** быў прызначаны дзяржсакратаром у верасьні 2001 г.

## Служба бясьпекі прэзыдэнта

Першым кіраўніком Службы бясьпекі быў палкоўнік (паводле іншых зьвестак, ужо генэрал) КДБ **Юры Бародзіч**. Да СБП ён камандаваў атрадам «Альфа» КДБ. У сьнежні 1998-га Бародзіча адазвалі назад у КДБ і накіравалі ў Маскву каардынаваць супрацу беларускіх і расейскіх спэцслужбаў.

Генэрал **Уладзімер Навумаў** прыйшоў у СБП з пасады камандзіра «Алмазу». Ён таксама быў адкліканы ў сваю былую структуру — стаў міністрам унутраных справаў.

У верасьні—лістападзе 2000 г. СБП ачольваў генэрал-лейтэнант **Леанід Ерын**, які прыйшоў з КДБ і туды ж вярнуўся праз некалькі месяцаў.

Наступны кіраўнік — **Генадзь Нявыглас** — прыйшоў у СБП з пасады намесьніка старшыні Дзяржкамітэту памежных войскаў, а сышоў у верасьні 2001 г. у дзяржсакратары Рады бясьпекі.

Палкоўнік **Яўген Дзьвярніцкі** ачольваў СБП да верасьня 2003 г. А яшчэ ж у 1995—96 г. быў кіраўніком шклоўскай міліцыі. У Службу бясьпекі прыйшоў з пасады старшыні Дзяржкамітэту фінансавых расьсьледаваньняў.

Сёньняшні начальнік СБП генэрал-маёр **Юры Жадобін** раней камандаваў унутранымі войскамі, а яшчэ раней служыў у сыстэме Грамадзянскай абароны. Як і Сівакоў, ён танкіст, вучыўся ў Казані.

**Падрыхтаваў Алег Тачоны**

# Ці баяздольнае Беларускае войска?

**Як бы ні рапартавалі генэралы пра мадэрнізацыю і рэфармаваньне Ўзброеных Сілаў, партызаншчына па-ранейшаму застаецца для Беларусі самым пэрспэктыўным сродкам абароны ад агрэсіі. А ядром гэтага партызанскага руху павінен стаць спэцназ. Гэтак лічыць палкоўнік Уладзімер Барадач, легендарны камандзір брыгады Мар'інагорскага спэцназу.**

**«НН»: Як бы Вы ацанілі стан і баяздольнасьць беларускага войска?**

**Уладзімер Барадач:** Найперш няясна, чаго мы хочам зь яго дапамогай дасягнуць. Хочам шляхам вайсковай сілы пашыраць сваю тэрыторыю? Ці ўтрымаць тую, што ёсьць, і захаваць яе незалежнасьць? Трымаем вялізарную структуру на выпадак вайны, але, згодна з усімі прагнозамі, наагул ня можам удзельнічаць у баявых дзеяньнях.

У выпадку нападу на нас нейкага агрэсара, беларускія Ўзброеныя Сілы могуць толькі пасьпець заняць абарону, спыніць праціўніка і стрымліваць яго некалькі дзён альбо тыдняў, каб пасьпець заявіць у ААН пра агрэсію. Безумоўна, мы можам весьці эфэктыўную партызанскую вайну…

**«НН»: Спэцназ рыхтуюць да гэтага?**

**У.Б.:** У Беларусі яшчэ з часоў СССР існуе падрыхтаваны «партызанскі» рэзэрв. Вельмі многія калісьці праходзілі адпаведную падрыхтоўку. Праходзяць яе і цяпер у 5-й асобнай брыгадзе спэцпрызначэньня. Ёсьць спэцаддзелы пры МУС, КДБ, якія таксама маюць падрыхтаваныя рэзэрвы — былых сваіх байцоў. Гэта спэцы ў партызанскай вайне. Іншая справа, што трэба яшчэ падрыхтаваць інфраструктуру: тайнікі, зброю, шматузроўневую сыстэму кіраваньня партызанскім рухам і г.д. Але на сёньня няма загаду займацца гэтай падрыхтоўкай.

**«НН»: Колькі гадоў гавораць, што войску трэба рэформа. Чаму зрухаў няма?**

**У.Б.:** Беларусь пакуль выбірае палітычны курс, і няясна, да чаго рыхтавацца. Вайсковае ж кіраўніцтва не зацікаўленае ў зьменах, а значыць скарачэньні штату. Зрабі паспрабуй баяздольнай армію, калі катастрафічна не хапае сродкаў!

**«НН»: Але ж беларускія жаўнеры былі найлепшыя ва ўсім СССР!**

**У.Б.:** Беларусь мае выдатны людзкі патэнцыял. Беларусы могуць пайсьці ў добрую армію і быць выдатнымі жаўнерамі. Але цяперашняя моладзь ужо іншая. Раней мы былі як «зомбі краіны саветаў». Загад — і мы загінулі. Самае галоўнае — выканаць баявую задачу. У імя чаго — малады чалавек не задумваўся. А цяпер ён бачыць, як жывуць людзі за мяжой. Пачынае задаваць сабе пытаньні: «За што я павінен аддаць жыцьцё? За Айчыну? А што яна дае маім дзецям, мне?»

Цяпер у нашай дзяржаве спрабуюць выпрацаваць ідэалёгію. А ідэалёгія грунтуецца альбо на рублі, альбо на любові да Айчыны. І, дарэчы, узаемнай любові.

Працяг на старонцы 6.

# Як робіцца «дах»

**Увесь буйны бізнэс у Беларусі кантралюецца спэцслужбамі. Такія чуткі ходзяць ужо даўно. Кажуць таксама, што гады тры таму паміж сілавікамі пачаліся разборкі за сфэры ўплыву. Але ўсе спрэчныя пытаньні пакуль разрульваюцца бяз стрэлаў. Пра сёньняшнія стасункі бізнэсу, спэцслужбаў і крыміналу распавядае бізнэсмэн зь дзесяцігадовым стажам (назавём яго Х.), фірма якога сем гадоў працуе пад «дахам» сілавікоў.**

**«НН»: Якім чынам спэцслужба N прапанавала Вам свой дах?**

**Х.:** Чалавек імкнецца да спакою, бізнэсмэн імкнецца да стабільнасьці. А тут да цябе прыяжджае брыгада бандытаў, каб ты плаціў ім грошы. У гэты момант знаходзіцца хтосьці, хто «выпадкова» мае знаёмых у нейкай спэцслужбе. На месца «сустрэчы з браткамі» прылятаюць хлопцы з аўтаматамі. Бандыты «палохаюцца» і зьнікаюць. А спэцы заводзяць з табой «нефармальнае» знаёмства. Справа сканчаецца сымбіёзам. І толькі праз год пасьля маскі-шоў ты натыкаешся на спэцоў і «бандытаў», якія разам п’юць у лазьні...

**«НН»: Вы спрабавалі адмовіцца ад «даху»?**

**Х.:** Фактычна не. Была гісторыя Юліка А., фірма якога мела мянтоўскі дах. Ён вырашыў зьехаць за мяжу, у Ізраіль. Але яго арыштавалі, адабралі ў яго ўвесь ягоны бізнэс. Кажуць, што за вызваленьне сваякі заплацілі 150 тыс. даляраў... Існуе цэлая сыстэма выбіваньня грошай зь бізнэсу. Аж да таго, што чалавека арыштоўваюць і зьмяшчаюць у ізалятар. Праз нейкі час яму прыносяць мабільнік і, у залежнасьці ад прыбыткаў ягонага бізнэсу, называюць суму, якую трэба сабраць (200—400 тыс. баксаў). «Звані!» — кажуць бізнэсоўцу.

**«НН»: Сыстэма «дахаў» прыводзіць да зрастаньня спэцслужбаў з пэўнымі крымінальнымі структурамі?**

**Х.:** Я б не назваў гэта зрастаньнем. Гэта сыстэма кантролю. Хлопцы таксама хочуць легалізоўваць свае грошы і сувязі. За тое, што яны яшчэ існуюць, бандыты мусяць дзяліцца з спэцамі інфармацыяй... А спэцслужбы могуць паспрыяць узвышэньню ў крымінальным асяродзьдзі. Гэтым хваляцца мае хлопцы з N. Ня ў офісе — у лазьні.

**Гутарыў Павал Сумарока**

# Ці баяздольнае Беларускае войска?

Працяг са старонкі 5.

**«НН»: А як жа кодэкс гонару, незалежнасьць сваёй краіны?**

**У.Б.:** Цяпер афіцэраў цікавіць пераважна ўзровень іх жыцьця, памер заробку, камфорт. Да стварэньня саюзу Беларусі і Расеі ці іншай формы супрацы яны ставяцца з такой пазыцыі, каб гэта было найперш выгадна ў матэрыяльным пляне. Ёсьць розныя катэгорыі афіцэрства. Некаторыя баяцца поўнай незалежнасьці Беларусі і ўсплёску нацыяналізму. Але такія засьцярогі ствараюцца штучна, бо падставаў для гэтага ў нас няма. Большасьць афіцэраў прыхільна ставіцца да саюзу, меншасьць хацела б інтэграцыі з Захадам, і працэнтаў трыццаць згодныя інтэгравацца з кім заўгодна, абы толькі было нармальнае жыцьцё. Наагул, няма ў нас нацыянальнага стрыжня. Цяпер існуе сыстэма недапушчэньня разьвіцьця нацыяналізму ў Беларусі. Але, калі будзе прынятая сыстэма інтэрнацыяналізму, мы зноў дойдзем да абсурду.

**«НН»: Наколькі я ведаю, беларуская армія перажыла некалькі «чыстак» патрыятычна настроеных і «палітычна нядобранадзейных» афіцэраў...**

**У.Б.:** Гэта не была чыстка. Папросту афіцэры-беларусы, якія вярталіся на Радзіму, не прымаліся на службу ў беларускую армію і звальняліся ў запас. Укамплектаванасьць кадрамі ў Беларускай вайсковай акрузе была 100%! І мала хто з тых жа азэрбайджанцаў хацеў ехаць на сваю радзіму — тут быў вышэйшы ўзровень жыцьця, а БВА лічылася прэстыжнай акругай. Таму і не адбылася ратацыя кадраў, якая ў пераходны пэрыяд мусіць быць хуткай і маштабнай.

Гэта наклала адбітак на разьвіцьцё Ўзброеных Сілаў, і наступствы яшчэ доўга будуць адчувацца. Папросту палітычнае кіраўніцтва не ўмяшалася ў праблему, яе аддалі людзям, што вырашылі яе не ў інтарэсах дзяржавы. На нацыянальныя інтарэсы ім было напляваць. У сілавых структурах павінны застацца людзі, якія на 100% будуць абараняць інтарэсы беларускай дзяржавы.

**Размаўляў Сяргей Ёрш**

ДАВЕДКА «НН»:

Уладзімер Барадач нарадзіўся ў 1951 г. у вёсцы Нача на Крупшчыне. Скончыў Менскую сувораўскую і Разанскую дэсантную (факультэт «Спэцназ») вучэльні. У 1981—83 г. ваяваў у Аўганістане. Камандаваў Мар’інагорскай брыгадай спэцназу Галоўнай выведнай управы Генштабу. У Савецкім Саюзе, з чатырнаццаці такіх брыгадаў, «беларуская» была самая магутная. Напярэдадні путчу 1991 г. датэрмінова атрымаў ад міністра абароны СССР Язава ранг палкоўніка, але загаду ісьці на Маскву не дачакаўся. Некалькі гадоў служыў у беларускіх Узброеных Сілах. Звольніўся ў запас у 1993 г. Вядомасьць набыў увосень 1996-га, падчас супрацьстаяньня паміж Вярхоўным Саветам і Лукашэнкам, калі ў палкоўніку многія бачылі магчымага кіраўніка вайсковага перавароту. У першай палове 90-х быў сябрам Беларускага згуртаваньня вайскоўцаў, у 1999 г. разам з генэралам Захаранкам заснаваў Беларускі кангрэс афіцэраў. Пазьней з палітыкі сышоў у бізнэс.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Палкоўнік Барадач:**
У сілавых структурах павінны застацца людзі, якія на 100% будуць абараняць інтарэсы дзяржавы

# Лёс генэрала Шыркоўскага

У Маскве памёр былы старшыня КДБ Беларусі Эдуард Шыркоўскі. Здарылася гэта амаль два гады таму, а ў Беларусі дагэтуль пра ягоную сьмерць не напісана ні радка (калі не лічыць нэкралёгу ў стаўбцоўскай газэце «Прамень»). І былыя калегі, і сябры прамаўчалі, хоць некаторыя і прысутнічалі на пахаваньні Шыркоўскага 14 сакавіка 2002-га на Траякураўскіх могілках у Маскве. Адзіны нэкралёг удалося адшукаць у расейскай газэце «Дуэль». «Група таварышаў» распавяла пра жыцьцёвы шлях Э.Шыркоўскага, якога «ведала ўся краіна ад Прыбалтыкі да Камчаткі, ад Мурманску да Кушкі». Якая слава, такая і памяць.



Якраз цяпер спаўняецца дзесяць гадоў з часу вядомага канфлікту паміж прэм’ерам Кебічам і старшынём КДБ Шыркоўскім. Кебічу не падабалася, што КДБ занадта самастойны і моцны. Прэм’ер бачыў у Камітэце небясьпеку, асабліва непакоіла яго асоба старшыні. Увосень 1993-га Шыркоўскі і міністар унутраных справаў Уладзімер Ягораў выступілі ў СМІ з адкрытым лістом пра карупцыю ў вышэйшых эшалёнах улады. Пайшлі ва-банк, але нешта не разьлічылі, і ў студзені 1994 г., пасьля скандалу з выдачай Літве ўцекачоў-камуністаў, Вярхоўны Савет адправіў Шыркоўскага і Ягорава ў адстаўку. З іроніі лёсу, Ягораву пасьля давялося ўзначальваць Камітэт дзяржаўнай бясьпекі. А Шыркоўскі зьехаў у Маскву.



Ён быў апошнім старшынём КГБ БССР і першым — КДБ РБ. Генэрал-палкоўніку Эдуарду Шыркоўскаму давялося кіраваць спэцслужбай незалежнай дзяржавы, і гэтая самастойнасьць яму падабалася. Аднак настальгія па СССР і адзіным, магутным КГБ вярнулася да старога ваўка Шыркоўскага перад сьмерцю. 20 сьнежня 2000 г. маскоўская газэта «Трибуна» надрукавала пустахвальнае выказваньне былога галоўнага чэкіста Беларусі: «Я цяпер вельмі шкадую пра тое, што ў 1991 г. у Віскулях не арыштаваў усю гэтую тройцу, якая разваліла Савецкі Саюз».

Малавядомы эпізод у біяграфіі Шыркоўскага — прэзыдэнцкія амбіцыі, якія праявіліся незадоўга да адстаўкі з пасады старшыні КДБ. Пятро Краўчанка распавядае: «У Шыркоўскага былі пляны ў канцы 1993-га — пачатку 1994-га вылучацца ў прэзыдэнты. Але яго ў гэтым стрымлівала жонка, вельмі разумная жанчына, адвакатка, выдатны аналітык. Я думаю, яна і паўплывала на тое, каб ён не рабіў гэтага кроку». Паводле Краўчанкі, Шыркоўскі спрабаваў адсоўваць убок патэнцыйных канкурэнтаў: «У нейкім сэнсе ён кантраляваў значную частку парлямэнту. У яго быў уплыў на многіх дэпутатаў».

Пра занятак Э.Шыркоўскага ў Маскве вядома мала. Маючы там шырокія сувязі, ён распачаў свой бізнэс. Кажуць, заснаваў ахоўную фірму, якая займалася найперш аховай інфармацыйнай. Хацеў Шыркоўскі адкрыць яе філію ў Беларусі — не ўдалося. Кажуць таксама, што ён кіраваў службай бясьпекі камэрцыйнай структуры. Вельмі, дарэчы, распаўсюджаны варыянт працаўладкаваньня адстаўных генэралаў КДБ.

Шыркоўскі, у адрозьненьне ад свайго былога падначаленага Валер’я Кеза, не палез у палітыку, ня стаў «зьліваць» кампрамат на першых асобаў беларускай дзяржавы, не пайшоў на зьбліжэньне з апазыцыяй, хоць кантакты зь некаторымі апазыцыйнымі дзеячамі меў. У апошнія гады жыцьця пра яго ня згадвалі журналісты. Напрыклад, пры канцы лістапада 2001-га асобай Шыркоўскага чамусьці зацікавіўся інтэрнэт-сайт agentura.ru. Рэдактар гэтага рэсурсу зьмясьціў на сайце інфармацыю, што шукае маскоўскія каардынаты Шыркоўскага. Ці знайшлі і што хацелі ад адстаўнога генэрала — невядома. А праз некалькі месяцаў Шыркоўскага ня стала.

**Алег Тачоны**



WWW.DUEL.RU

**Пра сьмерць Шыркоўскага ў яго роднай вёсцы Новы Сьвержань, што пад Стоўпцамі, даведаліся ў той жа дзень. На пахаваньне ў Маскву езьдзілі пляменьнікі. Бацькі генэрала памерлі гадоў дзесяць таму, але ў вёсцы жыве яго старэйшы брат Браніслаў. Пра Шыркоўскага вяскоўцы гаварылі, што «ранавата памёр», — ніхто раней ня чуў, каб ён хварэў. На гэтай глебе ўзьнікаюць самыя розныя чуткі.**

# Рупары сілавікоў

Флягманамі сілавых структураў зьяўляюцца газэты **«Во славу Родины»** і **«На страже»** (за саветамі — «На страже Октября»).

Орган Мінабароны «Во славу Родины» выходзіць пяць разоў на тыдзень накладам 10425 асобнікаў (акрамя суботняга выпуску, наклад якога на 2000 большы). Пры канцы 90-х было ў тры разы болей, але агульная для прэсы тэндэнцыя зьніжэньня накладаў не магла не закрануць і галоўную вайсковую газэту краіны.

«На страже», якую выдае МУС, выходзіць штотыднёва і мае адзін дадатковы выпуск у месяц. Яе наклад у сярэдзіне 80-х складаў 250 тыс., а к 1998-му зьменшыўся да 114 тыс. асобнікаў. Цяпер газэта мае каля 26 тыс. падпісчыкаў, яшчэ тысяча асобнікаў прадаецца.

З 1996 г. Мінабароны выдае каляровы (але бяз голых цыцак) часопіс **«Армия»**. Ён выходзіць раз на два месяцы нязьменным накладам 3000 асобнікаў. 70% накладу распаўсюджваецца па падпісцы.

МУС мае два сваіх пэрыёдыкі ў абласных цэнтрах. У Горадні ўжо сем гадоў выдаецца тыднёвік **«Милицейский вестник»**. У Віцебску з канца 80-х выходзіць **«Газета віцебскай міліцыі»**. КДБ з 1993 г. выдае квартальны **«Вестник КГБ Республики Беларусь»**, прызначаны для службовага карыстаньня.

І Міністэрства абароны, і МУС маюць свае інтэрнэт-рэсурсы, а вось КДБ толькі зьбіраецца займець сайт. Начальнік управаўленьня інфармацыі і грамадзкіх сувязяў КДБ **Аляксандар Базанаў** абяцае, што сайт зьявіцца налета.

**Падрыхтаваў СЁ**

ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

## Няма калі піць

**Продаж алькагольных напояў у Беларусі зьменшыўся на 4,9% проці мінулага году.** Рэшткі гатовай прадукцыі на складах вырасьлі ў тры разы.

## Новы ціск на «Транснафтапрадукт»

**2 сьнежня Гомельскі абласны гаспадарчы суд слухаў пазоў Міністэрства падаткаў і збораў да «Захадтранснафтапрадукту» пра спагнаньне 26,25 млрд рублёў,** «атрыманых ад дзейнасьці, ажыцьцёўленай на грунце няслушных зьвестак пра рэгістрацыю». Справа ідзе пра спосаб карыстаньня маёмасьцю прадпрыемства. Расейскі нафтаправод аспрэчвае пазоў. Суд адклаў прыняцьце рашэньня да 26 сьнежня.

## СП «Белрыбы» з Расеяй

**«Белрыба» мае стварыць сумеснае прадпрыемства з адной з расейскіх дзяржаўных рыбалоўных кампаніяў.** СП будзе пастаўляць акіянічную рыбу ў Беларусь. Долі заснавальнікаў, як мяркуецца, будуць роўныя. Расейскі ўдзельнік вызначыцца ў сярэдзіне студзеня. Квоты на імпарт і продаж рыбы вызначае для юрыдычных асобаў і прадпрымальнікаў Кіраўніцтва справамі прэзыдэнта.

## «Гумана» вяртаецца на рынак

**Міністэрства аховы здароўя дазволіла продаж дзіцячага харчаваньня гандлёвых марак «Гумана», «Рэмэдыя» і «Бэбі Сітэр» на аснове соі з Германіі.** Яго продаж быў прыпынены, калі ў Ізраілі сталі хварэць і паміраць дзеці, якім замест матчынага малака давалі гэтае харчаваньне.

## Манаполія «Газпрому» на польскім рынку

**Скасаваны кантракт нарвэскага «Статойлу» і польскага дзяржаўнага канцэрну PGNiG аб простых пастаўках нарвэскага газу нашым заходнім суседзям.** Меркавалася наладзіць сыстэму транзыту праз Нямеччыну. Газ падаўся задарагім для Польшчы. Кантракт з нарвэжцамі падпісаў папярэдні правы ўрад Ежы Бузка, ён жа правёў заканадаўчую норму пра неабходнасьць дывэрсыфікацыі крыніцаў энэрганосьбітаў. Левы ўрад Мілера скасаваў норму, а асобы, што заключалі ўгоду з скандынавамі, больш не працуюць у PGNiG. 90% імпартаванага газу пастаўляе ў Польшчу «Газпром». Дамова зь ім прадугледжвае, што такая сытуацыя захавaецца да 2022 г.

## «Ікеа» вернецца ў Беларусь

**Кіраўнік прадстаўніцтва швэдзкага канцэрну «Ікеа» Штэфан Калецiч паведаміў пра размарозку праекту аб пабудове заводу фірмы ў Віцебскай вобласьці.** Справа прыпынілася летам 2002 г. У камбінат швэды хацелі б укласьці да 25 млн даляраў. Ідуць адпаведныя перамовы з урадам.

## Рэкордныя валютныя запасы ў Расеі

**Яны дасягнулі найвышэйшага ў гісторыі ўзроўню:** 66,2 млрд даляраў.

## Пірацкі «Windows Longhorn»

**Азіяцкія піраты выставілі на рынак найноўшую апэрацыйную сыстэму «Microsoft»… за год да яе афіцыйнае прэзэнтацыі.** «Longhorn», што мае замяніць «Windows XP», выйдзе на рынак не раней за 2005 г., а на чорных рынках Ганконгу і Куала-Лумпуру сыстэма новага пакаленьня ўжо прадаецца за два даляры. «Microsoft» спрабуе вызначыць шляхі выкраданьня.

**МБ; БелаПАН**

ШТО Ў СЬВЕЦЕ РОБІЦЦА

# Крыжовы паход па актыўных мужчынаў

## Француская каталіцкая газэта дае прыклад іншай журналістыкі

Як завецца адзіная агульнафранцуская штодзённая газэта, продажы якой за апошні год ня зьменшыліся? Гэта каталіцкая «Croix» («Круа», г.зн. «Крыж»), якая існуе ўжо 120 гадоў! Нядаўна яна памяняла дызайн, каб прыцягнуць новых, маладзейшых чытачоў.

Героі рэклямнай кампаніі «Croix», якая абышлася ў 400 тысяч эўра, — Буш, Ленін і Жазэ Бавэ, лідэр францускіх антыглябалістаў. Прэзыдэнта ЗША над Сэнай ня дужа шануюць, затое да правадыра сацыялістычнай рэвалюцыі многія і сёньня адчуваюць сантымэнт. Выбар гэтых фігур адпавядае духу выданьня, якое плыве «ня ў рэчышчы» поглядаў большасьці французаў. Праз гэта газэце цяжка даецца рынкавы посьпех. 95,6 тыс. прададзеных экзэмпляраў «Croix» — не найлепшы вынік для краіны з 60-мільённым, пераважна каталіцкім насельніцтвам. Цяжка дасягнуць лепшых вынікаў, калі тыповы чытач газэты — 60-гадовая шчырая каталічка, якая атрымлівае «Croix» праз падпіску (як і астатнія 94% чытачоў, што забясьпечвае выданьню нечуваную на францускім рынку стабільнасьць продажаў).

«Croix» паставіла перад сабой сьціплую мэту — адолець за год-два стотысячны бар’ер. Газэта хоча завяваць новых чытачоў — мужчынаў у веку ад 30 да 50 гадоў, якім абрыдла павярхоўная і сэнсацыйная журналістыка большасьці францускіх выданьняў. «Лепей займацца спакойнай журналістыкай, якая адраджаецца, чым гістэрычнай, якая занепадае, — пераконвае галоўны рэдактар «Croix» Бруно Фрапа. — Нас цікавіць журналістыка, якая дае пажытак для роздуму. Мы хочам знайсьці маладзейшых, актыўных чытачоў-мужчын».

Рэклямная кампанія абмежаваная агляммэрацыяй Парыжу. «Croix», адзіная з усіх агульнанацыянальных газэтаў Францыі, цягам 2003 г. утрымала продажы на нязьменным узроўні. Гэтаму папярэднічаў іх амаль 6-працэнтны рост у 2002 г., чаму не перашкодзіла павышэньне цэн на 10% у кіёсках і на 4—6% праз падпіску. «Croix» атрымае сёлета 300—500 тысяч эўра прыбытку (пры трыццацімільённым абароце) — рэч таксама бесправдзэнтная, бо ўся астатняя француская прэса ў год агульнаэўрапейскага эканамічнага спаду спрацавала з стратамі. Трэба зрабіць адно ўдакладненьне: «Croix», як і камуністычная «Humanite» ды «France Soir», атрымлівае дапамогу ад дзяржавы, бо мае малыя прыбыткі ад рэклямы. Бяз гэтай падтрымкі страты за год склалі б пад 1,7—1,9 млн эўра.

Каталіцкае выданьне павольна адбірае чытачоў у знакамітай «Monde», антыамэрыканская, выключна левая пазыцыя якой, разам з рыгарыстычнай абаронай францускай мадэлі сьвецкай дзяржавы, не адпавядае густам французаў-цэнтрыстаў, асабліва каталікоў. Рэшткі рэпутацыі «Monde» моцна падмачылі некалькі кніг з крытыкай у адрас выданьня (адну напісаў журналіст самой «Monde», за што быў звольнены з працы). Найпаважнейшую газэту Францыі вінавацяць у страце журналісцкай аб’ектыўнасьці і пагоні за таннымі сэнсацыямі.

Новы дызайн «Croix» мае на мэце асучасьніць воблік газэты, які апошні раз мяняўся ў 1999 г. Ранейшым застанецца фармат і колькасьць старонак (28), затое больш стане колеру, карацейшымі зробяцца інфармацыйныя паведамленьні, штодня будзе зьяўляцца новы тэматычны дадатак. Будуць захаваны вялікія, на цэлую старонку, публіцыстычныя артыкулы і рэпартажы. Перавага будзе аддавацца адной вялікай ілюстрацыі, а ня мноству малых. «Мы хочам, каб «Croix» была такой жа газэтай, як і ўсе іншыя, а не спэцыфічна каталіцкім выданьнем», — гаворыць Фрапа. 12 сьнежня, на 120-ю гадавіну газэты, рэдакцыя вырашыла зрабіць «дзень адчыненых дзьвярэй».

Францускую прэсу ў найбліжэйшым часе чакае рэвалюцыя, у якой «Croix», з прычыны абмежаваных фінансавых магчымасьцяў, напэўна ня возьме ўдзелу. З 1 студзеня 2004 г. газэты атрымаюць права даваць рэкляму на тэлебачаньне. Як паведамляе «Monde», Бюро кантролю за рэклямай папярэдзіла выдаўцоў, што шмат у каго зь іх з гэтым будуць праблемы. Згодна з францускім заканадаўствам, нельга паказваць па тэлебачаньні занадта палітызаваныя ролікі (напрыклад, першая старонка штотыднёвіка «Express» з загалоўкам «Канец прэм’ера Рафарэна» была б зьнята з этэру), а таксама рэкляму, якая мае элемэнты парнаграфіі.

Рэкляма газэт па тэлебачаньні павінна павялічыць іх аўдыторыю, якая за апошні год упала ў Францыі на 2,5%. Францускі рынак прэсы — гэта пад 10,3 млрд эўра абароту, удвая больш, чым рынак тэлевізійны. Штодзень прадаецца 7,8 млн экзэмпляраў газэт, пераважна мясцовых. 164 прададзеныя экзэмпляры на тысячу жыхароў ставяць Францыю на 31-е месца ў сьвеце. А найболей чытаюць нарвэжцы (704 экзэмпляры на тысячу жыхароў) і японцы (653).

**ФС; паводле «Gazety Wyborczej»**

# Указ №508 абараняе інтарэсы Беларусі

12 лістапада пабачыў сьвет указ Лукашэнкі №508 «Аб некаторых пытаньнях банкруцтва». Дакумэнт мае яскрава акрэслены антырынкавы характар, калі падыходзіць з боку эканамічнай тэорыі. Зьдзіўляе, аднак, ня гэта. Зьдзіўляе гістэрычная рэакцыя шмат якіх беларускіх эканамістаў на дадзены дакумэнт.

Гучаць зашмальцаваныя аргумэнты, кшталту: прадпрыемствы стратныя, неэфэктыўныя, патрабуюць зьмены ўласьніка, г.зн. прыватызацыі, якая, як правіла, — вынік банкруцтва. Ва ўмовах стабільнай рынкавай эканомікі, сапраўды, гэты інструмэнт выніковы, бо выклікае аздараўленьне «хворых» суб’ектаў рынку — як натуральны адбор у прыродзе прыводзіць да аздараўленьня відаў жывёл.

Аналітыкі ў выпадку з указам №508 забываюцца, у якіх варунках функцыянуюць нашыя прадпрыемствы. На сёньня яны вінныя прадпрыемствам Расеі больш, чым расейскія беларускім. І пры адпаведных умовах расейцы пачалі б скупляць нашыя прадпрыемствы за пазыкі. А некаторыя прадпрыемствы ў тыя пазыкі маглі б адмыслова заганяць, каб потым перадаць крэдытору па цане, ніжэйшай за рынкавую.

Санацыя неэфэктыўных прадпрыемстваў неабходная, таксама як і прыход у Беларусь замежнага капіталу. Ня трэба тлумачыць розьніцу паміж капіталам расейскім і заходнім: калі апошні прыходзіць да нас з высокай карпаратыўнай культурай, сучаснымі тэхналёгіямі ў вытворчасьці і мэнэджмэнце, дык першы — з карупцыяй, непавагай да стандартаў у сфэры экалёгіі, аховы працы і г.д.

Жаданьне расейскага бізнэсу захапіць найбольш прыбытковыя беларускія рынкі (нафтаперапрацоўка, бровары) не магло застацца без увагі Лукашэнкі. Абмяжоўваючы выкарыстаньне працэдуры банкруцтва, ён бароніць беларускія прадпрыемствы ад захопу расейскімі, а значыць, бароніць Беларусь ад узмацненьня ўплываў іншае дзяржавы.

Прыхільнікі рэформаў сьцьвярджаюць, што кожная передача неэфэктыўнага прадпрыемства «эфэктыўнаму ўласьніку» ёсьць пазытыўнай зьменай для эканомікі. Такі падыход ня мае пад сабой грунту ў сёньняшняй геапалітычнай сытуацыі.

Рэформы павінны мець адзіную мэту — падвышэньне дабрабыту насельніцтва Беларусі, і тое ў доўгатэрміновай перспэктыве. Перадаць нашыя прадпрыемствы зараз «эфэктыўнаму» расейскаму ўласьніку — значыць пазбавіцца нават самой надзеі на падвышэньне дабрабыту хоць праз дзесяцігодзьдзі. Калі ж захаваць прадпрыемствы ў сёньняшнім стане, дык праз колькі гадоў будзе ячшэ магчымасьць знайсьці стратэгічных інвэстараў, што зробяць іх высоканканкурэнтнымі і здольнымі рэалізаваць прадукцыю на сусьветных рынках.

**Дамінік Міхайловіч**

ЭЎРАІНТЭГРАЦЫЯ: ПОЛЬСКІ ДОСЬВЕД

# Пэнсійная сыстэма Польшчы і Эўропы

Як выглядае польская пэнсійная сыстэма? Як Польшча была вымушаная яе зьмяніць з прыстасаваньнем да стандартаў Эўразьвязу? Як будзе выглядаць выплата пэнсіі пасьля ўваходу ў ЭЗ?

Ад 1 студзеня 1999 г. у Польшчы пачала дзейнічаць новая пэнсійная сыстэма. Згодна зь ёй, пэнсіянэры атрымліваюць грошы з дзьвюх крыніцаў: з рэфармаванага Ведамства сацыяльнага страхаваньня і Адкрытых пэнсійных фондаў. Складкі, якія трапляюць у тыя фонды, рэгіструюцца на індывідуальных пэнсійных рахунках. Пералічаныя сродкі павялічваюцца шляхам інвэстыцыі на фінансавых рынках. Таму ўзровень будучай пэнсіі залежыць таксама ад эфэктыўнасьці інвэстыцыяў згаданых фондаў.

Урад хоча ад 1 красавіка 2004 г. увесьці індывідуальныя пэнсійныя рахункі, на якія можна было б наўпрост пералічваць грошы. Рада Міністраў прыняла ўжо адпаведны праект закону. Ён прадугледжвае, што кожная асоба зможа заснаваць індывідуальны рахунак, на які яна будзе пералічваць дадатковыя грошы на пэнсію. Сродкі будуць вызваленыя ад падаходнага падатку, хіба ўласьнік захоча атрымаць грошы раней за пэнсійны век. Абавязковым будзе абмежаваньне квотаў, пералічаных на згаданы рахунак, — гадавы пералік ня можа перавысіць 150% сярэдняй зарплаты брута, якая цяпер складае пад 800 даляраў.

«Заўсёды падчас выхаду на пэнсію ўзровень даходаў выразна паніжаецца. Гэта нармальная зьява ва ўсіх краінах сьвету. Справа заключаецца ў тым, каб згаданае паніжэньне не было надта раптоўным», — кажа намесьнік міністра эканомікі, працы і сацыяльнай палітыкі Кшыштаф Патэр.

Індывідуальны пэнсійны рахунак можна будзе заснаваць у інвэстыцыйных фондах, маклерскіх дамох і страхавых кампаніях. Адна асоба зможа заснаваць толькі адзін пэнсійны рахунак.

Паводле словаў намесьніка міністра Патэра, ашчаджаньне на будучую пэнсію выключна ў дзейнай сыстэме страхаваньня будзе азначаць зьніжэньне прыбыткаў. Пэнсія сярэднестатыстычнага паляка будзе складаць 50—60% сярэдняй месячнай зарплаты, калі ён не скарыстаецца індывідуальным рахункам.

У пэнсійнай галіне Польшча не абавязаная капіяваць эўрастандарты. Кожная дзяржава ЭЗ мае сваю сыстэму. Краіна, у якой працоўны мігрант вырашыць жыць, калі састарэе, абавязаная прызнаць яго пэнсію зь іншай краіны.

Дзеля эфэктыўнасьці пэнсійных сыстэмаў амаль усе эўрапейскія краіны павялічваюць пэнсійны век. У Даніі цяпер гэта 67 гадоў і для жанчынаў, і для мужчынаў. Найраней на пэнсію могуць выйсьці вугорцы: жанчыны — у 55, мужчыны — у 60. У Францыі і мужчыны, і жанчыны на пэнсію могуць выйсьці ў 60 гадоў. У Ірляндыі, Гішпаніі, Фінляндыі, Швэцыі, Галяндыі, Канадзе гэты ўзрост для жанчынаў і мужчынаў складае 65 гадоў.

Віцэ-прэм’ер Польшчы Ежы Хаўснэр таксама прапанаваў падоўжыць пэнсійны ўзрост для жанчын да 65 гадоў. Згаданы працэс павінен адбыцца паступова ў 2010—2020 г. На думку Хаўснэра, гэта дапаможа павялічыць сярэднюю пэнсію. Калі пэнсійнага ўзросту не чапаць, трэба або падвышаць адлічэньні ў пэнсійныя фонды, або зьмяншаць пэнсіі.

**Анна Дамбкоўска**

Беларуская служба радыё «Палёнія»

## 5 сьнежня пятніца

### ● БТ

7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
8.45, 14.45, 16.45, 18.45, 0.20 «Мая краіна».
9.15 Сэрыял «Альжыр лятункаў нашых».
10.05, 17.05 Сэрыял «Уваскрашаючы мёртвых».
11.10 Сэрыял «Нож у аблоках». Заключная сэрыя.
12.15 Мэлядрама «Таежная аповесьць».
14.05 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
15.10 Сэрыял «Амазонка».
16.05 «5х5».
18.05 Хіт-парад 80-х. Канцэртная праграма «Зоркі, якія ня гаснуць...».
19.05 Баявік «Кулак ярасьці».
21.00 «Панарама». Інфармацыйны канал.
21.45 Спэцыяльны рэпартаж. «Наркатрафік».
22.00 Мэлядрама «Пад покрывам нябёсаў».
0.30 Маст. фільм «Паветраныя піраты».

### ● ЛАД

7.00, 14.00, 20.00 Навіны.
7.10 «Урокі цётухны Савы. Азбука-малышка». Мультфільм.
7.15 Дак. фільм «Гадамэс — жамчужына Сахары».
8.10, 22.05 Сэрыял «Пецярбурскія тайны».
9.00 «Сьвятло далёкай зоркі. Веніямін Блажэнны».
9.30 «Сьпявай, душа!». Фальклёрны ансамбль «Гавязьнянка».
10.00 «Паміж намі, жанчынамі».
10.20, 21.15 Сэрыял «Грэшная Анхеліка».
11.05 «Урокі цётухны Савы. Арытмэтыка-малышка». Мультфільм.
11.15 «Звычайны незвычайны дзень».
11.50, 18.50 Сэрыял «Міхайла Ламаносаў».
13.05 «Час кіно».
13.30 Відэафільм «Эўропа — агульная спадчына. Калоская царква».
13.35 «У палоне сваіх роляў».
14.10 «Масква — Менск».
14.25 Любімыя казкі. «Чыпаліна».
15.45 «Тараканішча», «Урокі цётухны Савы. Азбука-малышка». Мультфільмы.
16.10 «Час кіно».
16.35 Маст. фільм «Пушча».
20.15 «Калыханка».
20.30 «Справы сямейныя».
23.00 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Гомель» — «Дынама» (Менск). 2-і і 3-і пэрыяды.

### ● СТВ

6.25, 15.25 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры ў космасе». Тэлесэрыял.
6.50 «Трансформэры». Мультсэрыял.
7.20, 22.30 «Хіт-момант».
7.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.45 «24 гадзіны».
7.50, 20.00 «СТВ-спорт».
8.05, 18.05 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
8.15 «Менск і менчукі».
8.30, 23.05 «Тэхналёгія».
8.40 Кіно: баявік «Замоўлены забойца».
10.10, 20.40 «Аўтапанарама».
10.30 «Тэатральныя гісторыі».
10.45 «Канал гісторыі»: «Старадаўнія прароцтвы». Дак. фільм.
11.30 «Дзікая плянэта»: «Вялікі парад жывёл». Дак. фільм.
12.00 «Сапраўднае каханьне».
12.55 «Сусьветныя розыгрышы».
13.50, 18.30 «NEXT-3». Тэлесэрыял.
14.45 «Бацюшка». Дак. фільм цыклу «Агульны дом».
15.00 «Дыназаўры». Мультсэрыял.
15.50 «Маска». Мультсэрыял.
16.15 «Тэма дня».
16.50 Кіно: маст. фільм «Два капітаны», 5-я сэрыя.
18.20 «Сьвецкая хроніка».
20.15 «Менск і менчукі».
20.25 «Добры вечар, маленькі...».
20.55 Кіно: камэдыя «Доктар Дулітл».
23.15 «Рэактыўны бокс».
23.35 «Навіны СНД».
23.50 Кіно: трылер «Халоднае сэрца».

### ● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.55 Нашы навіны.
8.05 «Добрай раніцы».
9.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 Маст. фільм «Распаленая субота». 2-я сэрыя.
10.45 Сэрыял «Твінісы».
14.40 «Горад жанчын».
15.20, 21.05 «Фабрыка зорак-3».
15.40 «Угадай мэлёдыю».
16.05 Сэрыял «Бераг мары».
16.50 «Апошні герой».
18.15 «Жарт за жартам».
18.50 «Поле цудаў».
20.00 Час.
22.35 Што? Дзе? Калі?
0.15 Трылер «Мёртвая зона».

### ● РТР

7.45 Сэрыял «Лініі лёсу».
8.45 Аншляг.
9.45 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
18.00 Выбары-2003.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Народны артыст.
20.50 «Вясёлыя канікулы «Аншлягу».
23.45 Вынікі галасаваньня «Народны артыст — Ваш выбар!»

### ● НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 Фактар страху.
10.20 Ток-шоў «Краіна парад».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Яна напісала забойства».
17.30 «Нацыянальная бясьпека: мёртвая вада».
18.00 «Сёньня» зь Міхаілам Асокіным.
18.35 «Свабода слова».
20.45 Баявік «Чорны дождж».
23.25 Супэрбокс: Джоэль Касамаёр супраць Найта Кемпбэла.

### ● Эўраспорт

9.30 Бадмінтон. Саабрук. Паўтор.
10.30 Алімпійскі часопіс. Паўтор.
11.00 Біятлён. Кантыялянт. Кубак сьвету. Спрынт. Мужчыны. Паўтор.
12.00 Біятлён. Кантыялянт. Кубак сьвету. Спрынт. Жанчыны. Паўтор.
13.00 Біятлён. Кубак сьвету. Эстафэта. 4х6 км. Жанчыны. Жывая трансьляцыя.
14.45, 17.30 Бадмінтон. Саабрук. Жывая трансьляцыя.
16.00 Керлінг. Італія.
18.45 Керлінг. Італія. Жывая трансьляцыя.
20.00 Горныя лыжы. Чэмпіянат сьвету сярод жанчын. Жывая трансьляцыя.
21.15 Фітнэс. Чэмпіянат сьвету. Варшава.
22.15 Самы дужы чалавек. Фінляндыя.
23.15 Аэробіка. Чэмпіянат Эўропы. Вугоршчына.
0.30 «Сэры». Аўтаспартовы часопіс.
1.15 Экстрэмальныя віды спорту. Паўтор.

## 6 сьнежня субота

### ● БТ

7.35 «Існасьць». Духоўная праграма.
8.00 «Новая калекцыя» Алега Лукашэвіча.
8.25 «36,6».
9.00, 12.00, 15.00, 21.00 Навіны.
9.05 Сэрыял «ТАСС упаўнаважаны заявіць...».
10.00 «Усё нармальна, мама!».
10.45 «Шпілька».
11.10 «Адкрыты архіў». «Тайна зялёнага золата».
11.35 «Жыцьцё — гульня». Камэдыі.
13.05 «Кропка».
13.45 «Маскі-шоў».
14.10 Сэрыял «Адрэналінавы выбух».
15.05 Камэдыя «Ах, вадэвіль, вадэвіль...».
16.10 Маст. фільм «І на камянях растуць дрэвы».
18.35 Тэлегульня «Аднаклясьнікі».
19.15 Камэдыя «Пазнаёмцеся з Уолі Спарксам».
21.20 «Вакол плянэты».
21.50 Трылер «Жыцьцё Дэвіда Гэйла».
0.00 Маст. фільм «Прыватная калекцыя».

### ● ЛАД

8.05 Мультыклюб.
9.00 «Правінцыяльныя гісторыі».
9.25 Наша спадчына. «Мястэчка Воўчын. Радзіма апошняга польскага караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага». Частка 3-я.
9.40 Дак. сэрыял «Ахоўнікі прыроды».
10.05 Камэдыя «Мілы хлус» (Індыя). 1-я сэрыя.
11.25 «Здароўе».
11.55 «Трышчан ды Іжота — забытая легенда». Мультсэрыял.
12.20 Казка «Чыпаліна» («Масфільм»).
13.40 «Ёсьць толькі міг...». Эдуард Ліпень.
14.10 «Настаўніцкая».
14.20 «Эх, анэкдот, анэкдот».
14.35 «Сьпявай, душа!». «На браслаўскім падворку».
15.00 Дак. сэрыял «Мастакі».
15.30 Дакумэнтальна-пазнавальны сэрыял «Вялікія прыгоды кінапрэсы». 4-я сэрыя, заключная.
16.20 Росчырк часу.
16.35 «Плошча мастацтваў». Фэстываль аўтарскай песьні «Віцебскі лістапад».
17.00 Прыгодніцкі сэрыял «Мушкетэры праз 20 год». 4-я сэрыя, заключная.
18.40 Сэрыял «Белае адзеньне» («Беларусьфільм»).
20.00 «Рэгіён».
20.30 Камэдыя «Першая пальчатка» («Масфільм»).
21.55 Містычны трылер «Апантанасьць».

### ● СТВ

6.20 «Дзікая плянэта»: «Балотны аліґатар». Дак. фільм.
7.15 «Хіткліф». Мультсэрыял.
7.40 «Супэрпарася». Мультсэрыял.
8.05 «Бітлборгі». Тэлесэрыял.
8.30 Дак. фільмы «Палянэз для касінераў», «Філямат Тамаш Зан».
9.05, 23.00 «Хіт-момант».
9.20 «Вялікае сьнеданьне».
9.50 «Анфас».
10.05, 20.00 «СТВ-спорт».
10.15 «Рэактыўны бокс».
10.40 «Партрэт у інтэр'еры».
10.55 «Запрашаем паскардзіцца...».
11.05 «Разам».
11.35 «Тэлеафіша».
11.45, 0.55 «Бафі». Тэлесэрыял.
12.30 «Менск — горад герой-патрыёт». Дак. фільм.
12.50 Кіно: маст. фільм «Экіпаж машыны баявой».
14.25 «Усё для цябе».
15.05 «Прывіды ў кадры». Фільм.
15.50 Кіно: камэдыя «Місыс Даўтфайр».
18.00 «Загадкі НЛА». Дак. фільм.
19.00 «Усе мы Суворава дзеці». Дак. фільм.
19.30 «24 гадзіны».
20.15 Кіно: баявік «Уласнасьць д'ябла».
22.10 «Вялікая музыка».
22.45 «Навіны СНД».
23.10 «Арт-хаўз»: маст. фільм «Песьні з другога паверху».

### ● АНТ

8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Грай, гармонік любы!
8.55 Слова пастыра.
9.10 Здароўе.
10.00, 12.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Смак».
10.30 «Гісторыі каханьня».
11.05 Ералаш.
11.15 Дог-шоў.
12.10 «Каралеўская бітва. Акула атакуе».
13.15 Разумніцы й разумнікі.
13.55 Дыснэй-клюб. «Геркулес».
14.20 Жывая прырода. «Сьляды нябачаных зьвяроў».
14.55 Маст. фільм «Мушкетэр».
16.55 Шоў «Трукачы».
17.45 «Трылёгія». Канцэрт Алсу.
18.55 «Хто хоча стаць мільянэрам?».
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
20.55 Апошні герой.
22.10 «Залаты грамафон».
23.20 Трылер «Гарадзкія легенды».

### ● РТР

9.20 «Не сумуй!».
10.20 Сам сабе рэжысэр.
11.15 «Круты маршрут — Поўдзень».
12.15 Клюб сэнатараў.
13.00, 19.00 Весткі.
13.20 Маст. фільм «Закаханы з уласнага жаданьня».
15.00 Камэдыя «Мазгі».
17.00 Сьвяточны атракцыён у Маскоўскім цырку.
19.25 Люстра.
19.50 «Сумленны дэтэктыў».
20.20 Аншляг.
21.20 Маст. фільм «Невідзімка».

### ● НТВ

9.00 Кулінарны паядынак.
9.55 Кватэрнае пытаньне.
10.55 Спорт «Лято 6 з 49».
11.00, 15.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
11.15 Надвор'е на заўтра.
11.20 «Дзікі сьвет: лісіны сьвет».
12.05 Камэдыя «Хто такі Гары Крамб?».
14.00 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Жаночы погляд».
16.00 Сэрыял «Калекцыя Даніэлы Стыл: Успаміны». 1-я сэрыя.
17.05 Зусім сакрэтна: войска алігарха.
18.00 «Асабісты ўнёсак».
19.00 Маст. фільм «Клясык».
21.15 Маст. фільм «Шалёныя сабакі».
23.25 Часопіс Лігі чэмпіёнаў.

### ● Эўраспорт

9.30 Футбол. УЭФА. Паўтор.
10.30 Лыжныя гонкі. Жывая трансьляцыя.
11.30 Біятлён. Кубак сьвету. Эстафэта. 4х7,5 км. Мужчыны. Жывая трансьляцыя.
13.15 Лыжная гонка. 30 км. Мужчыны. Жывая трансьляцыя.
14.30 Керлінг. Італія. Жанчыны. Швэцыя — Нямеччына. Жывая трансьляцыя.
16.00 Лыжнае дваябор'е. Кубак сьвету. Тронхайм.
17.00 Скачкі на лыжах з трампліну. К-120. Жывая трансьляцыя.
19.00 Алімпійскі часопіс. Паўтор.
19.30 Горныя лыжы. Паўтор.
20.00 Горныя лыжы. Кубак сьвету. Хуткасны спуск. Жанчыны. Мужчыны.
21.30 Горныя лыжы. Кубак сьвету. Хуткасны спуск. Жанчыны.
22.45 Керлінг. Чэмпіянат Эўропы. Італія. Мужчыны. Шатляндыя — Нямеччына. Жывая трансьляцыя.
0.45 Экстрэмальныя віды спорту.
1.45 Бокс. Паўтор.

## 7 сьнежня нядзеля

### ● БТ

7.35 «Сузор'е надзей». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
8.00 «Дастань зорку».
8.30 «Арсэнал».
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.05 Сэрыял «ТАСС упаўнаважаны заявіць».
9.55 «Кліп-абойма». Вынікі хіт-параду.
10.50 Падарожжа дылетанта. «Кухцічы. Марыя Магдалена Радзівіл».
11.15 Драма «Салдат аранжавай краіны».
13.30 «Чэмпіёны. Руслан Салей».
13.40 Тэлеклюб «Ваша лята».
14.20 Сэрыял «Адрэналівы выбух».
14.45 «Мая краіна».
15.05 КВН. Фінал Вышэйшай лігі беларускага КВК.
16.45 «Маскі-шоў».
17.05 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
17.45 Маст. фільм «Пацалунак».
19.00 Камэдыя «Давайце патанцуем».
21.00 «У цэнтры ўвагі».
22.00 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
22.30 Футбол. Чэмпіянат Італіі. Матч туру.

### ● ЛАД

8.05 Мультыклюб.
9.00 «Не зявай!».
9.40 «Мір вашаму дому».
9.50 Камэдыя «Мілы хлус». 2-я сэрыя.
11.10 «Сад мары».
11.40 «Кветачка сямі колераў», «Урокі цётухны Савы. Азбука-малышка». Мультфільмы.
12.05 Мультсэрыял «Трышчан ды Іжота — забытая легенда».
12.30 Любімыя казкі. «Каменная кветка».
13.55 Сэрыял «Вершнікі з паданьняў».
14.20 «Бюро знаходак».
14.45 «Сьвятло далёкай зоркі. Анатоль Ляляўскі».
15.15 Дак. сэрыял «Мастакі».
15.40 Сэрыял «Адвакацкая кантора».
16.30 «Імгненьне вечнасьці».
16.50 Плошча мастацтваў.
17.15 Маст. фільм «Блакітны карбункул».
18.30 Сэрыял «Белыя строі».
20.00 Навіны.
20.10 Тэлебаромэтар.
20.25 Камэдыя «Сьветлы шлях».
22.05 Драма «Асаблівы дзень».

### ● СТВ

6.20 «Дзікая плянэта»: «Пыл Кіліманджара». Дак. фільм.
7.20 «Хіткліф». Мультсэрыял.
7.45 «Супэрпарася». Мультсэрыял.
8.10 «Бітлборгі». Тэлесэрыял.
8.30 «Кіно — дзецям»: «Зьвярыныя войны». Мультфільм.
9.40 «Хіт-момант».
9.50 «СТВ-спорт».
10.05, 21.00 «Аўтапанарама».
10.25 «Вялікае сьнеданьне».
10.50 «Менск і менчукі».
11.00 «Сьвецкая хроніка».
11.10 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
11.25 «Пульс плянэты».
11.40 «Лёсу свайго гаспадыня».
12.00, 23.50 «Бафі». Тэлесэрыял.
12.45 «Добры дзень, доктар!».
13.05 Кіно: маст. фільм «Кур'ер».
15.05 Праект «Адлюстраваньне»: «Банды ў пагонах». Дак. фільм.
16.10 «Найлепшыя шоў сьвету» з Урмасам Отам.
17.15 «Шоў магаў у Лас-Вэгасе».
18.00 «Хіт-момант».
18.15 «168 гадзін».
19.05 «Навіны сусьветнай шоў-індустрыі.
19.50 «Асабісты інтэрас».
20.30 «Пакуль гарыць сьвечка...».
21.20 Турпаход.
21.30 «24 гадзіны».
21.50 Кіно: трылер «Кроў і віно».
23.35 «Навіны СНД».

### ● АНТ

8.00 Армейскі магазын.
8.30 Дыснэй-клюб. «Легенда пра Тарзана».
9.00 «У сьвеце жывёл».
10.00, 12.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Падарожныя нататкі».
10.35 Пакуль усе дома.
11.15 «Жарт за жартам».
12.10 Сьвяточны канцэрт.
13.40 Ток-шоў «Выбар».
14.25 Маст. фільм «Апэрацыя «Ы» і іншыя прыгоды Шурыка».
16.25 «Крывое люстра».
18.25 Маст. фільм «Джэк».
20.30 Контуры.
21.20 Маст. фільм «Пік Дантэ».
23.20 Аўраам Русо ў канцэрце «1001 ноч».

### ● РТР

9.05, 16.10 У гарадку.
9.40 Сямён Альтаў. «Пра ўсё!»
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Весткі.
10.10 «Сто да аднаго».
11.00 Вакол сьвету.
12.00 Дыялёгі пра жывёл.
12.50 У гарадку.
13.10 Маст. фільм «Справа была ў Пянькове».
15.10 Прэм'ера. «Мікіта Міхалкоў. Расейскі выбар».
16.20 Пакой сьмеху.
17.25 Гала-канцэрт «Тэлеканал «Расея» зьбірае сяброў».
20.00 Весткі. Выбары-2003.
21.30 Камэдыя «Каўкаская палоньніца, ці Новыя прыгоды Шурыка».

### ● НТВ

9.10 «Расьліннае жыцьцё».
9.45 Вайсковая справа.
10.20 «Апэльсынавы сок».
10.55 Гуляем у «Кено».
11.00, 15.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
11.15 Надоечы на заўтра.
11.20 Усё адразу!
12.10 Маст. фільм «Родная кроў».
13.55 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Іх норавы».
16.10 Сэрыял «Калекцыя Даніэлы Стыл: Успаміны». 2-я сэрыя.
17.15 Злачынства ў стылі «мадэрн»: дэпутат-наводчык.
17.55 Камэдыя «Спатканьне ўсьляпую».
20.00 «Надоечы» зь Леанідам Парфёнавым.
21.30 Свабода слова: Выбары-2003. Падвядзеньне вынікаў.

### ● Эўраспорт

9.30, 0.15 Скачкі на лыжах з трампліну. К-120. Паўтор.
10.30 Біятлён. Кантыялянт. Жывая трансьляцыя.
12.15 Лыжная гонка. Групавы забег. Жывая трансьляцыя.
14.00 Лыжнае дваябор'е. Тронхайм. Жывая трансьляцыя.
14.30 Лыжнае дваябор'е. Тронхайм. Жывая трансьляцыя + Паўтор.
15.00 Скачкі на лыжах з трампліну. К-120. Жывая трансьляцыя.
16.45 Керлінг. Чэмпіянат Эўропы. Жанчыны.
17.45 Бадмінтон. Саабрук. Жывая трансьляцыя.
19.00 Горныя лыжы. Чэмпіянат сьвету. Жанчыны. Супэргігант. Жывая трансьляцыя.
20.15 Горныя лыжы. Чэмпіянат сьвету. Мужчыны. Супэргігант. Жывая трансьляцыя.
21.30 Керлінг. Чэмпіянат Эўропы. Жанчыны. Жывая трансьляцыя.

Зьміцер Вайцюшкевіч

Паравіны году




...вытрыманая да драбніц стылёвасьць, вытанчаная гучаньне, рытмы клясычных танцаў...

*Уражаны Слухач*

Пытайцеся ў дыскарнях Вашага гораду

# Недзе ў Эўропе

## Новая «лінія Керзана» можа ператварыць Беларусь, Украіну, Малдову ў васалаў Маскоўскага княства

Канфэрэнцыя ў Вільні з удзелам прадстаўнікоў беларускіх NGO і заходніх спонсараў. Факт сам па сабе банальны, як і тэма канфэрэнцыі — пабудова грамадзянскай супольнасьці ў сучаснай Беларусі. Спонсары, у дадзеным выпадку літоўцы й швэды, паводзяць сябе гранічна гасьцінна, тактоўна й сардэчна. Усе ўдзельнікі павінны адчуць сябе на працягу некалькіх дзён як бы адной сям'ёй, каб лягчэй было вырашаць супольныя задачы ў новых умовах. Цяжкасьцяў хапае, і ў найбліжэйшай пэрспэктыве іх павінна стаць яшчэ больш. Уваходжаньне Літвы ды іншых суседзяў Беларусі ў Эўразьвяз прывядзе да павелічэньня выдаткаў на сумесныя праекты. А значыць, і да ліквідацыі некаторых зь іх.



Уладзімер Букоўскі: «Эўразьвяз развaліцца таксама, як разваліўся Савецкі Саюз».

Канфэрэнцыя праходзіць у адным з найлепшых гатэляў гораду. Выкшталцоны пэрсанал валодае трыма мовамі, у тым ліку ангельскай, якая ёсьць афіцыйнай мовай канфэрэнцыі. На самым пачатку адбываецца непрыкметны інцыдэнт. Удзельнікі запаўняюць анкеты ў рэцэпцыі, і раптам голасна чуецца адборны расейскі мат. Выяўляецца, што побач у шыкоўных крэслах атабарыліся новыя рускія — з клясычнымі голенымі патыліцамі, у скуранках. Яны п'юць гарэлку й гучна высьвятляюць нейкія свае «канкрэтныя» справы.

Эпізод ніякім чынам не адбіўся на далейшай хадзе канфэрэнцыі, дый увогуле ня мае да яе дачыненьня, але ён паказвае дыстанцыю паміж «высокай» палітыкай і «грубай» рэчаіснасьцю сёньняшняга дня. Эпізод гэты прымушае, напрыклад, згадаць «паксасгейт», які ўзьнік у выніку падазраньняў, што літоўскі прэзыдэнт меў дачыненьні з расейскай мафіяй. Ды не пра тое гаворка...

У другім нумары расейска-габрэйскага штоквартальніка «Новый век» за 2003 г. надрукаваны тэкст выступу Ўладзімера Букоўскага «Эўрапейская садружнасьць — новае выданьне Савецкага Саюзу». Выступ вядомага ў мінулым савецкага дысыдэнта, які жыве ў Кембрыджы, адбыўся яшчэ на пачатку мінулага году ў брытанскім парлямэнце, куды Букоўскага запрасіла група дэпутатаў. Гэты выступ, наколькі мне вядома, нідзе дагэтуль не публікаваўся і наўрад ці будзе публікавацца — прынамсі, на Захадзе. Некаторыя думкі й аргумэнты Букоўскага могуць падацца рэзкімі, нават шакавацыь. Аднак чалавек, які быў асуджаны за выкрываньне мэтадаў савецкай карнай псыхіятрыі ў барацьбе з іншадумствам, а затым абмяняны на лідэра чылійскіх камуністаў Карваляна, заслугоўвае быць выслуханым і пачутым.

Галоўная думка выступу Букоўскага вынесеная ў назву. Гэта ня толькі эмацыйная ацэнка таго, што адбываецца цяпер з Эўразьвязам. Аратар прыводзіць даволі стройную сыстэму аргумэнтаў на карысьць параўнаньня ЭЗ з СССР. Пачынае з парадаксальнага тэзысу: Захад халодную вайну прайграў. Не ў вайсковастратэгічным пляне, але ў ідэалягічным. Гэта была, кажа Букоўскі, «ідэалягічная вайна, сутыкненьне лібэральнай дэмакратыі з таталітарным камунізмам. І вось гэтая вайна так і не была завершаная...»

Ня толькі ў Расеі, ва Ўкраіне, Беларусі, Баўгарыі ці Румыніі, але нават у Польшчы ці ў сталіцы Нямеччыны Бэрліне нядаўнія выбары прынесьлі ашаламляльную перамогу камуністам. А ў Расеі, лічыць Букоўскі, «прэзыдэнцкія выбары паказалі, які кшталт дэмакратыі гэтая краіна выбрала для сябе: выбарцы былі пастаўленыя перад зусім дзіўным выбарам паміж лідэрам камуністаў і палкоўнікам КГБ. І КГБ перамог...» (Гэта было сказана амаль за два гады да арышту Хадаркоўскага і цяперашніх выбараў у Думу.)

На думку аратара, цяперашні час наймеией падыходзіць да пацяпленьня адносінаў паміж Захадам і Расеяй. Тым ня менш, зьвяртаецца Букоўскі да брытанскіх парлямэнтараў, «ваш прэм'ер Тоні Блэр накіраваўся ў Расею, каб вітаць новых хаўрусьнікаў на борце грандыёзнай антытэрарыстычнай кааліцыі. Ён сказаў, які ён задаволены тым, што Расея выступае поплеч з Захадам у гэтай важнай барацьбе, бо «ў Расеі ёсьць такі вялікі досьвед у барацьбе з тэрарызмам». Ніколі ня думаў, што дажыву да такога часу, калі мне давядзецца пачуць з вуснаў заходняга палітыка такую дзіўную й зьняважлівую фразу. Яна гучыць гэтаксама кашчунна й недарэчна, як гучала б фраза аб тым, што ў Нямеччыны ёсьць неймаверна багаты досьвед у абыходжаньні з габрэямі. Таму што ў яе папярэдняй інкарнацыі Расея практычна вынайшла сучасны палітычны тэрарызм і распаўсюдзіла яго па ўсім сьвеце».

Паводле Букоўскага, не пасьпеўшы пахаваць аднаго монстра — СССР, Захад пачаў ствараць нешта падобнае ў Эўропе: «Што такое СССР? СССР ёсьць Саюзам Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Чым ёсьць Эўразьвяз? Гэта ёсьць саюз сацыялістычных рэспублік. Зусім нядаўна, перад выбарамі ў Італіі і Аўстрыі, гэта быў практычна саюз сацыялістычных рэспублік».

«Хто кіраваў Савецкім Саюзам?» — задаецца далей пытаньнем аратар. «Ён кіраваўся пятнаццацьцю людзьмі, якіх ніхто не выбіраў і якія не былі справаздачныя ні перад кім. Якім чынам кіруецца Эўразьвяз? Два тузіны нікім не абіраных людзей прызначаюць адно аднаго, яны непадсправаздачныя нікому, і мы ня можам адправіць іх у адстаўку».

У канстытуцыі СССР было запісана права рэспублік на выхад зь яго, але насамрэч дарогі назад не было. Букоўскі быў уражаны, што амаль такая ж сытуацыя існуе ў ЭЗ: «Вы можаце ўступіць у яго, але выйсьці вам ня ўдасца. Не прадугледжана такой працэдуры. Усё гэта вельмі падобна на тое, да чаго я так прызвычаіўся ў Савецкім Саюзе.

Савецкі Саюз быў агрэсіўнай краінай. Ён ня мог існаваць без таго, каб не распаўсюджваць сваёй мадэлі сацыялізму. У момант, як ён перастаў рабіць гэта, ён пачаў распадацца. У мяне ёсьць моцнае падозраньне, што тое самае можна сказаць і пра Эўразьвяз. Эканамічна няма сэнсу прыцягваць у Зьвяз усё больш і больш краінаў Усходняй Эўропы зь іх недаразьвітай эканомікай, але ён ажыцьцяўляе час ам проста невыносны ціск на гэтыя краіны... Ствараецца ўражаньне, што гэта мае ідэалягічны характар».

Вынікі, паводле Букоўскага, будуць дыямэтральна процілеглымі абяцаньням «аўтараў» ЭЗ: «Нам сказалі, што гэта неабходна дзеля пераадоленьня нашае этнічнае адасобленасьці, нашае нацыянальнасьці, нашых забабонаў, нашых традыцыяў, і таму, пасьля таго як гэта адбудзецца, мы на вякі вякоў будзем жыць шчасьліва як шматнацыянальная супольнасьць.

Я магу сказаць вам загадзя, што адбудзецца нешта процілеглае. Пасьля сямідзесяці трох гадоў жыцьця ў Савецкім Саюзе, які павінен быў быць, у тэорыі, шчасьлівай сям'ёй народаў, у нас было столькі этнічных канфліктаў, колькі не магло зьявіцца ні ў воднай іншай краіне.

Нам кажуць сёньня, што мэта стварэньня ЭЗ — усеагульнае працьвітаньне. Наша эканоміка будзе здольнай канкураваць з эканомікай ЗША, стаяць на варце нашых інтарэсаў. Але адбудзецца нешта процілеглае. Зарэгуляваная, субсыдаваная, па-дурному арганізаваная, карумпаваная эканоміка ЭЗ будзе вельмі слабой, і людзі стануць яшчэ бяднейшымі й залежнейшымі ад Злучаных Штатаў».

На заканчэньне аратар робіць галоўны прагноз: «Гэты Саюз разваліцца таксама, як разваліўся Савецкі Саюз».

Некаторыя думкі, выказаныя вышэй, прыходзілі ў галаву і беларускім журналістам ды палітыкам. Гаворка тут не аб тым, што Эўразьвяз падобны да вінаграду з байкі Эзопа, які «ліcіца»-Беларусь са злосьці называе зялёным. Хоць элемэнт «крыўды», безумоўна, прысутнічае.

Папросту крытыкаваць Захад, АБСЭ, іншыя эўраструктуры апошнія гады ў недзяржаўных журналістаў неяк рука не падымалася. Пакрытыкуеш, а тваю крытыку раптам працытуе «Беларусь сегодня» ці БТ — потым век не адмыешся.

За 12 гадоў скандаваньня на мітынгах лёзунгу «Беларусь у Эўропу!» апазыцыя пачала забывацца на той факт, што Беларусь — у Эўропе. А Эўропа на гэта заплюшчвае вочы. Сэнс пашырэньня Эўразьвязу ня столькі ў тым, каб прасунуцца на Ўсход (пра што піша Букоўскі), колькі ў тым, каб не дазволіць Расеі (учорашняму СССР) адрадзіць былую моц. Але ж новая «лінія Керзана» адводзіць Беларусі (Украіне, Малдове, Грузіі) ролю васалаў Маскоўскага княства. І тое, што гэтая лінія праходзіць праз жывое, праз Віленскі край, назаўсёды, з каранямі адрываючы колішнюю беларускую сталіцу ад цела сёньняшняй Беларусі, праз Беласточчыну й Латгалію, — гэта нікога ў чыноўным Брусэлі не хвалюе, бо мэтай жа абвешчанае шчасьлівае жыцьцё без нацыянальных і рэлігійных забабонаў.

Нешта падобнае цывілізаваныя краіны Заходняй Эўропы ўжо рабілі зь «менш разьвітымі» народамі. Напрыклад, з Чэхіяй, якую Англія й Францыя аддалі ў Мюнхене на разьдзіраньне Гітлеру. А потым тыя ж Англія з Францыяй, заплаціўшы тысячамі жыцьцяў за свае памылкі, літасьціва «падаравалі» Чэхіі нямецкія Судэты. Пра гэта варта памятаць прыхільнікам «эўрапейскага шляху». Гаворка не аб тым, каб ганіць дасягненьні эўрапейскай цывілізацыі, дэмакратыю ды іншыя заходнія каштоўнасьці. Гаворка аб тым, што палітыка Захаду сёньня часта выглядае цынічнай і зьняважлівай у дачыненьні да Беларусі, яна проста штурхае яе цяперашняе кіраўніцтва ў абдымкі Масквы.

Заходнія палітыкі могуць рэзонна запярэчыць: афіцыйны Менск сам загнаў сябе ў ізаляцыю, ня хоча ніякай дэмакратыі, ня хоча ісьці на поўнамаштабныя кантакты з Захадам. Але праўда і тое, што ў Эўропы няма сёньня супольнай прадуманай палітыкі ў адносінах да Беларусі. Сьведчаньнем таму разыходжаньні, якія існуюць паміж АБСЭ, Радай Эўропы, Эўразьвязам, а часам і ўнутры (!) саміх гэтых арганізацыяў. ЭЗ можа дазволіць сабе раскошу «не заўважаць» Беларусі, як бы гэта быў нейкі Барбадос. Але ж ці могуць найбліжэйшыя суседзі Беларусі — Літва й Польшча — дазволіць сабе ігнараваць існаваньне дзесяцімільённага народу на ўсходніх межах? Эўропа безь Беларусі і Ўкраіны — гэта не зусім Эўропа. Таксама як і Беларусь, вырваная з кантэксту Эўропы, застанецца толькі плямай на эўразійскіх прасторах. Пытаньне толькі ў тым, ці не спасьцігне некалі падобны лёс і іншыя эўрапейскія краіны?

**Віталь Тарас**

# Лангбард у Бэрэнса ня краў

**Заўсёды зь вялікай цікавасьцю я чытаю ў вашай газэце артыкулы на архітэктурныя тэмы.** Мяне непрыемна зьдзівіў «Час паразытаў» у №42. З гэтага артыкулу вынікае, што выдатны дойлід І.Лангбард быў «паразытам», «амаль дакладна скапіяваўшы фасад нямецкай амбасады ў Пецярбургу». Гэта не адпавядае рэчаіснасьці.

Адзінае супольнае ў фасадах гэтых будынкаў — выкарыстаньне для плястычнага афармленьня трохчацьвяртных калён. Але кампазыцыя і прапарцыйныя суадносіны элемэнтаў фасадаў, іх дэталёўка — зусім розныя.

Такія калёны ў розных варыяцыях выкарыстоўвалі ў 1930-я многія архітэктары ленінградзкай школы. Гэты ж прыём мы бачым на даваенных фасадах гасьцініцы «Беларусь» і Інстытуту фізкультуры ў Менску. Можна было б толькі пасьмяяцца зь недарэчнага абвінавачаньня ў капіяваньні, але архітэктурнае рашэньне былога германскага пасольства ў Пецярбургу (архітэктар Пэтэр Бэрэнс) у нас малавядомае, а гэтая дарэмшчына можа пачаць гуляць па Беларусі.

Дзіўна, што, гаворачы аб бакавым фасадзе Інстытуту фізкультуры, аўтар знаходзіць іншы, цалкам добразычлівы тон. А між тым гэты фасад мае больш агульнага з бэрэнсаўскім (у завяршэньнях калён, форме і прапорцыях верхняй часткі фасаду).

Дом афіцэраў у Менску — адзін з найлепшых будынкаў Беларусі з арыгінальнымі архітэктурнымі рашэньнямі, складаналі і непаўторнай кампазыцыяй.

Сваім артыкулам аўтар падтрымлівае вельмі шкодны наіўны міт аб тым, што аўтары-архітэктары ў нас самастойна вырашаюць, што і дзе будаваць, якія архітэктурныя рашэньні ўжываць і што толькі яны павінны несьці за ўсё гэта поўную адказнасьць. На самай справе вырашаюць у гэтай сфэры ўладныя структуры і органы, што ўзгадняюць і зацьвярджаюць праекты.

Што датычыць прапановы аднесна мэмарыялу на плошчы Перамогі, то артыкулу не хапае ілюстрацыйнага суправаджэньня, а крытыка гэтай прапановы аргумэнтавана непераканаўча.

Стыль артыкулу нагадвае выступы В.Жырыноўскага і тым самым заахвочвае чытачоў да далейшай непавагі да творчасьці архітэктараў, якой і так у нас не хапае. На гэтым фоне нават трапная крытыка значна гублее сваю каштоўнасьць. Для карысьці трэба рупліва вучыць чытачоў шанаваць сапраўднае майстэрства, сапраўдныя каштоўнасьці, вучыць адрозьніваць іх ад тандэтаў і пошласьцяў.

**Ігар Байцоў, Менск**

## Вакцынаў няма

**У 1-й дзіцячай паліклініцы Менску на кожны ўчастак вызначана па 2 (дзьве) бясплатныя вакцыны ад грыпу.** А адных дзяцей з хранічнымі хваробамі і слабенькіх на кожным участку дзясяткі. Дактары ўсіх скіроўваюць у платныя паліклінікі. Дзе ж бясплатная мэдыцына, пра якую кіраўніцтва краіны столькі расьпінаецца?

**Анатоль Казакевіч, Менск**

## Зьзяньне і Леаніды

**Пачытаў у «НН» пра паўночнае зьзяньне ў Беларусі.** Два гады таму і я бачыў такое на ўласныя вочы. Я радыёаматар і час ад часу працую ў этэры. У час магнітных бураў якасьць сувязі на кароткіх хвалях псуецца. Затое на ультракароткіх, на якіх звычайна сувязь магчымая толькі ў межах простай бачнасьці, можна перамаўляцца з усёй Эўропай. Антэну звычайна трэба скіроўваць на поўнач. Сыгнал адлюстроўваецца ад «Аўроры» і распаўсюджваецца на вялікія адлегласьці. На жаль, адбіты сыгнал скажаецца і да тэлеграфнага тону застаецца толькі характэрнае шыпеньне. Хай сабе й непрыгожа, але прымаць магчыма.

Гады два таму я ў чарговы раз працаваў у «Аўроры», і антэну прыйшлося скіраваць на захад ад поўначы. Зьяўляліся ўсё новыя радыёстанцыі. Цікава, проста не адарваца! Раптам мой сабака запрасіўся на двор. Выходжу й бачу – неба з паўночна-заходняга боку цёмна-чырвонае.

Пасьля гаварыў з радыёаматарам з Пастаўшчыны. Аказалася, яго маці ў той вечар выйшла на двор і спалохалася. Штосьці зь небам зрабілася! Тую зьяву назіралі ў тую ж ноч радыёаматары нават на Гомельшчыне.

А 19 лістапада, у пік Леанідаў, ад 4-й да 7-й раніцы я правеў 70 сувязяў з 19 краінамі Эўропы, дзякуючы адлюстраваньню радыёхваляў ад мэтэораў.

Шмат цікавага на сьвеце, але шмат чаго мы ня ведаем, таму й ня бачым.

**Сяргей Паўзун, Менск**

# Помнік у Зельве

**У суботу ў Зэльве быў адчынены і асьвечаны помнік Ларысе Геніюш.**



Паставілі яго на храмавай зямлі, на цвінтары Траецкай царквы. Дазвол на гэта даў мітрапаліт Філарэт, які ў свой час бачыўся з Геніюш у Зэльве.

Паэтка Ларыса Геніюш правяла 8 гадоў у сталінскіх лягерах і да сьмерці не прыняла савецкага грамадзянства.

Стварыў помнік скульптар Міхась Інькоў, ініцыятарам справы быў мэцэнат Анатоль Белы. Урачыстую літургію служылі па-беларуску сакратар Гарадзенска-Ваўкавыскай япархіі айцец Анатоль, настаяцель Каложы і зэльвенскі бацюшка. На адкрыцьці выступілі Пятро Краўчанка, Аляксей Марачкін, Міхась Скобла. Прамоўцы падкрэслівалі пазытыўнасьць таго, што праваслаўная царква павярнулася тварам да нацыянальнай інтэлігенцыі. Гэтыя моманты надзвычай важныя для ўмацаваньня беларускага грамадзтва, падкрэсьліў А.Белы. Сьвецкія ўлады зноў адмаўчаліся.

**Арцём Лява, Зэльва—Менск.**
Фота аўтара.

## Тора з Сан-Францыска

**Баранавіцкай грамадзе жыдоў прывезьлі ў падарунак скрутак Торы.** Сёстры Аўрыл і Віўен з Сан-Францыска, продкі якіх выехалі з Заходняй Беларусі, набылі скрутак у рэстаўратара. Той сьцьвярджаў, што Тора вывезеная зь перадваеннай Польшчы. Напісаную на цялячай скуры кнігу можа, вядома, чытаць толькі адмыслоўца. Дазнаўшыся, што ў баранавіцкім клюбе «Шалом» габрэі вывучаюць сваю культуру і гісторыю, амэрыканкі падаравалі ім скрутак. Бо «калі Торы не чытаюць, яна не жыве». У Баранавічах няма сынагогі, але зараз сюды будзе прыяжджаць рабін — служыць і чытаць Тору.

**Руслан Равяка, Баранавічы**

## Цар аршанскага піва ня піў

**120-ю гадавіну з дня заснаваньня бровару адзначылі аршанскія піваvары.** Цудоўна, калі сучасьнікі цікавяцца і ганарацца мінулым свайго прадпрыемства. Але металягізацыя, характэрная для савецкай эпохі, перакінулася ўжо і на дарэвалюцыйны пэрыяд. Так, заснавальнік і гаспадар піваварні габрэй Вайнбэрг чамусьці стаў немцам. І хоць мясцовае піва славілася тады ня толькі ў Расеі, пра што сьведчаць залатыя мэдалі міжнародных выстаў, да стала Мікалая II яно ніколі не паступала — тым больш па пяць тысяч вёдраў у год (гэтае «адкрыцьцё» заводзкіх летапісцаў трапіла нават на старонку «Звязды»). На жаль, цяперашняе піва нельга параўнаць з тым, што было ня толькі сто, але і дваццаць гадоў таму. Завод ледзь-ледзь трымаецца. Толькі дзякуючы Першаму ўсебеларускаму экалягічнаму форуму, які адбыўся ў Воршы, удалося пафарбаваць будынкі ды заняміць на асобных дахі. Трэба, праўда, падзякаваць піваварам, што яны добра даглядаюць мэмарыяльны знак, прысьвечаны Уладзіміру Караткевічу, разьмешчаны на адміністрацыйным будынку заводу. На вуліцы, якая носіць яго імя (былым Вайнбэргавым завулку, потым вул.Ігнатоўскага, Варашылава, Касманаўтаў), захавалася і хата, у якой сям'я пісьменьніка пасялілася пасьля вайны.

## Нашчадкі Шарыкава за працай

**Рашэньне Аршанскага гарвыканкаму адносна адлову бадзяжных жывёлін, якія могуць быць носьбітамі шаленства, выконваецца мясцовай спэцаўтабазай.** Як сьцьвярджае яе дырэктар А.Дудараў, «усе злоўленыя жывёліны ўтрымліваюцца на базе на працягу сямі дзён, і толькі пасьля іх усыпляюць. За гэты час тых хатніх жывёлаў, якія выпадкова трапілі ў сеткі лаўцоў, гаспадары могуць забраць». Але на практыцы, аказваецца, зусім ня так. Нядаўні прыклад, калі п'яны работнік базы ў адным з двароў па вул.Міру лавіў сеткай катоў, пасьля адкручваў ім галовы і кідаў у мех, меў значны рэзананс. За гэтым нелюдзтвам назіралі і малыя, і старыя. Адна з жанчын, убачыўшы, як скуралуп перацісьнуў горла еўнаму кату, трапіла ў рэанімацыю з інфарктам. Нармальных умоваў для часовага ўтрыманьня жывёлін на спэцаўтабазе няма, як адсутнічаюць і лекі для ўсыпленьня «братоў нашых меншых». Таму і зьнішчаюць катоў на месцы, а сабакаў выпускаюць на гарадзкім сьметніку ля вёскі Велева. Дарэчы, выпадкі шаленства нават пасьля такіх жорсткіх і гвалтоўных мерапрыемстваў не зьмяншаюцца. Нядаўна сваю 77-гадовую гаспадыню зь вёскі Казечына пакусаў да сьмерці шалёны ратвэйлер. Не мінае бясьсьледна для псыхікі і тая навука бесчалавечнасьці, якую праходзяць на вуліцах і дварах месьцічы, асабліва дзеці.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

## Слуцкае сьвята

**29 лістапада ў Слуцку каля музэю адбыўся мітынг, прысьвечаны гадавіне Слуцкага паўстаньня.** Зь Менску прыехалі паўсотні чалавек, тутэйшых патрыётаў было паўтузіна, выпадковых мінакоў — зь дзясятак, некалькі чалавек у цывільным і міліцыянэраў. Асноўныя сілы міліцыі былі схаваныя на суседняй вуліцы ў фургоне. З 13.00 вызвалілі стаянку для машын ля ўнівэрмагу, каб не было ў гасьцей праблем з паркоўкай. Але час для мітынгу быў нязручны — 15.00. Каб дзеяньні разгорталіся на пару гадзін раней, захапілі б хвалю народу, што плыла з кірмашу дадому.

**Сяржук Кут, Слуцак**

## За падпіску адкажуць галавой

**У Бабруйскім райвыканкаме створаны штаб для правядзеньня падпіскі на 2004 г.** Старшыні сельсаветаў, кіраўнікі гаспадарак і ўстаноў нясуць асабістую адказнасьць за колькасьць ведамасных і індывідуальных падпісчыкаў на дзяржаўныя выданьні.

**Людміла Кокаш, Бабруйск**

## Зааралі некапаную бульбу

**Частку ўраджаю, які не пасьпелі сабраць, заааралі.** Жыхары вёскі Камсенічы прапанавалі кіраўніцтву выкапаць бульбу на калгасным полі ды ўзяць у якасьці платы частку ўраджаю, аднак нявыбраныя палі бульбы і грэчкі заааралі.

**Зінаіда Мілешчанка, Круглае**

## У Літву за 11 эўра

**З пачатку году па даведкі аб месцы жыхарства ў Гудагайскі сельсавет зьвярнулася больш за 200 жыхароў.** Гэты дакумэнт дае права атрымаць за 11 эўра льготную візу ў Літву. На Астравеччыне такую магчымасьць маюць жыхары яшчэ чатырох сельсаветаў, якія жывуць на памежжы.

**Мар'ян Вянгроўскі, Астравец**

## Музэй цьвярозасьці ў Мосары

**У вёсцы Мосар Глыбоцкага раёну адчыніўся музэй цьвярозасьці.** Яго экспазыцыя распавядае, як стагодзьдзямі алькагалізм і п'янства шкодзілі мясцовым жыхарам. Музэй працуе ў капліцы Маткі Боскай Вастрабрамскай, што побач з касьцёлам Сьвятой Ганны. Раней насупраць храму месьцілася карчма, а потым крама, дзе прадавалася сьпіртное. Намаганьнямі каталіцкай грамадзкасьці яе зачынілі, а потым зусім зьнеслі. Дзякуючы высілкам рыма-каталіцкай парафіі і сьвятара Ёзаса Булькі праблема п'янства ў Мосары паступова сыходзіць у нябыт.

**Юрась Сьцяпанаў, Віцебск**

## Юбілей Андрэя Зязюлі

**125-ю гадавіну з дня нараджэньня паэта-ксяндза Андрэя Зязюлі (Аляксандра Астрамовіча) адзначылі 1 сьнежня ў Сяньне.** На могілках паставілі помнік, адслужылі імшу, у краязнаўчым музэі адчынілі выставу. Зрабілі гэта супольна каталіцкая парафія, ТБМ і мясцовая ініцыятыва «Капліччка».

**БС, Сянно**

КРЫМІНАЛ

## Пара пэнсіянэраў падзарабляла шантажом

Выкрылі вымагальнікаў на мінулым тыдні. Дапамог выпадак з жанчынай, што прыехала зь Пінску ў сталіцу на курсы падвышэньня кваліфікацыі.

Навучаньне праходзіла на базе інтэрнату ў завулку Уральскім. Паміж заняткамі кабета адышлася на пошту — патэлефанаваць родным. Вярнуўшыся, заўважыла, што яе пашпарт і правы зьніклі. Пошукі на пошце выніку не далі. Жанчына пайшла на заняткі. Раптам яе паклікалі на вахту, да тэлефона. Сталы жаночы голас прапанаваў «абмен» — дакумэнты за сто даляраў. Часу на роздум — гадзіна.

Жанчына распавяла пра сваю бяду выкладчыку, палкоўніку міліцыі ў адстаўцы. Праз 15 хвілінаў да тэлефона быў падлучаны магнітафон, а ў двары чакаў УАЗік з апэратыўнікамі Партызанскага РУУС у цывільным. Сустрэчу ахвяра й вымагальніца ўмовілі каля былога кінатэатру «Зьмена» (цяпер бар «Эвэлін»). Пінчучка стаяла ля ўваходу ў сіняй барэтцы, як і прызначалася, апэратыўнікі лузгалі семкі на прыпынку аўтобуса №19, з «Гаспадарчых тавараў» праз дарогу пагладаў апэратар з камэрай, па скверы купкамі сядзелі студэнты-аднагрупнікі. Спачатку зьявіўся «выведнік» — стары чалавек. Пабачыўшы, што ўсё спакойна, зьнік за рогам будынку і вярнуўся зь немаладой кабетай. Яны падышлі да жанчынкі, ўзялі крапленую купюру... На гарачым іх і затрымалі. Каля пастарунку старая паспрабавала ўцячы: адпіхнула міліцыянта й пабегла. Апэратыўнікі яе нагналі. У дзеда падчас вобшуку намацалі пад вопраткай нож.

Сьледчыя сьцьвердзяць, што гэтая сталая пара (абаім за шэсьцьдзесят) займалася скраданьнем кашалькоў і дакумэнтаў ды вымагальніцтвам сыстэматычна. Сёлета ў пашпартны стол па новыя пашпарты зьвярталася з 10 чалавек, што «гублялі» дакумэнты на той пошце на Уральскай. У Партызанскім судзе абаім старым вынесьлі адміністрацыйнае пакараньне — па 200 тысячаў штрафу. Столькі ж, колькі яны прасілі за «згубленыя» дакумэнты.

**Вацлаў Заякоць**

# З Богам сам-насам

Калі 4 красавіка прыхільнікі Рэфармацыі зьбіраліся на першую «юбілейную» канфэрэнцыю, ніхто нават не ўяўляў, колькі розных мерапрыемстваў яшчэ будзе. Вернікі розных пратэстанцкіх плыняў пасвойму адзначалі 450-годзьдзе Рэфармацыі ў Беларусі: хто толькі супольнымі малітвамі, хто масавымі мерапрыемствамі на плошчы Бангалор, хто канцэртамі, хто тэалягічнымі дыспутамі. Сьвяткаваньне было падобным да самога рэфармацкага руху: яго ніхто не арганізоўваў спэцыяльна і цэнтралізавана не кантраляваў. Грамадзтва, навукоўцы, зборы розных канфэсій, нават музыканты — усе прыдумлялі і плянавалі сьвяткаваньне паводле ўласнай ініцыятывы, не заўсёды ведаючы, што, кім і дзе робіцца яшчэ. Такі падыход пазбавіў асобныя мерапрыемствы залішняй урачыстасьці і пампэзнасьці. Усё адбывалася сьціпла і камэрна, але гэта больш адпавядае самому духу Рэфармацыі. Адным з апошніх сьвяточных мерапрыемстваў з гэтай нагоды будзе музычны фэст з чатырох канцэртаў, што адбудуцца з 4 да 11 сьнежня ў залі касьцёлу Сьв.Роха.

## Год Лютэра й Скарыны

450 гадоў таму Рэфармацыя ахапіла ўсё Вялікае Княства Літоўскае. Кальвінскія зборы ўзьнікалі ў розных гарадох: Берасьці, Нясьвіжы, Вільні, Луцку, нават у Кіеве — гарадах, якія цяпер знаходзяцца ў розных дзяржавах. Але нідзе гэты юбілей ня стаў такой значнай падзеяй, як у Беларусі. У Літве гэты год на дзяржаўным узроўні шырока адзначаны як 750-я ўгодкі каранацыі Міндоўга. Напэўна мы, беларусы, у найбольшай ступені зьяўляемся спадкаемцамі Рэфармацыі і зьвязанага з Рэфармацыяй культурнага ўздыму Залатога веку ў нашай гісторыі.


АРЦЁМ ЛЯВА

**Пастар Андрэй Дылюк на набажэнстве Рэфарматарскай царквы ў Менску**

Пачатак Рэфармацыі ў сьвеце быў пакладзены Марцінам Лютэрам 31 кастрычніка 1517 г., калі ён прыбіў да брамы Вітэнбэрскай царквы свае знакамітыя 95 тэзаў супраць гандлю індульгенцыямі. Гэта быў сапраўды «вялікі кастрычнік», які зьмяніў сьвет. А тая хуткасьць, зь якой Рэфармацыя ахапіла Эўропу, зьдзіўляе і сёньня. Нават у наш час ідэі не распаўсюджваюцца з такой хуткасьцю, хоць сёньня існуюць тэлебачаньне і Інтэрнэт. А ў XVI ст. і газэтаў не было. Мы ж памятаем, што ў той самы 1517 год Скарына надрукаваў першую беларускую кнігу — гэта была частка Бібліі, другая, пасьля чэскай, друкаваная Біблія сярод славянскіх моваў. Рэфармацыя пачынаецца з уважлівага чытаньня Бібліі. І калі Лютэр заклікаў вернікаў вярнуцца да чытаньня Бібліі і толькі ў ёй шукаць падмурак сваёй веры ды адказы на праблемы жыцьця, Скарына даў беларусам такую магчымасьць.

> Невыпадкова стваральнікі аднаго з найлепшых прававых кодэксаў тагачаснай Эўропы канцлеры Валовіч і Сапега былі эвангелічна-рэфармаванымі хрысьціянамі.

1553 г. быў адзначаны шматлікімі падзеямі ў рэфармацкім руху Беларусі. Мікалай Радзівіл Чорны адкрыта абвясьціў пераход у кальвінізм. На падуладных яму землях пачалі адкрывацца кальвінскія зборы. Сымон Зак адчыніў першы збор у Берасьці. Там жа, у кальвінскай друкарні, быў выдадзены катэхізіс хрысьціянскай веры для масавага чытача і для простага народу. Менавіта з гэтага году і лічыцца пачатак Рэфармацыі ў Вялікім Княстве Літоўскім. Пачатак шырокага распаўсюджаньня, бо з ідэямі Рефармацыі беларусы былі знаёмыя і раней. На радзіму вярталіся выхаванцы заходніх унівэрсытэтаў і пачыналі рэфармаванае служэньне ў асобных прыходах буйных гарадоў. Лічыцца, што Скарына нездарма пачаў кнігадрукаваньне ў гусіцкай Празе (нядобразычліўцы і самога Скарыну называлі гусітам). Стасункі з чэскімі гусітамі, папярэднікамі эпохі Рэфармацыі, паспалітыя грамадзяне ВКЛ мелі з часоў Вітаўта, калі Ян Жыжка ўдзельнічаў у Грунвальдзкай бітве, а літоўскія харугвы дапамагалі табарытам змагацца ў Маравіі і Чэхіі. Напэўна, вярнуўшыся з гусіцкай вайны разам з чэскімі ўцекачамі, яны заснавалі горад Чашнікі, захоўваючы гусіцкае вучэньне.

## Пяць Sola

Што ж сьцьвярджалі рэфарматы, чым яны адрозьніваліся ад каталікоў і праваслаўных хрысьціян? У канфэрэнцыі 4—5 красавіка «Рэфармацыя і сучаснасьць: хрысьціянская супольнасьць, тэалёгія, культура» ўдзельнічалі тэолягі зь Беларусі, некалькіх краінаў Эўропы, нават адзін з Паўднёвай Афрыкі. Яны пагадзіліся ў тым, што сутнасьць усіх адгалінеьняў Рэфармацыі ўкладаецца ў пяць прынцыпаў, якія сфармуляваў яшчэ Лютэр:

Толькі Пісаньне — Sola Scriptura.
Толькі вера — Sola Fide.
Толькі ласка — Sola Gratia.
Толькі Хрыстос — Solus Christus.
Аднаму Богу слава — Soli Deo Gloria.

Перад Словам Божым ня мае вартасьці ні царкоўнае паданьне, ні традыцыя, ні рашэньні людзей, нават вельмі аўтарытэтных. Толькі Пісаньне ёсьць аўтарытэтам для хрысьціяніна. Ніякія ўчынкі, заслугі, зямная слава, паходжаньне, ахвяры ці багацьце ня могуць выратаваць чалавека, не даюць ніводнаму чалавеку перавагі перад іншымі. Выратаваньне дае Толькі Вера, толькі вера прымаецца Богам у разьлік. Ня можа сам чалавек апраўдацца перад Богам, ня можа зарабіць выратаваньне сваімі дзеяньнямі. Ніхто ня можа хваліцца перад іншымі, тым больш перад Богам, сваімі ўчынкамі. Выратаваньне проста даравана чалавеку з ласкі Божай (Эф. 2: 8-9). Толькі Ласка Божая дае чалавеку апраўданьне і выратаваньне.

І Толькі Хрыстос, толькі яго ахвяра і пакутніцкая сьмерць зьяўляюцца прычынай нашага апраўданьня і сьведчаньнем гэтай Ласкі Божай, гэтага дару выратаваньня. Таму рэфармаваныя вернікі ўдзячны аднаму Богу, а ня партыям, дзяржаве, героям, царкоўным ярархам ці іншым асобам. Таму толькі Аднаму Богу Слава, людзі ж роўныя паміж сабой, няма сярод людзей тых, хто заслугоўвае большай славы і пашаны, чым іншыя перад Богам.

І ўжо вернікі пераносяць гэтыя прынцыпы і Божыя Запаветы з жыцьця царквы і сваіх збораў на сьвецкае жыцьцё ўвогуле. Як Пісаньне мае адзіны аўтарытэт у царкве, так Закон адзін аўтарытэтны для хрысьціяніна ў сьвецкім жыцьці. Ня воля чалавека, якую б пасаду гэты чалавек ні займаў, не меркаваньне дэмакратычнай большасьці ці арыстакратычнай меншасьці — толькі Закон. Ці ж выпадкова ініцыятары і стваральнікі аднаго з найлепшых прававых кодэксаў тагачаснай Эўропы — канцлеры ВКЛ Аўстафі Валовіч і Леў Сапега былі эвангелічна-рэфармаванымі хрысьціянамі? Ці ня так яны ставіліся да Закону сваёй краіны, як да Пісаньня ў сваёй царкве?


ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

**Самы вядомы з былых рэфармацкіх храмаў — кальвінісцкі збор у Заслаўі. Яго збудаваў менскі кашталян Ян Глябовіч. Усяго ў XVI ст. існавала тры сотні рэфармацкіх цэркваў. Зь іх захаваліся будынкі ў Новым Сьвержані, Жодзішках, Смаргоні. Там цяпер служаць праваслаўныя ці каталікі. А ў Кухцічах у былым зборы — трансфарматарная падстанцыя.**

## Вера пасьпяховых

Менавіта пратэстанты распачалі масавую адукацыю па ўсёй Эўропе, і Беларусь не была выключэньнем. Школы ўсіх узроўняў існавалі і раней, але толькі пратэстанту ставіцца ў абавязак самастойнае вывучэньне Бібліі. Каталіку і праваслаўнаму можна слухаць сьвятароў, іх пераказы. А кальвініст ці лютэранін павінен вывучаць Слова Божае сам. Таму сярод пратэстантаў тых часоў можна назіраць выбух пісьменнасьці. Не выпадкова каталіцкая царква, і пераважна езуіты, павярнулася да масавай адукацыі тады, калі сталася відавочнай перавага пратэстантаў у гэтай галіне.

Можна не пагаджацца са знакамітым нямецкім сацыёлягам Максам Вэбэрам, што пратэстанцкая этыка спарадзіла сучасны эканамічны парадак, рынак і капіталізм. Але ж цяжка спрачацца з тым, што менавіта пратэстанцкія народы зьяўляюцца найбольш пасьпяховымі ў эканамічным жыцьці. Сярод заможных краінаў — ня толькі пратэстанцкія, але ўсе пераважна пратэстанцкія краіны — сярод заможных, незалежна ад наяўнасьці прыродных рэсурсаў. Мо не выпадкова час імклівага пашырэньня Рэфармацыі і час найвялікшага культурнага, эканамічнага, вайсковага і палітычнага росквіту нашай краіны — гэта адзін і той самы час? Можа, заняпад XVII ст. таксама зьвязаны з паразай Рэфармацыі і перамогай Контррэфармацыі?

Юбілейныя разважаньні ня могуць быць доказам той ці іншай гістарычнай вэрсіі. Але ж юбілей дае падставы для таго, каб павярнуцца да гісторыі, да разважаньняў пра ўласнае наканаваньне чалавека ў гэтым сьвеце і пра супольнае наканаваньне народу. «Навошта я пакліканы на гэты сьвет Богам?» — адно з галоўных пытаньняў верніка, рэфармаванага хрысьціяніна. А навошта мы, беларусы, пакліканы Богам як народ? Навошта нам дадзеная гэтая зямля і наша гістарычная культурная спадчына?

Гэта вельмі добра і сымбалічна, што юбілейныя мерапрыемствы сканчаюцца музычнымі канцэртамі. Наведнікі гэтых канцэртаў змогуць пачуць музыку Рэфармацыі, старажытную і сучасную, эўрапейскую музыку, з той яе неад'емнай часткай, якую нават мы дрэнна ведаем, — беларускай. Проста добрую, амаль забытую музыку. І атрымаць ня проста эстэтычную асалоду, а яшчэ і памэдытаваць пра ўласнае пакліканьне і пра нашае супольнае наканаваньне. Бяз патаснасьці і дыдактычнасьці, а проста сам-насам з музыкай. І яшчэ з Богам.

**Уладзімер Мацкевіч**

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

## Адраджэньне беларускай капэлы

XII фэстываль «Адраджэньне беларускай капэлы» прысьвечаны 450-годзьдзю Рэфармацыі ў Беларусі.

**4 сьнежня** (чацьвер) Уладзімер Неўдах запрашае на канцэрт арганнай музыкі. У рэпэртуары — заходняя і беларуская клясыка.

**6 сьнежня** выступяць ансамбль «Клясык-авангард» і Дзяржаўны камэрны хор. Салісты — Віктар Скорабагатаў, Янаш Нялепа, Раіса Шытава. Можна будзе пачуць творы з «Полацкага сшытку», псальму на словы Жана Кальвіна, творы Длугарая і інш.

**9 сьнежня** (аўторак) да кампаніі выканаўцаў далучацца сьпявачка Алена Бундзелева і гітарыст Валер Жывалеўскі. У праграме — творы зь «Віленскага сшытку», Бах, ананімныя аўтары XVII ст., яшчэ адна псальма на словы Кальвіна і інш.

**11 сьнежня** прагучаць творы Антонія Генрыка Радзівіла, Баха, Базыліка. Сьпяваюць В.Скорабагатаў, Я.Нялепа, Алег Кавалеўскі, Алена Сало, Леся Лют, Вольга Рузіна.

Пачатак канцэртаў а 19-й. Квіткі прадаюцца ў касах Белдзяржфілярмоніі. Даведкі праз т.: 289-34-62.




**6 сьнежня на канцэрце «Клясык-Авангарду» творы Лютэра і Кальвіна ўпершыню загучаць па-беларуску.**

# Сэнсацыйныя гравюры

**У швэдзкіх архівах знойдзены невядомыя дрэварыты Берасьця сярэдзіны XVII ст. Зь іх можна дакладна рэканструяваць горад, цалкам разбураны ў 1830 г.**

Дасьледчык гісторыі беларуска-швэдзкіх дачыненьняў Андрэй Катлярчук, пераглядаючы вопіс Эрыка Дальбэрга, не спадзяваўся адшукаць нешта каштоўнае. «Думаў, што знайду якія-небудзь Кейданы, а там было толькі Берасьце, — распавядае Катлярчук. — Я ўбачыў тры гравюры з панарамай гораду і адзін плян места ад 1657 г. Гэта сэнсацыя, бо дзьве з трох гравюраў невядомыя і нідзе не друкаваліся».

Дальбэрг быў афіцэрам у войску швэдзкага караля Карла X, якое ў сярэдзіне XVII ст. ваявала ў Вялікім Княстве Літоўскім. Тады і выявіўся яго талент мастака-баталіста. Дальбэрг, у прыватнасьці, пакінуў нам гравюру «Аблога Берасьця», якая дагэтуль была адной зь нямногіх крыніцаў, зь якіх мы можам уявіць выгляд гораду ў тыя часы. Берасьце, мусіць, уразіла Дальбэрга, таму гравюры ён зрабіў аж тры. На дзьвюх зь іх можна разгледзець замак зь вежай, шмат касьцёлаў і цэркваў, пабудаваных у гатычным стылі, гарадзкія кварталы, абарончыя збудаваньні, браму, габрэйскія могілкі з надпісамі на іўрыце, берасьцюка на арбе...

«Плян места цікавы найперш для гісторыкаў архітэктуры, а вось для звычайнага чытача вялікую цікавасьць маюць гравюры Берасьця, — гаворыць А.Катлярчук. — Працуючы зь імі і маючы плян места, можна абсалютна дакладна рэканструяваць ягоны тагачасны выгляд, бо горад цалкам быў зруйнаваны ў 1830 годзе».

На жаль, беларускі чытач ня хутка пабачыць знойдзеныя гравюры Дальбэрга, бо Катлярчук зьбіраецца ўпершыню надрукаваць сэнсацыйныя знаходкі толькі ў сваёй дысэртацыі. А яе трэба чакаць яшчэ гады два.

**Сяргей Ёрш**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Чорт з вантузам

**27 лістапада ў Тэатры імя Янкі Купалы распачаўся шумны тэатральны фэстываль «Адкрыты фармат». Першым спэктаклем, які пабачылі гледачы, былі «Дні гэтых ночаў (Чайка й Калашнікаў)» Тэатру новага фронту.**

Тэатар быў заснаваны ў Санкт-Пецярбурзе ў 1993 г., а з 94-га працуе ў Празе. Спэктакль постмадэрнісцкі, пабудаваны на алюзіях на вялікіх папярэднікаў і канцэптах расейска-эміграцкай культуры. Аўтарамі спэктаклю зьяўляюцца самі акторы тэатру, рэжысэрам — Алеш Янак.

«Дні...» ня маюць сюжэту як такога. Пра тое, што адбываецца на сцэне, гледачам па-ангельску распавядае адзін з актораў. Падзеі ж разгортваюцца ў выглядзе праяваў разарванай, часам абсурднай рэчаіснасьці. Трагічнай або камічнай. Пустой або насычанай. Штодзённай або ўзвышанай. Рэчаіснасьці чалавечага жыцьця.

Вядзецца пра двух актораў — Аркадзя Іванова й Моміка Бурмана. У 1974-м яны эмігруюць у Буэнас-Айрэс, а ў 1975-м там абвяшчаецца ваеннае становішча. Жахлівае жыцьцё актораў абцяжарваецца сьпякотай, сумам па Ленінградзе. Але нехта ўсё ж спрабуе дазваніцца да іх у грымёрку на ўскраіне Буэнас-Айрэсу. Потым Аркадзь застрэліцца, а Момік эмігруе ў Штаты й стане пасьпяховым комікам — багатым і вядомым. Толькі мінулае ніяк не захоча адпусьціць яго...

Глядач наўрад ці зможа прасачыць разьвіцьцё гэтых падзеяў непасрэдна на сцэне. Яны будуць пададзеныя на ўзроўні сымбаляў, асацыяцыяў, летуценных згадак. Дзея нагадвае сон. Наколькі можна меркаваць з словаў апавядальніка, тое, што мы бачым на сцэне, і ёсьць сном кагосьці іншага. Але падчас спэктаклю не засьнеш: ён нясе ў сабе шмат небанальных ідэяў, нечаканых трукаў, вытанчаных жартаў, а хоць калі й эпатажу.

«Чайка і Калашнікаў» — яскравая зьява на беларускай сцэне, згададай на вартыя пастаноўкі. Гэткі красамоўны прыклад свабоднага мастацтва й свабоды ў мастацтве. Хай сабе адной з праяваў гэтага ёсьць зьяўленьне ў адным з эпізодаў статнага рагатага «чорта» ў акулярах і з вантузам на аголенай сьпіне. Нядрэнна было б, каб ён крыху паганяў шэрых «анёлаў» безгустоўнасьці альбо заморанай акадэмічнасьці апошніх часоў.

Ідэя правядзеньня фэстывалю «Адкрыты фармат» належыць драматургу Андрэю Курэйчыку і дырэктару Купалаўскага Генадзю Давыдзьку.

**Марыя Салаўёва**

МЕНСКАЯ ПРЭМ'ЕРА

# Бляндынка другой сьвежасьці



MOVIEWEB.COM

Прабіўная Элі Вудз у выкананьні Рыз Уізэрспун, знаёмая нам з пасьпяховай рамантычна-юрыдычнай камэдыі двухгадовай даўніны «Бляндынка ў законе», не ўтрымалася ад спакусы вярнуцца на кінаэкраны. З студэнткі яна ператварылася ў маладую спэцыялістку, якой сьвеціць месца ў прэстыжнай юрыдычнай канторы. Адначасова Эл рыхтуецца да вясельля з сваім абраньнікам Эмэтам і рассылае запрашальнікі. Яна ня можа абмінуць маці свайго найлепшага сябра — сабачкі Велікана, але тая ўтрымліваецца ў лябараторыі па выпрабаваньні касмэтыкі на жывёлах. Вызваліць яе адтуль няпроста, бо дзейнасьць фірмы цалкам адпавядае законам. Вудз вырашае зьмяніць закон — і едзе ў Вашынгтон...

Сыквэл дзеля сыквэлу — інакш ня скажаш пра «Бляндынку ў законе-2». «Вытанчаная» завязка, непераканаўчая сярэдзіна і патэтычна-саладжавы фінал. Паводле жанру стужка, як і раней, нібыта камэдыя, але нагадвае пра сябе гэтая акалічнасьць ня вельмі часта. Калі б не раптоўнае адкрыцьцё, зробленае Эл адносна полавай арыентацыі свайго гадаванца, вакол чаго круцяцца самыя ўдалыя жарты фільму, увогуле была б бяда.

Усё гэта ня значыць, што карціну зусім немагчыма глядзець. Проста загадзя згадайце пра «закон працягаў», пастарайцеся максымальна расслабіцца і не чакайце зашмат.

**Іван Пятроў**

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

## «Адкрыты фармат» запрашае

Працягваецца міжнародны тэатральны фэстываль «Адкрыты фармат». **4 сьнежня** на сцэне тэатру імя Горкага можна будзе пабачыць спэктакль «Дзівакі» паводле п'есы першага пралетарскага пісьменьніка. У пятніцу, **5 сьнежня**, у Беларускай акадэміі мастацтваў прэзэнтуецца «Ноч Гельвэра» паводле Інгмара Вілквіста. **У суботу** плястычны тэатар «ІнЖэст» і гурт «Плято» запрашаюць на малую сцэну ТЮГу дзеля прагляду іх сумеснае бута-акцыі «Елка У». **У панядзелак** швэдзка-брытанскі тэатар «SU-EN Butoh Company» пакажа ў Купалаўскім п'есу «Slice» («Кавалак»), **у аўторак** тамсама можна будзе пабачыць «Вуліцу кракадзілаў» у інтэрпрэтацыі Сучаснага тэатру пантамімы з Уроцлава. **У сераду 10-га** — сустрэча з Дударавым: ягоную п'есу «Палачанка» ставяць у Тэатры юнага гледача. **У чацьвер** на купалаўскай Малой сцэне прэм'ера: «Налу» паводле п'есы В.Любецкага і Я.Русакевіч. Спэктакль Някрошуса «Вішнёвы сад», разынка фэстывалю, запляланы на **суботу й нядзелю**. Іграць яго будуць у Купалаўскім, квіткі каштуюць да 80 тыс. Пачатак усіх спэктакляў а 19-й, цана квіткоў — ад 10 тыс. руб.

## Першая субота зімы з Камоцкім

**6 сьнежня** Алесь Камоцкі прапануе адсьвяткаваць разам пачатак зімы. Ён будзе сьпяваць у Палацы моладзі (Старавіленскі тракт, 41). Пачатак а 15-й. Уваход вольны.

## Падарунак ад Плясанава

Андрэй Плясанаў з нагоды свайго 55-годзьдзя падрыхтаваў сюрпрыз для тых, хто наведае канцэрт яго гурту «P.L.A.N.» **11 сьнежня** ў клюбе «Алькатраз» (ДК прафсаюзаў). Усім, хто набудзе квіток, новы дыск «Вам слова, Джон Ячмень» — у падарунак. Пачатак а 20.00. Музыкі граюць клясычныя блюзы й рок-н-ролы, сьпяваюць па-беларуску.

## З Вольскім і Харлі on-line

**5 сьнежня** на сайце www.chat.bymp3.com можна будзе пагутарыць у рэжыме рэальнага часу з гуртом «NRM». Інтэрнэт-канфэрэнцыя будзе праходзіць у VIP-залі інтэрнэт-кафэ **«СаюзONLine»** (Цэнтральны дом афіцэраў, вул.Чырвонаармейская, 3). А **10 сьнежня** на гэтым самым сайце можна задаць пытаньні гурту «Харлі», ндаўняму пераможцу «Залатога шлягеру» ў намінацыі «ВІА імя Мулявіна». Пачатак канфэрэнцыяў а 17-й.

## Танчыць «Палац» апоўначы

**У ноч з 4 на 5 сьнежня** ў новым клюбе «Белаатра» (вул.Арлоўская, 18, недалёка ад пл.Бангалор) выступіць «Палац» з танцавальнай праграмай. Дыскатэка з удзелам «Палацу» распачнецца каля поўначы.

## Алесь Лось і «Капэла»

**9 сьнежня** адбудзецца канцэрт гістарычнай музыкі «Легенды Вялікага Княства». У менскім Тэатры эстрады (вул. Маскоўская, 18) зайграе дудар Алесь Лось із сваёй «Капэлай». Гэты калектыў, сілами дуды, скрыпкі, цымбалаў, акардэону ды басэтлі, рэканструюе музыку мінулых часоў. У праграме — лірніцкія песьні, канты XVI—XVIII ст., смыковая музыка, кампазыцыі 30-х гадоў XX ст. Пачатак а 19-й. Квіткі прадаюцца ў касе тэатру. Даведкі праз т.: 222-82-96.

## Прэзэнтацыя кніжкі Рублеўскай

**7 сьнежня** ў Купалаўскай бібліятэцы (Менск, вул.Харужай, 16) адбудзецца прэзэнтацыя кнігі Людмілы Рублеўскай «Сэрца мармуровага анёла» і сьвяткаваньне гадавіны суполкі маладых творцаў «Літаратурны квартал». Пачатак а 12-й.

**Сяргей Будкін, СМ**

# Генадзь Грушавы: Сыны Лукашэнкі пабывалі за мяжой як дзеці Чарнобылю

**Лёс Генадзя Грушавога пераломісты: з спорту — у філязофію, зь філязофіі — у грамадзкую дзейнасьць і палітыку, адтуль — ледзьве не на нары. Грушавы быў каталізатарам выбуху грамадзянскай актыўнасьці ў краіне. Ягоны фонд «Дзецям Чарнобылю» даваў працу дванаццаці тысячам чалавек. Пасьля дзяржзачысткі Грушавы не захацеў застацца на эміграцыі ў Нямеччыне, дзе жывуць ягоныя дарослыя дзеці. Зь Нямеччынай містычна зьвязаны лёс сям'і: там у вайну спаткался маці й бацька сп.Генадзя. Пра гэтую гісторыю ён даведаўся ўжо дарослым.**



АРЦЁМ ЛЯВА

Мы прапануем альтэрнатыўную сацыяльную сыстэму. Яе прынцып — грамадзянін і дзяржава роўныя ў сваёй адказнасьці.

**Генадзь Грушавы:** Маці з бацькам шмат год хавалі гэты факт, бо бацька быў дзяржаўны чалавек. На фронце пачаў радавым, скончыў камандзірам палка. Маці паходзіць зь Вялікага Ноўгараду, з роду Рабавых. Яе ў 17 год зьвезьлі гастарбайтаркаю ў Нямеччыну. Бацька вызваліў маці ў 1945 г., як бралі Каралявец.

**«НН»: А як выйшла, што юнак з вайсковай сям'і забраўся ў горнія вышыні філязофіі?**

**Г.Г.:** Філязофію знайшоў пад ложкам. Сур'ёзна займаўся лёгкай атлетыкай, уваходзіў у зборную краіны. Паехаў на спартакіяду ў Гомель, разьмясьцілі нас у студэнцкім інтэрнаце. Пад ложкам я выпадкова заўважыў стос папер. Аказалася, шпаргалка па філязофіі. Разгарнуў, дый ня мог адарвацца тры дні. Пасьля знайшоў неабходную літаратуру, пачаў вывучаць філязофію, аддаючы перавагу нямецкай клясычнай. У 1972 г. я скончыў унівэрсытэт і ў тым жа годзе здаў дысэртацыю.

**«НН»: Неверагодна!**

**Г.Г.:** Я ведаў «Капітал» Маркса як Біблію. Першы год вучобы штодня па тры гадзіны я вывучаў «Капітал». На дзень засвойваў 10—12 старонак. Прачытваў, занатоўваў, параўноўваў з арыгіналам. І прамаўляў уголас. І толькі потым запісваў адоленыя тэзы ў канспэкт.

**«НН»: Што Вам гэта дало?**

**Г.Г.:** Яснасьць і сыстэмнасьць думкі, звычку да сыстэматычнай працы і аўтаматычныя залікі ў прафэсара Кулажанкі, які выкладаў палітэканомію капіталізму.

**«НН»: Сэанс магіі з выкрыцьцём?**

**Г.Г.:** Выкладаў Кулажанка дакладна па «Капітале». І праз месяц ня ён, а я даваў камэнтары па кожным пытаньні. Ён ухваліў і прапанаваў мне пісаць кандыдацкую.

**«НН»: У сямнаццаць гадоў?**

**Г.Г.:** Вось такі я быў стопрацэнтовы выдатнік! У 24 гады абараніў кандыдацкую, у 25 фактычна кіраваў катэдраю, у 30 падрыхтаваў доктарскую.

**«НН»: А як здарылася, што Вы пакінулі парцалянавую вежу й пайшлі ў «рэальнае жыцьцё»?**

**Г.Г.:** Займаючыся далёкімі ад жыцьця ідэальнымі канструктамі, філёзаф або сыходзіць у сваю сыстэму цалкам, або пачынае сузіраць жыцьцё з вышыні сваіх канструктаў. Мне пашанцавала, што я выйшаў з кабінэту, не пасьпеўшы завяршыць сваю сыстэму. Інакш я б ня выйшаў зь яе.

**«НН»: Вы выйшлі з кабінэту адразу ж на Чарнобыльскі шлях?**

**Г.Г.:** Хутчэй на Дзяды ў 1988-м. Глядзеў на пабоішча, а ўсярэдзіне адбываўся пераварот. На наступны дзень прыйшоў у Дом літаратара, дзе сядзеў аргкамітэт «Мартыралёгу». Пісаў статут БНФ, рыхтаваў І Зьезд. І прапанаваў у 1989 г. зьвярнуць увагу на Чарнобыль.

**«НН»: А ў 1986 г. не заўважылі Чарнобылю?**

**Г.Г.:** Не. У 1989 г. я пазнаёміўся са спадарынямі Кісялёвай і Белавокай, якія таемна зьбіралі інфармацыю пра Чарнобыль. Я прапанаваў: мы зьбіраем групу, едзем туды на два тыдні. Сябры з Саюзу кінэматаграфістаў далі «РАФік». Мастак Марачкін, які родам з Чэрыкава, падрыхтаваў нам там базу. Бяром журналіста Грудніцкага, доктарку Белавокую, прафэсара Шушкевіча (праўда, ён у апошні момант адмовіўся). Нас было чалавек сем. Я арганізаваў прыкрыцьцё. Патэлефанаваў Тарасенку, які тады кіраваў Беларускім экалягічным саюзам (БЭС) — прыдзяржаўленай структурай. Тарасенка патэлефанаваў нейкаму мясцоваму князьку, што будзе ў вас працаваць група з БЭС. Васіль Лявонаў, які тады загадваў у Магілёўскай вобласьці, патэлефанаваў у раёны: едзе, маўляў, група з БЭС.

**«НН»: Яны вас прамаргалі.**

**Г.Г.:** Так. Гэта неверагодна! Цуд. Доктар санстанцыі даў нам засакрэчаныя зьвесткі. Праз паўгадзіны апытаньня на вуліцах сацыёлягі Сядова забралі зь міліцыяй. У Чудзянах, дзе было 165 кюры, на пляме радыяцыі стаяў дзіцячы садок. Многа выпадкаў, калі цэлыя сем'і хварэлі і паміралі, а ім не казалі ад чаго. Інфармацыя, якую мы назьбіралі, дала выбух, рэвалюцыю. Там, дзе цяпер помнік Менску, мы зладзілі першы экалягічны, Чарнобыльскі мітынг.

**«НН»: А цяпер што з чарнобыльскай палітыкай?**

**Г.Г.:** Лукашэнка крок за крокам вынішчаў са сьвядомасьці людзей усьведамленьне праблемы. З 1998 г. дактары адмаўляюцца даваць мне статыстыку, датычную здароўя й жыцьця людзей. Прыкра, бо ў 1990 г. у Вярхоўным Савеце першым, хто да мяне падышоў, быў дэпутат ад Шклова Аляксандар Лукашэнка: «Генадзь, вось ты займаешся Чарнобылем, а ведаеш, у Шклоўскім раёне жывуць людзі, якія пацярпелі ад Чарнобылю. Калі мы ім дапаможам, яны зразумеюць, што на іхным баку не дзяржава, а мы, дэмакраты». І мы пачалі зь ім гэтую справу. Кіраваў Шклоўскім аддзяленьнем Фонду «Дзецям Чарнобылю» сябра Лукашэнкі Ўладзімер Канаплёў. Ён быў цудоўны арганізатар, трэба аддаць належнае. Адправіў за мяжу дванаццаць груп дзяцей. Сярод дзяцей былі й сыны Лукашэнкі, і дзеці Цыцянкова, які кіраваў Краснапольскім раёнам. У 1994 г., калі абралі Лукашэнку й Канаплёў стаў ягоным дарадцам, Канаплёў ня кідаў нас, дапамагаў дзе словам, дзе ўплывам. Выпрашальным быў 1995 г.

**«НН»: Чаму?**

**Г.Г.:** Дзяржава паварочвала на аўтарытарныя рэйкі. Сіла аўтарытарнай сыстэмы не ў ідэалёгіі. СССР быў моцны татальнай сацыяльнай абаронай і адпаведна татальным сацыяльным кантролем. Чалавек нараджаецца ў дзяржаўнай радзільні, ідзе ў дзяржаўныя садок і школу, мае працу, жыльлё, пуцёўку на адпачынак, пэнсію ад дзяржавы. Нават хавалі часьцяком за дзяржаўны кошт. Мы прапанавалі альтэрнатыўную сацыяльную сыстэму. Сацыяльная дэмакратыя — гэта лад, які абараняе права чалавека мець адпаведны лад жыцьця. Сёньня сацыяльная дэмакратыя існуе хіба ў Нямеччыне. Калі там спрабуюць зьменшыць сацыяльныя выдаткі, на вуліцу выходзяць мільёны людзей. Хтосьці сказаў: бастуюць толькі галодныя. Няпраўда! Бастуюць сытыя, тыя, хто ўсьвядоміў, што ёсьць права, якое належыць толькі яму. Сацыяльная дэмакратыя салідарызуе ўсіх. Яе прынцып — грамадзянін і дзяржава роўныя ў сваёй адказнасьці. У ініцыятывах Фонду «Дзецям Чарнобылю» працавалі дзясяткі тысячаў чалавек. Мы стварылі групы самадапамогі на ўсёй краіне, у 72 раёнах. 15—20 тыс. дзяцей езьдзілі за мяжу штогод праз наш фонд (у Расеі — 1,5 тыс., ва Ўкраіне — 5). Людзі ішлі да нас цугам.

**«НН»: Нізавая адбудова грамадзянскай супольнасьці?**

**Г.Г.:** Я прапанаваў Кебічу законапраект: давайце мы, грамадзяне гэтай дзяржавы, добраахвотна будзем уносіць 5—6% у бюджэт. Разам з гэтай дзяржавай будзем адказваць за краіну. Умова адна: нашыя структуры атрымліваюць гэткія ж правы, як кіраўнікі выканкамаў. Каб мы не абівалі парогаў. Каб далі нашаму чалавеку ксіву і ён мог прыйсьці ў любую ўстанову. Кебіч не пагадзіўся. Але гэта ўсё адно б адбылося. Каб не Лукашэнка, які пачаў разбураць грамадзянскую адказнасьць за тое, што адбываецца ў краіне. Адказнасьць забралі дзяржструктуры.

У нашых структурах працавала 12 тыс. валанцёраў. Каб іх запалохаць, і быў у 1997 г. арганізаваны гучны працэс. Абвесьцілі: галоўныя ворагі — Фонд Сораса, Фонд Грушавога й арганізацыя Майсені «Ўсход-Захад». Прыходзіць да мяне чалавек проста з паседжаньня Рады Бясьпекі й кажа: «Выбачай, але мы выканаўцы, мы будзем гэта рабіць». А я кажу: «А калі б табе бацьку загадалі забіць, выканаў бы?» Маўчыць.

**«НН»: А чаму Вас асабіста не ўдадушылі, як Бандажэўскага?**

**Г.Г.:** Галоўная мэта — зьнішчэньне сеткі й задушэньне грамадзкай ініцыятывы. Яны дасягнулі свае мэты. А за мяне заступіўся ўрад Нямеччыны, які прапанаваў Лукашэнку стварыць міжурадавую камісію па праверцы Фонду. Антановіч, тады міністар замежных справаў, пагадзіўся. Ягоныя праваральшчыкі ня здолелі накапаць кампрамату. Праз год пракурор Цэнтральнага раёну закрыў справу, пацісну мне руку і выбачыўся. Але структуры Фонду былі разбураныя, і ў 1999 г. улады абвесьцілі: усё добра, вяртайцеся ў Чарнобыль, нараджайце дзяцей, сейце жыта.

**«НН»: Што ж цяпер?**

**Г.Г.:** Усё трэба пачынаць наноў. Мы знаходзімся на пераломе, зьявіўся новы шанец. Прыходзяць да нас усе гэтыя гады людзі й плачуць: нам дрэнна, так дрэнна. — Чаму? — Ня ведаем, мы нічога ня можам зьмяніць, мы маленькія людзі. — Мы такія ж самыя, а вы на нас спадзяецеся, значыць, ад нас усё ж нешта залежыць? І людзі пачынаюць думаць.

**«НН»: Вам у Нямеччыне прапаноўвалі застацца, ачоліць катэдру філязофіі Гановэрскага ўнівэрсытэту, давалі жыльлё. Чаму не засталіся ў Нямеччыне, не вярнуліся да філязофіі?**

**Г.Г.:** Я хацеў вярнуцца сюды. Я ня мог пакінуць Беларусь такой, якая яна ёсьць. Гэта было б маёй паразай як філёзафа, як чалавека. У Беларусі падышоў да мяне адзін чалавек і кажа: у цябе тут вочы ўпэўненага чалавека, а ў Гановэры, нават калі ты быў на хвалі посьпеху, у цябе былі вочы бамжа. Беларусь — гэта дом.

**Гутарыла Сьвятлана Курс**

ДАВЕДКА «НН»

**Генадзь Грушавы** нарадзіўся 24 ліпеня 1950 г. у Менску. Характар адпавядае знаку Задыяку (Леў). Прафэсар. Лідэр найвялікшай чарнобыльскай арганізацыі — Фонду «Дзецям Чарнобылю». Фонд вывез 130 тыс. дзяцей на аздараўленьне за мяжу. Дэпутат ВС XII і XIII скліканьня. Ляўрэат Прэміі Рафта (уручаецца ў Бэргене, Нарвэгія; тры зь пятнаццаці ляўрэатаў гэтай прэміі пасьля былі ўганараваныя Нобэлеўскай прэміяй міру). Генадзева жонка Ірына — адна зь лідэрак сацыяльна-хрысьціянскага руху. У іх двое дарослых дзяцей.

Славамір Адамовіч

# Лісты з Поўначы

**Заканчэньне. Пачатак у № 42, 43, 44.**

*Lieb Vaterland, magst ruhig sein*.*

## Ліст пяты. Кантэйнэр

Надоечы сасьніў я сон — сон-успамін, сонзгадку.

...1983 год. Зіма. Я толькі што вярнуўся з сонечнага Крыму, дзе шанцавала адслужыць-адседзецца, пакуль іншыя аднагодкі гінулі ў гарах Аўганістану. Пасьля двух месяцаў законнага адпачынку ад службы іду ў работу — манцёрам на чыгунку. Тады, як, зрэшты, і цяпер, праца на пуці лічылася ці ня самай чорнай — чарнейшай за працу ў калгаснай брыгадзе, у кароўніку ці сьлесарам на мэхдвары.

У 1983-м на ўчастку Маладэчна—Парахвенава якраз мянялі драўляныя шпалы на бэтонныя: заступ і кастыль саступалі месца накідному ключу, балтам і гайкам, якімі мацаваліся тыя цяжэзныя шпалы новага пакаленьня.

І вось жа сьніцца, што мой рабочы дзень завяршаецца, і што іду я з брыгадай у падсобку, і адбываецца ўсё на паўстанку «Крывічы»; аднекуль зьяўляецца віно «Лучистое» Ілаўскага вінзаводу, і саракагадовы мой напарнік, жонка якога працуе ў сьвінарніку, дастае на закусь вараную сьвініну. У дваццаць адзін год віно, нават самае паршывае, п'ецца прагна, перабіваючы жаданьне чагосьці іншага, яшчэ недаступнага, дый апэтыт — як у касманаўта пасьля цюбікаў. Таму, калі я нарэшце заўважаю, што мяса чарвівае (памятаеш фільм «Браняносец «Пацёмкін»?), мяне ня блажыць, я не панікую, а моўчкі даядаю сваю закуску. Не скажу, што я прывык да чарвівага, проста ўвесь час быў недаеўшы, галаднаваты; хвіліны сытасьці былі рэдкімі і толькі хвілінамі.

...І сьніцца мне далей, мая дзіўная, што іду я, зьлёгку п'яны, па мной укладзеных новенькіх бэтонных шпалах у шырокі сьвет, а насустрач мне ляскочуць кантэйнэравозы з вагонамі-лядоўнямі, і чую я над сабою строгі голас цёткі Гені Ляшковіч: «А, душапрадаўцы, на Маскву прућь! Столькі тых сьвіных комплексаў нарабілі, а ўсё ня ўкормяць. Глядзі ж, дзіцятка, ніколі *не хадзі ў той бок*!»

Во такі сон сасьніў я днямі. А ўчора была сапраўдная вераб'іная ноч і нашы грузіны раптам выбраліся на рыбу. Рыбы яны не прынесьлі, але вярнуліся з поўным ды пачаставалі мяне сардэлькамі і сырам з плесьняю, «каб маўчаў». Маўчаць я мусіў пра тое, што яны ўскрылі *кантэйнэр* з прадуктовымі адкідамі.

Аплятаючы кантэйнэрныя далікатэсы ды запіваючы іх уласным чарнічным віном, я згадваю, далёкая мая, колішні сон, у якім елася чарвівае мяса і пілося чарвіва-яблычнае віно, але я быў малады і мой *шлях ня ў той бок* толькі пачынаўся — шлях, які прывядзе мяне да кантэйнэру.

Наш Кантэйнэр, мая мілосная, — гэта ніжняя палуба іхнага «Тытаніку», вялікі эўрапейскі сьметнік, на якім можна добра пажывіцца (іншы раз думаецца, што «Тытанік» прадукуе тавары толькі для таго, каб іх выкінуць). Той, хто ня стаў красці, увайшоўшы ў Сыстэму, рана ці позна знаходзіць *свой* Кантэйнэр.

З Кантэйнэру мы апранаемся самі і апранаем радню, якая пакуль там, на радзіме; з Кантэйнэру мы валачом усё, што толькі прыдасца ў нашай азюлянцкай гаспадарцы: скрыню ацынкаваных цьвікоў, маніторы, працэсары, тэлевізары, электрапліткі, лыжныя палкі, навачныя дажджавікі, жоўты школьны заплечнік з тоўстай ласінай скуры, жалезныя падсьвечнікі, набор відэльцаў з касьцянымі тронкамі, красоўкі з чырвонымі мігалкамі ў падэшвах, футбольны мячык, падшыўку часопісу «Дом і сад»...

Раней, да зьяўленьня ў мястэчку Рогнан бежанцаў, кантэйнэр замыкалі, але з нашым прыходам замкі перасталі выконваць свае функцыі: мы іх папросту пазьбівалі. І сапраўды, калі ёсьць яшчэ азюлянты, якія ня крадуць у крамах, дык аддайце гэтым дарослым дзецям ваш сьметнік, ваш набіты побытавым барахлом Кантэйнэр; аддайце былым грамадзянам імпэрыі вашы нераскупленыя булачкі (два даляры штучка); ваш паўтара даляра за паўкілё хлеб; вашы някупленыя і нязьедзеныя бананы зь любай вам Афрыкі; вашую бульбачку-арэшкі; словам, аддайце непатрэбную вам арганіку тым, хто яшчэ спадзяецца на прытулак і верыць у лепшую долю...




У зону кантэйнэрнай актыўнасьці ўваходзіць і збор пустых бутэлек, тым болей што каштуюць яны прыстойна і ня трэба выстойваць чаргу, каб іх здаць: у супэрмаркетах бутэлькі прымаюцца непадкупнымі аўтаматычнымі мэханізмамі.

Расказваюць, што нейкі савецкі хахол спрабаваў здаваць адну бутэльку некалькі разоў, прывязваючы за рыльца нітку. Спачатку прыём спрацоўваў, але ўрэшце машына прасякла наколку і ад арыгінальнай ідэі прыйшлося адмовіцца.

А сёньня, мая зорная, майму суседу па нарах пашанцавала: разам з пустымі ён знайшоў і паўбутэлькі гарэлкі «Ilzin». Кажа, што яму бог паслаў да дня нараджэньня дачкі. Ну, мы й выпілі гэтага «эльцына» на трох, бо Жэка запрасіў яшчэ і свайго таварыша ў бутэлечным бізнэсе грузіна Зазу. Пасьля доўгага ўстрымваньня сто грамаў імгненна разьвязалі суседу язык. І вось мы ўжо ведаем, што адна ягоная цётка працавала ў камісіі партыйнага кантролю ў часы СССР, а муж сястры — палкоўнікам у нашым КДБ. Палкоўнік спачатку лаяў прэзыдэнта, а калі рэжым дзяржбясьпекі пігулку пасаладзіў — пачаў нахвальваць, што зрабіла сямейны грунт сэйсьмічна няўстойлівым. Цікава і тое, што, як некалі ў турме, я зноў пачуў прозьвішча колішняй банкіркі Віньнікавай. Жэка, заядаючы «эльцына» кантэйнэрным сырам, даказваў, што ў яго ёсьць знаёмы, які быў у групе вонкавага нагляду ў той дзень, калі з-пад хатняга арышту лэдзі-банк зьнікла і праз суткі аб'явілася ў... Лёндане. Дык вось, у дзень зьнікненьня групе нагляду паступіла тэлефанічная каманда «аб'ект» не затрымліваць, маўляў, «хай ідзе ў магазын, цырульню, хай ідзе, куды ёй трэба»... Праз некаторы час двое з групы самі трапілі пад арышт, а трэці, хто і расказаў пра каманду зьверху, нейк выкруціўся.

Вось што, зярнятка маё кедравае, можна пачуць, выпіўшы ўсяго па сто на брата кантэйнэрнае vodk'і «Ilzin».

For øvrig**, мне найбольш цікавы мой уласны раман з Кантэйнэрам — раман-дружба, раман-зьвязка, раман-саюз непарушны, які пачаўся яшчэ ў Нью-Ёрку. Працуючы там на будоўлі, я мусіў мой амэрыканскі Кантэйнэр запаўняць адкідамі вытворчасьці і, шчыра кажучы, мала ўвагі зьвяртаў на ягонае прыватнае жыцьцё; я выкідаў у Кантэйнэр левае сьмецьце зь іншых будоўляў, зарабляючы на гэтым свой левы даляр; я не абураўся, калі раніцай у ягонае чэрава манхэтанскія бляздэхі шпурлялі плеўкі прээрвятываў і абрыдлыя плястыкавыя члены, а прыбіральшчык з кітайскага рэстаранчыка вёдрамі вывальваў яму на грудзі памаранчавыя ашлупкі... Аднойчы Кантэйнэр ледзь не прыдушыў мяне, уступіўшы ў злачынную змову зь меншым сваім братам, на якім я вывозіў цагляны друз, каб вывернуць яго ў прастору большага.

Ня тое цяпер, у Краіне Паўночнага Шляху. З маім нарвэскім сінім-сінім Кантэйнэрам я жыву ў згодзе: пэрыядычна заяўляюся да яго на госьці; правяраю, ці не пашкодзіў хто кантэйнэрныя дзьверцы-прадуктапрыёмнікі, ці не перацягнулі жалезнае цела Кантэйнэра ў якое нязручнае месца і ці не расьпісалі тутэйшыя недарослі ягоныя сінія бакі спрэй-факамі. І толькі ўчора, вось толькі ўчора, мая бязьмежная, я зноў наведаў Кантэйнэр у Рокландзе.

Надвор'е было добрае: пасьля моцных дажджоў падціснуў марозік; начное неба ўспыхнула пісягамі палярнага зьзяньня, пакаваліся абрысы Вялікага Каўша; пахла сасною, пілавіньнем і прэла-памерзлым лісьцем. Я прыхіліў ровар да дрэва, дастаў запальнічку і пасьвяціў у чэрава майго жалезнага сябра. Амаль да палавіны ён быў напоўнены ўжываным дабром — пераважна адзеньнем. Мне неяк раптам гульліва падбрыкнулася: ухапіўшыся за край вечка, я падцягнуўся на руках, спрытна прасунуў у фортку ніжнюю частку сваёй на 66 кіль фігуры, а потым прапхнуў і плечы. Апынуўшыся ў сярэдзіне Кантэйнэра, я паваліўся на пакеты зь неданоскамі і на хвіліну заціх. Пахла знаёмым пахам старызны — адсырэлай тканінай з бавоўны, ільну ды авечай поўсьці.

Зьніклі сузор'і, сылюэты і шумы аўтамабіляў на ляхальнай шашы.

Нічога ня стала. І тады, як некалі ў пачатку шляху, я адчуў сябе абсалютна адзінокім і абсалютна свабодным.

* — Любая Айчына, можаш быць спакойнай (ням.).

** — Зрэшты (нарв.).

## • НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ •

**Ластоўскі В. Кароткая энцыкляпэдыя старасьвеччыны** / Ін-т літаратуры імя Я.Купалы НАН Беларусі; Укл. Я.Янушкевіча. — Менск: Выдавец В.Хурсік, 2003. — 226 с. 300 ас.

Рукапіс энцыкляпэдыі (датаваць яго можна пачаткам 1920-х) быў расшуканы ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы АН Літвы. У «Кнігарні пісьменьніка» выданьне каштуе пад 10000 руб.

**Літаратурны квартал** / Уклад. Л.Рублеўскай; Рэд. В.Шніп. — Менск: Літаратура і мастацтва, 2003. — 128 с. 1000 ас.

**Міталёгія. Духоўныя вершы** / ІМЭФ імя К.Крапівы НАН Беларусі; А.Ненадавец, А.Марозаў, Л.Салавей, Т.Івахненка; Нав. рэд. А.Фядосік. — Менск: Беларуская навука, 2003. — 471 с. — (Беларускі фальклёр: Жанры, віды, паэтыка; Кн. 5). 800 ас.

Аўтары дасьледуюць беларускі пантэон — вышэйшых й ніжэйшых боствваў, якім маліліся нашыя продкі. У шапіку Акадэміі навук каштуе 8220 руб.

**Міцкевіч А. Гражына: Вершы і паэмы** / Уклад. І.Дабрыян. — Менск: Мастацкая літаратура, 2003. — 254 с. 2000 ас.

**Міхальчук М. Вінерчын чаравік сапраўдны ў Берасьцейскім і Прыпяцкім Палесьсі.** — Берасьце: Выд-ва С.Лаўрова, 2002. — 136 с. 460 ас.

Дасьледаваньне прысьвечанае вэнэрынаму чаравічку — рэдкай расьліне, узятай пад ахову ва ўсіх эўрапейскіх краінах. У «Акадэмкнізе» каштуе 9600 руб.

**Мрый А. Запіскі Самсона Самасуя.** — Менск: Мастацкая літаратура, 2003. — 111 с. 2000 ас.

Знакаміты сатырычны раман ужо другі раз на працягу двух гадоў передрукоўваецца «Мастацкай літаратурай».

**Грибенчук С., Полонский А. Тайны Беловежской пущи: Это было при нас.** — Берасьце, 2003. 10000 ас.

Аўтары кнігі — журналісты — распавядаюць пра малавядомыя факты з савецкае мінуўшчыны. Тады ў запаведных нетрах Белавескай пушчы знаходзілі сабе схоў ня толькі рэдкія віды жывёлаў, але й ракетныя ўстаноўкі войскаў стратэгічнага прызначэньня СССР. У «Кнігарні пісьменьніка» выданьне каштуе 4380 руб.

**Валентин Елизарьев:** Альбом / Сост. и авт. текста Т.Мушинская. — Минск: Беларусь, 2003. — 192 с. 3000 ас.

Даведацца пра асабісты лёс мастацкага кіраўніка Беларускай опэры й дасягненьні тэатральнай трупы дазволіць гэты альбом. У кнігарнях прыдбаць можна за 17810 руб.

**Пичета В. История белорусского народа.** — Минск: Изд. центр БГУ, 2003. — 184 с.: ил. — (Scriptor universitatis). 1000 ас.

Кніга аднаго з найбуйнейшых беларускіх гісторыкаў першай паловы XX ст. уключае дзьве гістарычна-навуковыя працы: «Гісторыю беларускага народу» і «Гісторыю Літоўскай дзяржавы да Люблінскай уніі». У «Акадэмічнай кнізе» цана выданьня 7360 руб.

**Слюнькова И. Монастыри восточной и западной традиции: Наследие архитектуры Беларуси** / Рос. академия архитектуры и строительных наук. — Москва: Прогресс—Традиция, 2002. — 600 с. 2000 ас.

У кнізе апісаныя архітэктурныя асаблівасьці й гісторыя каталіцкіх і ўніяцкіх кляштараў, праваслаўных манастыроў Беларусі ад XI да пачатку XIX ст. У «Акадэмкнізе» каштуе 36000 руб.

**Тацяна Вабішчэвіч**



## Тадэвуш Кандрусевіч

Беларус, арцыбіскуп маскоўскі, прэтэндуе на папскі пасад? «НН» пісала ўжо, што арцыбіскуп можа быць тым самым кардыналам «in pectore», высьвечаным сёлета Янам Паўлам. Цяпер жа расейская «Независимая газета» выказала меркаваньне, што а.Кандрусевіч — кандыдат на Пантыфіка ад уплывовай усходнеэўрапейскай партыі ў Ватыкане.

**Міхаіл Лявонаў** казаў апошнія словы ў судзе дзесяць гадзінаў. Сваю віну — пераведзеньня на замежныя рахункі 20 млн даляраў — ён адмаўляе, вінавацячы ў падкопах «дэструктыўныя сілы». Сваю справу Лявонаў называе элемэнтам барацьбы тых сілаў «супраць прэзыдэнта і народу». Хітры да наіўнасьці, як галянтарэйнік Буанасье. А яшчэ мільянэр. Прысуд будзе абвешчаны 23 сьнежня.

**Сяргей Мартынаў** падчас нарады міністраў замежных справаў краінаў АБСЭ абрынуўся на прыбалтаў. У Латвіі, маўляў, «прыцiскаюць» беларускае насельніцтва. А ў Беларусі беларускае насельніцтва, на думку спадара Мартынава, шыкуе. Асабліва дзеці зь Беларускага ліцэю.

**Уладзімер Ткачоў**, былы старшыня Дзяржынскага райвыканкаму, быў затрыманы ў Яраслаўскай вобласьці Расеі. Зь верасьня на ім «вісяць» шэсьць гадоў турмы за злоўжываньне службовым становішчам і хуліганства з выкарыстаньнем зброі.

Расеец **Сяргей Падпалы**, трэнэр, які прывёў «Гомель» да золата на чэмпіянаце Беларусі 2003 г. па футболе, налета пяройдзе ў клюб «Хімкі», які нават не ўваходзіць у вышэйшую лігу расейскага футболу. Затое практыкаваўся дзядзька ў «Чэлсы».

Беларусь наведаў нямецкі гісторык **Райнэр Лінднэр**. 28 лістапада ён прэзэнтаваў у Беларускім ПЭН-цэнтры сваю кніжку «Гісторыкі і ўлада. Нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX—XX



ст.», найлепшую ў заходняй гістарыяграфіі Беларусі.

**Махамэд Хатамі**, прэзыдэнт Ірану, неўзабаве наведае Беларусь. Пра такую магчымасьць ён гутарыў у Тэгеране з Вадзімам Паповым, старшынём палаты прадстаўнікоў. Вось і стрэцца два адзіночаства.

**СМ**

Андрэй ХАДАНОВІЧ

# Новыя лімэрыкі

Элегантная дзеўчына зь Менску
на сьняданак п'е каву «па-венску».
Толькі па-гарадзкому
размаўляе й нікому
не дарує, хто «па-дзеравенску».

Раз да дзеўкі ў г.п.Целяханы
неспадзеўкі прыехаў каханы,
што на поўначы выжыў,
не здымаючы лыжаў...
Не здымаў і цяпер, нечаканы...

Дэпрэсіўны паэт зь Беларусі
аб нядолі сьпяваў і няпрусе...
А пасьля землякоў
на пяць соцень радкоў
расьпісаў — і канец яго скрусе!

ЗАМЕСТ ПРЫВАТНАЕ АБВЕСТКІ

# Праскі шыншыла пазнаёміцца зь беларускай соняй



О, Беларусь! Мая шыншыла!
Вавёрчын хвост, трусіны нос!
Зьвярок з далёкай цёплай Чылі
Ў краі чарнобыльскім узрос.

Тваёй шыншылíхай я стану,
Каб славіць твой нялёгкі лёс,
Каб кожны беларус старанна
Табе шыпшыну ў хатку нёс!

На футра скуркі з тваймі цела
Ніколі ім не абадраць!
У нашым лесе будзеш сьмела
Ты зубру морду казытаць!

Скептычных мы зьвядзём на мыла,
Каб мыць загаджаны калхоз.
О, Беларусь! Мая шыншыла!
Вавёрчын хвост, трусіны нос!

Гэтыя радкі салідарнасьці зь мірным зьвярком нарадзіліся пасьля шматлікіх сяброўскіх камэнтароў адносна майго выбару хатняй жывёліны. І сапраўды: і пацук, і трус, і вавёрка — шыншыла ўбірае ў сябе рысы кожнае з гэтых жывёлінаў. Плюс рэдкасны грызун. Рэгулярнае да мяне пытаньне: якую кніжку шыншыла прачытала ўчора, колькі чытае за тыдзень? Яна з задавальненьнем грызе беларускія выданьні, асабліва надрукаваныя за савецкім часам, — відаць, з малымі хімічнымі дадаткамі папера. Адзін знаёмы, думаючы, што робіць прыемнае, паказаў дыхтоўны каўнер на нятаннай куртцы BOSS і падкрэсьліў: «У краме сказалі, што з шыншылы. Я вельмі задаволены. Добры ў цябе зьвер...»

Шыншылу я прыдбала ў заалягічнай краме, проста па дарозе на працу — сядзела сабе самотная... Вакол вішчэлі птушкі, гойсалі тхары і трусы. Усіх ахвотна куплялі, а шыншылу — не. Многія наведнікі з захапленьнем гаварылі — глядзі, гэта тая істота, чыё футра самае дарагое. З адной валасяной цыбулькі растуць сорак валаскоў. Дзеля вытворчасьці футраў шыншылаў забіваюць сотнямі тысячаў. Нават у чэскай кнізе пра **хатняга** зьвярка шыншылу зьмешчаныя здымкі абадраных скурак жывёлінаў, яшчэ з крывёю. І надпіс — «так выглядае шыншыла бяз скуры». А пасьля парады, як пацешыць гадаванца. Як не ўратаваць хоць адну шыншылу?

Жывуць шыншылы ў Паўднёвай Амэрыцы, перадусім у чылійскіх Андах. Калі ў 20-я гады XX ст. іх амаль зьнішчылі (засталіся літаральна некалькі тысячаў зьвяркоў), навукоўцы спрабавалі пашырыць арэал існаваньня. Не ўдалося. Самыя прыдатныя, паводле спэцыялістаў, горы Таджыкістану не сталі другім домам для шыншылаў. Яны нідзе ў прыродзе па-за межамі радзімы не прыжыліся.

Мая шыншыла — Чынча — названая ў гонар індзейскага племя, якое шанавала гэтую жывёлу. У дзікай прыродзе шыншылы сустракаюцца толькі ў Чылі і Пэру, дый там іх ужо вельмі цяжка знайсьці. «Але індзейцам з племені Чынча пашчасьціла меней. Пачуць пра іх можна толькі ў легендах», — так заахвочваюць патэнцыйных гаспадароў шыншылаў уладальнікі спэцыяльных сайтаў.

Зь вялікім зьдзіўленьнем я даведалася, што сапраўдным далікатэсам для шыншылаў зьяўляецца шыпшына. Прадаваныя ў шматлікіх заалягічных крамах Прагі ягады ня надта спадабаліся шыншыле, але беларускія плады Чынча грызе зь вялікім задавальненем.

Сябра распавёў, што ў Беларусі жывуць блізкія сваякі шыншылаў — соні. Яны таксама на мяжы зьнікненьня. А пасьля параіў даць прыватную абвестку ў газэце — шукаем соню. Для праскага шыншылы.

**Вольга Караткевіч, Прага**

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**Запрашаем на падарожжа ў Пінск**

з заездам у **Клецак 14 сьнежня**
(нядзеля). У Пінску: калегіюм езуітаў, касьцёлы францішканцаў і бэрнардынцаў і іншыя помнікі.
Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер)
Т.: 264-12-38, 776-24-35 (Павал)

*Прыгожанькую*
*і разумненькую*
*дзяўчынку Ксеню*
*з Днём народзінаў віншуе*
*сям'я Васілеўскіх.*



### ВІТАНЬНІ

**Віншую** з 20-годзьдзем сваю сястру Настасьсю Бакуновіч

**Віншую** сваю каханую дачку Настасьсю з Днём народзінаў. Жадаю ёй добрай працы, добрых і сапраўдных сяброў. Маці

**Андрэя Кажамакса** віншую з надыходзячым Днём народзінаў. Вік

**Малы** хлопец, які знайшоў выхавацельку Ксюшу, віншуе яе з Днём народзінаў і жадае ёй вялікага й шчырага каханьня. Алмер

**Віншую** самую чароўную крывічанку з Днём народзінаў!!! Алмер

### КАНТАКТЫ

**Хлопец**, 28 гадоў, пазнаёміцца з надзейнай дзяўчынай, жанчынай да 30. Магчымы выезд за межы РБ. А/с 8, 220065, Менск

**У абвестцы** «Не абы-якая дзяўчына 25 гадоў пазнаёміцца з прыстойным і адукаваным маладым чалавекам» няслушна пададзены нумар абанэнцкай скрыні. А трэба: а/с 144, 220088, Менск

**Padkažycie**, kali łaska, dzie ū Miensku hreka-katalickija parafiji? vicvr@tut.by

**Студэнты** 1-га курсу лячэбнага ф-ту Гар.ФМУ, якія пажадаюць навучацца па-беларуску, тэлефануйце. Т.: 58-6-38 (пасьля 17-й). Андрэй

**Сябры** «Краю», падкажыце, як з вамі можна скантактавацца. Нешта ваш сайт не працуе. Вік

**Беларускія лекары** для Вас і Вашых дзетак. http://medicus.iatp.by

**Набуду** ткацкі станок, вясковы. Т.: 272-55-12

**Прадам** «Форд-транзыт», 1993 г.в., пасажырскі, нізкі, кароткі, выдатны стан. Т.: (8-01591) 22-6-05

### УШУ

**Барацьба ўшу** для дзяцей 7—11 гадоў. Заняткі праводзяцца па-беларуску. Месца — 5 хвілінаў хады ад плошчы Якуба Коласа. Т.: 288-68-91 (Ігар, Ганна, пасьля 20-й)

### КНІГІ, МУЗЫКА

**Набуду** старыя альбомы ULISу: «Чужаніца», «Блуканьне», «Life 1996» ды іншыя. Паміраю!!! Памажыце, калі ласка! Sp.waw@tut.by

**Куплю дорага** «Расейска-беларускі слоўнік» С.Некрашэвіча і М.Байкова 1928 г. Т.: 275-49-59

**Гарадзенская выстава** «Ў Міхельсона» часова не працуе да 15 сьнежня. Т.: 8-029-782-41-16 (Андрэй). Усе навіны шукайце на сайце http: //michelson.by.ru

### ПАКОЙ

**Асьпірантка** (І к.) здыме пакой у раёне станцыі мэтро. Т.: 270-15-12

### ПРАЦА

**Навучу** танцам. Вольга. Т.: 8-029-636-43-08

**Запрашаю** да супрацы. Добрыя заробкі, навучаньне бясплатнае. Зьмітрусь. Т.: 8-029-766-12-79

**Вырашэньне** праблем з кампутарам. Дапамога з Green Card. Т.: 264-68-90

ЗАПРАШАЕМ
**12–14 сьнежня**
**«Золота підкова» Львоўшчыны**
Упершыню ў Беларусі — гістарычная экскурсія па **Львове** і шасьці навакольных замках (**Алеськ, Падгорцы, Залочыў, Крэхіў, Жоўква, Сьвірж**).
Два дні — начоўка ў гатэлі турклясы. Кошт — 45 у.а. (студэнтам — зьніжкі).
Плянуецца імпрэза ад Зьмітра Сасноўскага (гурт «Стары Ольса»).
Дакраніся да гісторыі!
Тэлефануйце: **222-88-61, 8-029-779-83-10.**
Заходзьце: вул.Фабрыцыюса, 9, пакой 13

«Наша Ніва» дзякуе за падтрымку
сп. Анатолю Васілеўскаму зь Менску

ТАКІНДАНГ




## Тузін гітоў на FM

**Паводле вынікаў чацьвертага туру галасаваньня на «Тузіне гітоў» http://music.fromby.net, першае месца заняла песьня Аляксандра Памідорава «Дзень без гарэлкі»,** на другім — Зьміцер Вайцюшкевіч з кампазыцыяй «Я ішоў да цябе», трэцяе — за «Ўлісам» («Устану ранкам»). З 24 лістапада ў барацьбу ўключыліся «J-Mors» з песьняй «Глядзі», героі Басовішча'2003 гурты «Triquetra» і «Крыві» («Одзірыдзідзіна»). Увесь «Тузін гітоў» цяпер можна слухаць у нядзелі на радыё «Рокс». Першы этэр 7 сьнежня ў 16.05.

**Сяргей Будкін**

## У гонар фотаапарата

**Маладыя амэрыканцы называюць дзяцей у гонар вядомых гандлёвых марак.** Найбольш папулярныя імёны з назваў аўтамабіляў — Інфініці для дзяўчат, Чэві (ад «шэўралe») для хлопчыкаў. У Штатах падрастаюць сямёра Дэль Монтэ (вядомая прадуктовая кампанія) і аж 49 Кенаваў (марка фотаапарата). У нас пакуль дзетак Зенітамі ды Камунаркамі не называюць.

**ФС**

Наша Ніва КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

Тэкст ____________________

Імя і прозьвішча ____________________

Адрас, тэлефон ____________________

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914),
Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч,
У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
выпускны рэдактар — Арцём Лява
карэктар — Сяргей Петрыкевіч
карэктарка — Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар — Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск код 764.
Наклад 3437. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 22.00 3.12.2003.
Замова № 6521.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а